WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

5 сакавіка 2011 г.
СУБОТА
№ 43 (26907)
Кошт 650 рублёў

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# «ВАМ ТАК ДА ТВАРУ ВЯСНА І ЎСМЕШКА!»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІЦЫ!

**Прыміце сардэчныя віншаванні з цудоўным веснавым святам — Днём жанчын.**

**Актыўная грамадзянская пазіцыя, высокі адукацыйны і прафесійны ўзровень, ініцыятыва і прадпрымальнасць сталі неад'емнымі рысамі беларускай сучасніцы.**

**Найбольшы ўнёсак нашы жанчыны робяць у развіццё такіх сфер, як ахова здароўя і сацыяльнае забеспячэнне, адукацыя і культура, навука і спорт, фінансава-крэдытная сфера і бізнэс.**

**На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва жанчыны захоўваюць утульнасць дамашняга ачага, ствараюць гармонію сямейных узаемаадносін, выхоўваюць дзяцей, натхняюць на подзвігі і працоўныя здзяйсненні.**

**Няхай ваша прыгажосць, абаяльнасць, душэўная шчодрасць, як жыватворная крыніца, садзейнічаюць стваральнай сіле грамадства.**

**Міру, шчасця і дабрабыту вам і вашым сем'ям!**

**Са святам, мілыя жанчыны!**

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## СВЯТА ЗА ШТОРКАЙ

Навеяна вясной

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

**ЛЮБЛЮ 8 сакавіка. Напэўна, з таго самага дня, калі мы з татам хавалі за шторамі цюльпаны для мацi. Хавалі 7-га, каб падарыць 8-га. Нешта было ў гэтым чароўнае. У нашай з татам тайне, у гэтым да часу схаваным свяце. У здрадніцкіх сонечных прамянях, якія не маглі ўжо ўтрымаць ніякія шторы...**

Люблю 8 сакавіка за жоўтыя «савецкія» мімозы, якімі напаўняецца горад і праз дваццаць гадоў пасля такога нядаўняга і такога далёкага «перабудовачнага» юнацтва. Люблю за вялізную колькасць мужчын з букетамі. За ўсмешкі на вуліцах, за шчаслівыя позіркі жанчын.

Люблю за дзетсадаўскія паштоўкі, якія выхавацелькі робяць разам з дзецьмі са скручаных жоўтых сурвэтак.

СТАР. 4

**Лицей БГУ ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ УЧАЩИХСЯ в 10 классы**

**Прием в 10 классы Лицея БГУ
осуществляется по результатам двух письменных вступительных испытаний, которые проводятся 15 мая и 22 мая 2011 года по следующим предметам:**

| Направление обучения | Число мест | 15 мая | 22 мая |
|---|---|---|---|
| физико-математическое | 100 | математика | физика |
| химико-биологическое | 60 | биология | химия |
| филологическое | 40 | русский язык и литература | белорусский язык и литература |
| обществоведческое | 40 | история Беларуси (с древнейших времен по 1945 г.) | всемирная история (XIX век – 1945 г.) |

**Без вступительных испытаний зачисляются** победители (дипломы I, II или III степени) заключительного этапа республиканской олимпиады 2011 г. с учетом направления обучения.
Документы принимаются **с 28 марта по 11 мая 2011 г. включительно**.
Во время прохождения конкурсного отбора общежитие иногородним учащимся не предоставляется.

Полный текст правил приема размещен на сайте Лицея БГУ: **http://www.lyceum.by.**

Телефоны для справок: **226 01 12, 209 56 19, 209 56 11.**

**Адрес: г. Минск, ул. Ульяновская, 8.**

В Лицее БГУ работают курсы дистанционного обучения, на которых можно получить консультацию преподавателей лицея о заданиях, предлагавшихся на вступительных испытаниях прошлых лет. Адрес сайта дистанционного обучения **http://e-lyceum.by.**

УНП 100557342

## Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:
# «НАН Беларусі да канца пяцігодкі павінна павялічыць экспарт да $300 млн»

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, выступаючы на сесіі агульнага сходу Нацыянальнай акадэміі навук, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

— Мяне вельмі здзіўляе, што вы плануеце рост аб'ёмаў у 1,9 раза, у той час як за мінулую пяцігодку рост быў у тры разы».

На думку прэм'ер-міністра, праца вучоных будзе запатрабавана рэальным сектарам эканомікі, трэба проста больш актыўна прапаноўваць свае праекты і ідэі. «Трэба пагляддзець, што робім самі, што трэба рабіць у кааперацыі, што будзем купляць, і веласіпед вынаходзіць у гэтай справе не трэба», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік урада звярнуў увагу на тое, што НАН Беларусі павінна адбыцца як магутная навукова-вытворчая карпарацыя. Ён таксама паставіў задачу фарміраваць работу па вытворчасці ў Беларусі святлодыёднай тэхнікі. «Неабходна вырашаць пытанні лагістыкі, маркетынгу, прыцягнення буйных інвестараў».

Асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца праектам у біямедыцыне. Перспектыўнымі ў гэтай галіне могуць быць праекты, звязаныя са стваловымі клеткамі. Аднак пакуль дастойных прапаноў ад вучоных па развіцці гэтага напрамку не паступала. Знізілася дынаміка і ў сферы біятэхналогій. На асаблівым кантролі ў кіраўніка дзяржавы і ўрада — лекавая бяспека Беларусі. «У мінулым годзе мы ўвезлі лякарстваў на $407 млн, а ўласная вытворчасць топчацца ў асноўным на месцы», — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч.

Не менш як палавіна ВУП Беларусі ў 2015 годзе павінна фарміравацца за кошт высокатэхналагічнай, навукаёмістай прадукцыі. Пры гэтым прэм'ер-міністр нагадаў, што да канца пяцігодкі ў Беларусі плануецца забяспечыць рост валавога ўнутранага прадукту ў 1,6-1,7 раза і выйсці на аб'ём ВУП прыкладна $100 млрд у бягучых цэнах, а па парытэту пакупной здольнасці — прыкладна на $220-230 млрд. «На жаль, у прадстаўленых мне дакументах я не ўбачыў, за кошт чаго гэта мэта будзе дасягнута навуковай супольнасцю», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Трэба ўстараніць гэты недахоп».

Прэм'ер-міністр нагадаў, што амаль тыдзень таму на нарадзе з новым складам урада кіраўнік дзяржавы расставіў акцэнты і вызначыў адказных за рэалізацыю ўстановак, агучаных на IV Усебеларускім народным сходзе. «Прайшло ўжо больш за два месяцы пяцігодкі, і складваецца такое ўражанне, што вучоныя чакаюць нейкіх дадатковых даручэнняў для таго, каб працаваць над выкананнем пастаўленых задач, — сказаў ён. — Да гэтага часу не праведзена ніводнага пасяджэння каардынацыйнага савета па дзяржаўных комплексных навукова-тэхнічных праграмах. А калі выконваць задачы, калі працаваць? Не вызначаны саставы рабоч, не абазначаны тэматычныя напрамкі шэрагу праектаў». Паводле слоў прэм'ер-міністра, такая «вялая работа можа падставіць усіх». У сувязі з гэтым неабходна больш актыўная і зладжаная работа ўсіх звёнаў навуковай сферы. Беларускае інавацыйнае заканадаўства павінна быць не горшае за еўрапейскае. Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што пакуль, на жаль, нацыянальная інавацыйная сістэма краіны не забяспечвае сваё самаразвіццё...

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.03.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▼1 долар ЗША............3 015,00 | 1 чэшская крона.........173,56 | USD......................28,1880 |
| ▲1 еўра......................4 207,73 | 1 польскі злоты........1055,21 | 10 UAH..................35,5236 |
| 1 латвійскі лат..........5 962,03 | ▲1 расійскі рубель........106,96 | 1000 BYR..............9,3369 |
| 1 літоўскі літ.............1 219,24 | 1 украінская грыўня....379,77 | EUR......................39,3476 |

# ЖНІВО

Трэба сказаць, што гараджанін можа не зразумець сутнасці майго расказу, а вось вясковы чалавек, напэўна, паспачувае. Пачну здалёк. Дзесьці ў 70-80-я гады мы былі даволі моцнай сужэнскай парай (Бог дзетак не даваў). Муж працаваў шафёрам на вялікіх самазвалах, зарабляў нядрэнна, я працавала бухгалтарам.

У 90-х гадах выйшаў закон, які дазваляў выдзяляць зямельныя надзелы тым, хто хоча на іх працаваць. Вось муж і «клюнуў»: пачаў хадзіць па кабінетах чыноўнікаў, дабівацца зямлі. Доўга хадзіў, сабраў цэлую папку папер, усе: «адмовіць». Але ж ён настырны, дабіўся-такі свайго. Трэба сказаць, надзел дастаўся не зайздросны — за 8 кіламетраў ад хаты, 11 гектараў зямлі цугунцуца калашой на працягу 5 кіламетраў, з аднаго боку лес, з другога — канава. Месцамі лес з канавай сходзяцца так, што можна толькі праехаць. Але расло на тым надзеле добра ўсё, што ні сеялі і ні садзілі.

Гэта быў 1994 год. Якраз той вясной памёр бацька мужа. Муж вельмі цяжка перажываў страту, ды і кажа мне: «Едзь, баба, у дзіцячы дом, ды вязі хлапчука, бо не перажыву бяду». А мы і да таго часу ўжо думалі ўзяць дзіцятка, ды ніяк не асмельваліся. Паехала я ў Жодзінскі дзіцячы дом, ды і ўгаварыла мяне дырэктарка Людміла Мікалаеўна Нікалаева ўзяць хлапчука з сястрычкай. Дзе будзеш дзяліць — узялі дваіх. Праз год знайшлі іхняга брацішка, ужо ў Салігорскім дзіцячым доме. Гадоў ім было: сем, шэсць і малому тры.

Ад усяго сэрца дзякуем Людміле Мікалаеўне, бо яна зрабіла ўсіх нас шчаслівымі, мы з першага дня сталі адзін да аднаго радней за родных.

Песціць дзяцей часу не мелі — трэба было выжываць, і дзеці гэта разумелі. Мы іх усынавілі. Дапамогі ад дзяржавы тады на ўсыноўленых не было, значыць, чым накарміць, што апрануць — нашы праблемы. Самае нечаканае тое, што вясковцы ніяк нас не разумелі, усё думалі, што мы ўзялі дзяцей з выгады. А былі ў нас такія дні, што не было грошай на хлеб. Тады выручала свякроў.

Як жа цяжка працавалі мы на той зямельцы! Добра, што быў трактарок Т-25, які купілі яшчэ калі жылі ўдваіх з мужам. Была кабылка, на ёй і ездзілі на поле. Ну і вось — асноўны сюжэт.

Жніво. Калгас наш, лічы, «на каленях». Да старшыні, каб даў камбайн, не прыступіцца. Вырашылі касіць самі, бо жыта пераспее і пасыплецца, а засеяных былі тры гектары. Думалася, што калгас падбярэцца ды і выручыць нас.

Трэба было бачыць, як мы працавалі, косячы тое жыта! Муж косіць, а мы што ёсць моцы цягнем адрэзаную мяжу, бо бярозка ўпляла жыта і трымае бясконцай вяроўкай. Так-сяк скасілі, пакосы высахлі, трэба ў кучы скласці, бо Бог ведае, колькі ім ляжаць. А тут яшчэ гарачыня — не прадыхнуць, апошнія дні жніўня. Сіл у нас хапае хвілін на 10-15, потым хаваемся ў лес на пяць хвілін. Дні тры працавалі — змагліся ўшчэнт. Муж тыя дні касіў атаву і дапамагчы не мог. Я ж у яго — «затычка ад усіх бочак». Ён ганарысты і не любіць прасіць аб дапамозе.

Пайшла да старшыні, у адказ: «Прыходзьце заўтра». І так з дня ў дзень больш за тыдзень. Сорам ды і толькі: тырчу пад яго дзвярыма, як папрашайка. Нарэшце злітаваўся: «Аплаціце ў касу грошы». Нанялі мужыкоў, паехалі маладзіць кучы, а ўжо пераваліла за поўдзень. Трэцюю частку змалацілі — палацеў рэмень. Паехаў муж на трактарку па той рэмень (вядома ж, з камбайнёрам). Няма і няма. Прыехалі, пакуль ладзілі — другія тэхнічныя непаладкі, а ўжо вечарэе і дожджык пайшоў. Камбайнер паабяцаў закончыць заўтра і пагнаў камбайн на стан, а жняярку кінуў на полі.

Назаўтра іду на стан, а старшыня не хоча слухаць: «Нічога не ведаю, вам выдзяляўся камбайн». І паехаў гэты камбайн па жняярку, але старшыня не даў загаду дамалаціць. Вось і засталіся мы з носам.

Усю зімку тачыла маё сэрца думка пра тое жытца пад снегам, ну а вясной трэба ж яго ўбраць, каб па-новаму засеяць. Прыйшлося паліць тыя кучы. Людзі, не паверыце, з мяне такі дзікі крык вырываўся, ну нібыта воўк вые. Так я выла, калі памерла мая мама, бо яна адна гадавала нас, шасцярых дзяцей, выхавала як магла... І мне свайго працы шкада не было: загінула праца маіх дзяцей, вось што рэзала маё сэрца. Не ведаю, ці зразумела дзятва, чаго вые маці, не пытаюся да сённяшняга дня.

Думаеце, людзі, што дзеці ў крыўдзе на нас, што працавалі? Не, і доказ таму — пісьмо сына. Яны ад'язджалі ў той год у Іспанію, і ён пакінуў на сталле запіску. Я яе берагу і прыкладаю да расказу. Сын быў тады ў трэцім класе, не вельмі пісьменны.


Дарагія нашы радзіцелі! Ну вось нам ужо патрэбна ехаць, а яшчэ шмат чаго не зроблена. Мы б вам шмат чаго памаглі: сена сушыць, карову пасвіць і яшчэ шмат чаго. Мы ведаем, што без нас вам будзе дрэнна. Ну і напэўна вы будзеце па нас сумаваць. А мо за работай і не будзе вам калі сумаваць? Ну нічога страшнага, мы ўсё роўна вернемся і ўсё зробім.
Саша

*«Дарагія нашы радзіцелі! Ну вось нам ужо трэба ехаць, а яшчэ шмат чаго не зроблена. Мы б вам шмат чаго дапамаглі: сена сушыць, карову пасвіць, і яшчэ шмат чаго. Мы ведаем, што без нас вам будзе дрэнна. Ну і, напэўна, вы будзеце па нас сумаваць. А мо за работай не будзе вам калі сумаваць? Ну нічога страшнага, мы ўсё роўна вернемся і ўсё зробім.*

*Саша».*

Той выпадак я зрэдку ўспамінаю, як загоеную рану. Гэта ўсё ў мінулым. А цяпер дзеці павырасталі, ды якія прыгожыя і працавітыя! Дачка замужам, жыве ў Маладзечне. Маем унучка. Хлопцы пры нас, цешымся з дзядам, гледзячы на іх. Усё склалася ў нас як найлепш. Мы на пенсіі, трымаем яшчэ дзве каровы, кабылку і іншую скацінку. Старэйшы сын пераафармляе зямлю на сябе, хоча паспрабаваць свае сілы, а вопыту ў яго хапае і працы ён не баіцца.

Вось і ўсё.

**Юлія КУСТЭНКА,**
*в. Лебедзевае, Маладзечанскі раён.*

### Перажыў маразы

Беспрацоўны з вёскі Ляхавічы, што ў Іванаўскім раёне, аблюбаваў будынак па вул. Вясёлай, які належыць жыхарцы райцэнтра, і ўкраў адтуль 1,5 тоны брыкету ды 4 складаметры колатых дроў. А выцягнуў злодзей тое паліва ў лютым, калі стаялі моцныя маразы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# ДВАЙНОЕ СВЯТА Ў ГЛЫБІНЦЫ

**Міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі павіншаваў жанчын з глыбінкі са святам, уручыў падзячныя лісты Міністэрства за значны асабісты ўклад, за рэалізацыю інфармацыйнай палітыкі.**

Учора ён наведаў Новалукомль, сталіцу беларускай энергетыкі. Невыпадкова член урада прыехаў у Чашніцкі раён, бо жыхары менавіта гэтага раёна выбралі яго дэлегатам Усебеларускага Сходу. І на працягу пяці гадоў міністр будзе прадстаўляць інтарэсы рэгіёна: сустракацца з людзьмі, па магчымасці дапамагаць у вырашэнні праблем. У сваім звароце да прысутных міністр нагадаў, што жанчыны ніколі не падводзяць, і калі бяруцца за справу, даводзяць яе да канца.

У другой палове дня ў Новалукомльскім Палацы культуры энергетыкаў пачалася святочная акцыя. Упершыню ўшанавалі сёлетніх уладальнікаў тытула «Чалавек года Чашніччыны» — самых годных людзей, прадстаўнікоў розных галін народнай гаспадаркі, а таксама жанчын — ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, шматдзетных маці. Дарэчы, сярод 16 намінантаў амаль палова жанчыны. Адбыўся канцэрт, выступіць у якім запрасілі вядомую вакальную групу «Чысты голас». Сваё майстэрства прадэманстравалі і лепшыя калектывы краіны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЗАЯВЫ АЛЯКСЕЯ МІХАЛЕВІЧА АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ З ОРГАНАМІ ДЗЯРЖБЯСПЕКІ І «КАТАВАННІ» Ў СЛЕДЧЫМ ІЗАЛЯТАРЫ НЕ АДПАВЯДАЮЦЬ РЭЧАІСНАСЦІ

**Заявы Аляксея Міхалевіча адносна канфідэнцыяльных адносін з органамі дзяржаўнай бяспекі і «катаванні» ў следчым ізалятары не адпавядаюць рэчаіснасці, а інфармацыя, што распаўсюджваецца ў сувязі з гэтым, з'яўляецца паклёпніцкай. Аб гэтым гаворыцца ў афіцыйным паведамленні цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў (ЦІГС) КДБ Беларусі.**

«Рашэнне аб змяненні адносна яго меры стрымання было прынята па ўзгадненні з органамі пракуратуры на падставе вынікаў праведзеных следчых мерапрыемстваў у адпаведнасці з заявай ім пазіцыяй аб разуменні ўсёй адказнасці за ўчыненыя праціпраўныя дзеянні, а таксама з улікам ўласнаручнага напісання прашэння», — гаворыцца ў паведамленні.

Да заканчэння следчых дзеянняў ЦІГС прадстаўляе толькі некаторыя вытрымкі з гэтага прашэння: «Паважаны Аляксандр Рыгоравіч, я заўсёды адносіўся да Вас з павагай, і Вашы заслугі для незалежнасці Беларусі неаспрэчныя і вельмі вялікія. У час сваёй перадвыбарнай кампаніі я не сказаў нічога дрэннага ні ў Ваш адрас, ні ў адрас Вашых блізкіх і родных... Я як былы кандыдат шчыра шкадую, што адбыўся канфлікт, і пацярпела шмат людзей... Прашу Вас асабіста ўзяць пад свой кантроль пытанне аб маім далейшым лёсе. З павагай, А.А. Міхалевіч».


Уважаемый Александр Григорьевич.
Я всегда относился к Вам с уважением, и Ваши заслуги для независимости Беларуси неоспоримы и очень велики.
Во время своей предвыборной кампании я не сказал ничего плохого ни в Ваш адрес, ни в адрес Ваших близких и родных.
Я, как бывший кандидат, искренне сожалею, что произошел конфликт, и пострадало много людей.
Прошу Вас лично взять под свой контроль вопрос о моей дальнейшей судьбе.
С уважением,
А.А. Михалевич

«Пры такіх абставінах, прымаючы пад увагу добра вядомыя характарыстыкі асобы Аляксея Міхалевіча, органам дзяржаўнай бяспекі не было неабходнасці ўстанаўліваць дадатковыя адносіны, — адзначаецца ў паведамленні. — Прычыны, па якіх Аляксей Міхалевіч аб гэтым замоўчвае, а таксама факты яго дачынення да парушэння заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у тым ліку да распаўсюджвання паклёпніцкай інфармацыі, будуць устанаўлівацца ў працэсе праведзення далейшых следчых мерапрыемстваў».

**БЕЛТА.**

### Нашы цёзкі
# «Звязда» Галіны Трыбунах

**— Мая маці кажа: дачушачка, свайго лёсу канём не аб'едзеш. Значыць, гэта лёс.**

**Дырэктар КСУП «Звязда» Чачэрскага раёна Галіна Трыбунах — сёмы па ліку кіраўнік гаспадаркі. Вяскоўцы лічаць, што лічба гэта шчаслівая ў першую чаргу для іх. Менавіта пры Галіне Пятроўне тут наладзілася вытворчасць. І парадак такі, што пазайздросціць многія. У тым ліку мужчыны.**



— Ведаеце, было шмат усяго. Былі і слёзы, але ж іх ніхто не бачыў. Гэта вельмі цяжкая праца — кіраваць людзьмі. Раней, калі працавала ў райсельгасхарчы, а палове дзявятай прыйдзеш на працу і а палове шостай дадому. Зачыніў дзверы і забыў, што за імі. А калі з раніцы да ночы без выхадных і святаў... Нават ноччу прачнаешся і думаеш пра справы ў гаспадарцы.

Чатыры гады, як Галіна Пятроўна Трыбунах узначальвае КСУП «Звязда», што ў Чачэрскім раёне. Сёння, кажа, ёсць каманда, з якой прыемна працаваць. Падабраны людзі, з якімі можна ісці ў разведку.

— Людзі вельмі добрасумленныя, — раскрывае сакрэты поспеху Галіна Пятроўна. — Яны адказна ставяцца да працы. У нас цяпер не засталося тых, хто п'е, нікога не трэба падганяць, прымушаць.

Людзі, як паўсюль, у гаспадарцы працуюць розныя. Але пра тых, хто спатыкнуўся ў жыцці, Галіна Пятроўна клапоціцца асабліва. Яна расказвае сумную гісторыю адной з жанчын, якая вярнулася з турмы. Праваў на дзіця яна была пазбаўлена і спачатку працягвала весці звычайны для сябе лад жыцця:

— Мы доўга не маглі знайсці з ёй кантакт, вельмі складана з ёй было. А цяпер гэта зусім іншы чалавек. Яна працуе даяркай на ферме, як бачыць мяне — бяжыць, цалуе. Кажа: «Калі б мне хто раней сказаў, што я змянюся і буду так працаваць, не паверыла б... Галіна Пятроўна, пакуль вы тут працуеце, вы за мяне не перажывайце, я вас не падвяду». Яна не толькі стала прыгажэйшай, але і сына вярнула ў сям'ю. Мы дапамагаем тым, каму складана перамагчы алкагалізм, але хто хоча гэта зрабіць: і прадуктамі, і бялізнай. Ім жа з чагосьці трэба пачынаць, асабліва калі яны вярнуліся з-за кратаў.

Галіне Трыбунах пашанцавала яшчэ і ў тым, што ёсць каму падставіць моцнае мужчынскае плячо. Муж Сяргей — яе намеснік па вытворчасці. Старэйшы сын працуе ў гаспадарцы слесарам. Ужо стварыў сваю сям'ю і шукаць шчасця па-за роднымі мясцінамі не збіраецца. Малодшаму толькі 16, і ён яшчэ толькі выбірае свой шлях у жыцці.

Па параду да Галіны Пятроўны звяртаецца не толькі моладзь, але і вопытныя работнікі гаспадаркі. Разам увасобілі прагрэсіўны метад нагляднасці за парадкам. Цяпер усе ведаюць, што пад кантролем — літаральна кожны крок: відэакамеры ўсталяваныя ў розных кутках гаспадаркі. За апошнія гады ў гаспадарцы значна абнавіўся машынна-трактарны парк: набыты энерганасычаныя трактары, кормаўборачная і пасяўная тэхніка, збожжаўборачныя камбайны, зернеачышчальнае і сушыльнае абсталяванне. Не так даўно праведзены капітальны рамонт на малочнатаварнай ферме. Ды і заробак нядрэнны ў «Звяздзе» атрымліваюць — не скардзяцца. Акрамя таго, гаспадарка выдае ўсім работнікам натураплату ў выглядзе мясамалочнай прадукцыі. Маладыя спецыялісты забяспечваюцца жыллём, задаволены і нікуды не збіраюцца ад'язджаць. За апошнія 5 гадоў тут пабудавана 36 жылых дамоў для вяскоўцаў. А ў перспектыве — пабудова яшчэ 6 дамкоў для вяскоўцаў і новага комплексу на 600 галоў дойнага статку.

З 2007 года ў аграгарадку Залессе — цэнтральнай сядзібе — праведзены капітальны рамонт водаправода, рамонт дарог і вуліц, заканчваюцца работы па газіфікацыі жылых дамоў. У вёсцы ёсць сярэдняя школа, дзіцячы садок, ФАП, кінаканцэртны цэнтр, спартыўная база, стадыён. Працягваецца будаўніцтва жылля для маладых спецыялістаў і рабочых КСУП. Тут робіцца ўсё для таго, каб аблегчыць працу работніка сельскай гаспадаркі.

— Людзі адчулі, што дырэктар сапраўды перажывае за працу, за калектыў, — адзначае старшыня сельскага савета Наталля Шаўцова. — Наша Галіна Пятроўна заслужыла аўтарытэт і давер людзей, усе яе даручэнні выконваюцца бясспрэчна. Яна клапоціцца не толькі пра работнікаў свайго гаспадаркі, але і пра пенсіянераў і ўсіх, хто жыве на тэрыторыі сельсавета. Гэта кіраўнік ад Бога.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ТАЙНА ЖАНЧЫНЫ



**Пятнаццаты раз запар Грамадскі прэс-цэнтр Дома прэсы сабраў напярэдадні Міжнароднага жаночага дня цікавых і славутых жанчын краіны. На гэты раз тэма сустрэчы мела і паэтычную, і неапрасцелую назву: *«У жанчыне прырода ўсе тайны хавае»*. Але ці то дзякуючы кіраўніку гутаркі — дырэктару выдавецтва «Літаратура і мастацтва» Аляксандру Карлюкевічу, ці то арганізатарам — Таццяне Падаляк і яе камандзе, ці тое самім жанчынам, кожная з якіх заслугоўвае асобнага аповеду, «круглы стол» атрымаўся вельмі нефармальны, цёплы, душэўны, амаль сямейны. Тут і плакалі, і смяяліся, і абдымаліся ў парыве раптоўнага пачуцця любові і падзякі... І гэта нягледзячы на тое, што многія, хто прыйшоў сюды, не ведалі адно аднаго асабіста. Безумоўна, важную ролю ў стварэнні святочнай атмасферы сыгралі і прадпрыемствы, якія дапамагалі ў арганізацыі сустрэчы: Белмастацкераміка, Мінскі мясакамбінат, Мінскі завод вінаградных він і Мінскхлебпрам. Што тычыцца заяўленай тэмы сустрэчы, то запрошаныя жанчыны і шчыра спрабавалі адкрыць свае тайны, і катэгарычна адмаўляліся гэта рабіць, і заклікалі да адказу мужчын, але сама сустрэча стала дэманстрацыяй і ўвасабленнем тайны, імя якой — Жанчына.**

## ТАЙНА ДЗЯРЖАЎНАЯ

Са слоў **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны КАРАЛЁВАЙ** выпікала, што тайна жанчын — у здольнасці дапамагаць усім людзям, ад малых да старых.



— У сферы сацыяльнай абароны працуе 35 тысяч чалавек, і ў асноўным гэта — жанчыны, — сказала яна. — На іх кволых плячах — цяжкая праца, але яны дапамагаюць людзям жыць. Наша сфера суправаджае чалавека ад нараджэння да апошняга шляху. Мы прызначаем дапамогу на дзяцей, выдаём пасведчанні шматдзетным маці, курыруем пытанні заробкаў, аховы працы, пенсійнага забеспячэння, абслугоўваем нямоглых і выплачваем дапамогу на пахаванне. Напэўна, таму ў наша міністэрства больш за ўсё звароты: ад нас чакаюць падтрымкі, клопату. Насамрэч, у любой цяжкай сітуацыі чалавек можа звярнуцца ў органы сацыяльнай абароны, тэрытарыяльныя цэнтры і атрымаць дапамогу. Няхай гэта будуць не грошы, але бясплатная кансультацыя псіхолага, абслугоўванне дома...

Адхіляючыся ад тэмы «тайны» ў бок сваёй прафесійнай дзейнасці, Валянціна Вікенцьеўна нагадала пра пенсійныя льготы для шматдзетных маці:

— У пенсійным забеспячэнні льготы даюцца тым, хто нарадзіў пяць дзяцей і выхаваў іх да 8 гадовага ўзросту. Такія жанчыны могуць пайсці на пенсію на 5 гадоў раней, і стажу ім, для таго, каб атрымліваць пенсію, трэба на 5 гадоў менш. Асаблівая льгота прадугледжана для маці, якія занятыя ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі не менш за 10 гадоў. Калі такая жанчына нарадзіла 5 і больш дзяцей і выхавала іх да 16-ці гадоў, яна можа пайсці на пенсію незалежна ад узросту. Рэальна — гадоў у 40, бо раней наўрад ці споўніцца малодшаму 16 гадоў.

Акрамя таго, для ўсіх маці, сказала намеснік міністра, у стаж налічваецца час догляду за дзіцем да трох гадоў, але не больш за 9 гадоў. З гэтай ільготы вынікае, што калі жанчына доўгі час нідзе не працуе і прамежак паміж нараджэннем яе дзяцей складае 2-3 гады, то ёй дастаткова мець працоўнага стажу толькі шэсць гадоў (плюс 9 гадоў догляду), каб мець права на атрыманне пенсіі. Але, напэўна, тайна сучаснай жанчыны заключана ў тым, што ня-многія ў 40-50-гадовым узросце жадаюць быць пенсіянеркамі. «Але такая магчымасць — выбар нашай дзяржавы, у многіх краінах няма льготных пенсій увогуле, у тым ліку для шматдзетных маці», — заўважыла Валянціна Каралёва.

Ёсць жаночая тайна, разгадка якой прадстаўляе для дзяржавы стратэгічны інтарэс. Яна датычыцца жадання жанчын нараджаць дзяцей. З пачаткам другога дзесяцігоддзя XX стагоддзя ў дзетародны ўзрост уступае нешматлікае пакаленне 90-х гадоў. У сувязі з гэтым чакаецца зніжэнне нараджальнасці ў параўнанні з папярэднім перыядам. Таму Міністэрства працы і сацыяльнай абароны звяртаецца да ўрада краіны з прапановамі аб павышэнні дапамогі пры нараджэнні дзіцяці, па доглядзе за дзіцем да 3 гадоў, аб прадастаўленні льготных крэдытаў.

«Што тычыцца пенсійных ільгот, то іх пашырэнне мы не плануем, бо гісторыя развіцця грамадства і вопыт замежных краін паказваюць, што падтрымка больш патрэбна тады, калі дзіця нарадзілася, а не тады, калі яно ўжо вырасла, — патлумачыла пункт погляду міністэрства Валянціна Каралёва. — Увогуле, наша пенсійная сістэма вельмі шчодрая: мы рана даём выплаты, таму любая новая льгота ў гэтай сферы можа выклікаць парушэнне раўнавагі ў сацыяльнай абароне насельніцтва».

## ТАЙНА СУСВЕТНАЯ

— Мяне заўсёды хвалявала пытанне, чаму Гасподзь для нараджэння Збавіцеля звярнуўся да жанчыны, — павярнула гутарку ў філасофскі кірунак **дырэктар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Таццяна БЯЛОВА**. — Гэта тайна — самая галоўная, яе нясе ў сябе кожная жанчына.



Сучаснасць выявіла такую тайну жанчын, як здольнасць працаваць у мужчынскай прафесіі. Узяць тое ж выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» — здавалася б, кіраваць такой справай можа толькі мужчына, само слова «энцыклапедыст» мужчынскага роду. Разам з тым, большасць супрацоўнікаў выдавецтва — жанчыны. А пра тое, наколькі жанчына-кіраўнік спраўляецца са сваімі абавязкамі, сведчыць сёлетняя ўзнагарода Таццяны Бяловай прэміяй «За духоўнае адраджэнне».

— Усё, што мы робім, мы робім для нашага грамадства, — сказала дырэктар «Беларускай энцыклапедыі». — Мы выдаём энцыклапедыі для школьнікаў і студэнтаў, складаем даведнікі па культуры Беларусі, ваенныя... І большую частку гэтых выданняў рыхтуюць жанчыны.

Яшчэ адна жаночая тайна датычыцца ініцыятывы. Адкуль у дачок Евы столькі ідэй, задум і дзёрзкасці? Вось і Таццяна Бялова скарысталася магчымасцю, каб заявіць пра адкрыццё ў сярэдзіне сакавіка прэзентацыйнага цэнтра выдавецтва ў новай краме на праспекце Пераможцаў.

— У першую чаргу гэта будзе пляцоўка для абмеркавання самых розных кірункаў, для нараджэння новых праектаў, тэм, кніг і ідэй, — сказала яна.

## ТАЙНА КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ

— Шмат гадоў працуючы са словам, я, нечакана для сябе, заўважыла, што многія значныя словы, вельмі важныя для людзей, — жаночага роду, — звярнула ўвагу на чарговую тайну **дацэнт кафедры мастацтва эстрады Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва Дзіна ТЫЦЮК**. — «Зямля», «прырода», «планета», «любоў», «радасць»... Усё рушыцца любоўю на зямлі, і свет носіць жаночы твар. Гэта, з аднаго боку, цудоўна, але з іншага — вельмі адказна. Мы, жанчыны, адказныя за твар свету... Таму нам вельмі важна памятаць пра тую галоўную місію, якая нам наканавана. Гэта складана — быць жанчынай, але ў гэтым наша шчасце.





Здольнасць сумяшчаць несумяшчальнае — вось асноўная тайна жанчын, лічыць **рэжысёр Алена ТУРАВА**. На кінастудыі «Беларусьфільм» можна сустрэць не толькі шмат жанчын-рэжысёраў, але і дастаткова жанчын-аператараў, не кажучы ўжо пра іншыя, не столькі «мужчынскія» творчыя заняткі. Усе гэтыя жанчыны ствараюць цудоўныя творы і, разам з тым, маюць сем'і, расцяць дзяцей, клапоцяцца пра мужоў!

Пры яе выдатнай вынослівасці і сіле, жанчыне неабходна ўвага мужчын, заўважыла Алена. Жанчыне важна адчуваць, што яна падабаецца, што ёй захапляюцца, любуюцца. Жанчына насамрэч не можа існаваць без мужчыны, без яго клопату і падтрымкі. І ў гэтым яшчэ адна жаночая тайна.

## ТАЙНА ЖЫЦЦЁВАЯ

— У экстрэмальных сітуацыях жанчыны спраўляюцца нашмат лепш за мужчын, — дадала да агульнага спісу свой вопыт **галоўны ўрач Бальніцы паліятыўнага догляду «ХОСПІС» Вольга МЫЧКО**. — Між сабой мы называем хоспіс клубам былых жонак. Мужчыны могуць мець трох і больш жонак, афіцыйных, грамадзянскіх і якіх іншых. Але ногі яму мые, пазногці стрыжэ і корміць з лыжачкі ў апошнія



дні і месяцы — першая жонка, маці яго дзяцей. Яна можа яго папракнуць, можа павысіць на яго голас, ці нават падняць руку, але яна яго дагледзіць і ў апошні шлях праводзіць. Парадокс: былых мужоў мы не бачым, а вось былых жонак — увесь час. Гэтыя жанчыны — міраносіцы, яны сапраўды нясуць у свет мір, святло, супакой.

Для самой Вольгі Віктараўны тайнай з'яўляецца тое, як супрацоўнікі хоспіса пасля працоўнага дня здольныя прыйсці дадому ў добрым настроі, пазбавіцца негатыву, прынесці сваім родным цяпло і ўвагу, усмешку і клопат...

— Самая важная жаночая тайна — здольнасць любіць і дараваць, — упэўнена **старшыня Дабрачыннага фонду «Дакрананне да жыцця» Ларыса ІВАШКЕВІЧ**. — У сваёй сям'і я — адна жанчына, у мяне чатыры дарослыя сыны і муж. І я ўвесь час імкнуся гэтую жаночую здольнасць любіць перадаць сваім сынам. Я ўзначальваю фонд, які дапамагае хворым на анкалагію дзецям, і бачу, што мужчыны, на жаль, вельмі часта пакідаюць сваіх жонак, калі бяда прыходзіць у сям'ю. А жанчыны, і ў гэтым іх галоўная тайна, здольныя любіць і дараваць. Насуперак усяму. Напэўна, на гэтым трымаецца свет.



— У маім жыцці былі перыяды, калі я не заўважала, як распускаюцца цюльпаны на дачы, — са слязамі на вачах прызналася першы намеснік **старшыні Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае добраахвотнае пажарнае таварыства», палкоўнік МНС Марыя ПЯЧУРА**. — У свой час я адказвала за фінансавае забеспячэнне ўсёй сістэмы МНС. На пачатку 90-х гадоў, у самы цяжкі час, калі не заўсёды была магчымасць купіць хлеб для курсантаў, паміраў мой малодшы сын. У яго была пухліна галаўнога мозгу, яму зрабілі аперацыю, мы яго паставілі на ногі, але праз паўтара года — рэцыдыў. Дзіця памірала, а я ў гэты дзень была на працы... Цяпер у мяне работа не такая цяжкая. Я стала заўважаць, як надыходзіць вясна, я стала адчуваць, што магу быць прыгожай... Некаторыя жанчыны зайздросцяць таму, што ўсё жыццё вакол мяне мужчыны. Сапраўды, у ліфце, на гасцінічным паверсе я чамусьці аказваюся адна сярод мужчын. У сістэме МНС іх было 22 тысячы! І яны мне так надакучылі!..

Для жанчыны важна, каб побач быў той, адзіны, які падтрымае ў любой, самай складанай, сітуацыі. У Марыі Пячуры такі мужчына ёсць — гэта муж. Ёсць яшчэ старэйшы сын, таксама цудоўны чалавек. І вялікая тайна ёсць у тым, як у адным чалавеку ўмяшчаецца столькі болю і столькі спакою, цеплыні і падзякі, рашучасці і мяккасці, жаноцкасці і радасці...

## ТАЙНА ГЕНДАРНАЯ

— Я цікавая сёння тым, што нарадзіла пяць дзяцей, — падхапіла размову **кавалер ордэна Маці Паліна ГЕСЦЬ**. — Я вельмі шчаслівая жанчына, але ёсць рэчы, якія мне ў маім статусе шматдзетнай маці не падабаюцца. Мне не падабаецца, што першае, пра што мяне пытаюцца, — ці атрымала я кватэру. Другое — колькі грошай мне плаціць. І трэцяе — калі я пайду на пенсію. Мне дзіўна, што людзям цікава не тое, што я адбылася як жанчына, не тое, чым жыву, што магу даць дзецям, колькі сіл на іх выдаткоўваю, а тое, якія льготы атрымала. Гэты меркантыльны чалавечы інтарэс крыўдзіць і абражае. Атрымліваецца, што шматдзетная маці, у першую чаргу, атрымальнік пэўных ільгот. Але дзеці — гэта мой гонар, маё ўкладанне ў будучыню, мой працяг.



— Шкада, што грамадства пасля ўвядзення падтрымкі шматдзетных сем'яў аказалася падзеленым, — некалькі ўхілілася ад абмеркавання асноўнай тэмы «круглага стала» Паліна Гесць. — На тых, хто мае льготы, і тых, хто лічыць, што гэтыя льготы дадзеныя за іх кошт...

Сама Паліна працуе намеснікам дырэктара Навуковага прадпрыемства ТАА «Энергапрыбор», таму і не можа пагадзіцца з тым, што жанчыны, якія нараджаюць і выхоўваюць дзяцей, жывуць за чужы кошт. А вось тое, як можна спалучаць догляд за 5 дзецьмі і працу, ды яшчэ кіруючую пасаду, да таго ж заставацца поўнай сіл і энергіі, напэўна, і ёсць галоўная тайна гэтай жанчыны.



**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

# «ДЭКРЭТНЫ» МОЖА ПАВЯЛІЧЫЦЦА

**Магчымасці працаваць і зарабляць цікавяць ці не кожнага. І ўсё ж калі-нікалі тут узнікаюць пытанні. У прыватнасці, якім чынам шукаць варыянты ўладкавання інваліду, наколькі верагодная павелічэнне дапамогі па беспрацоўі і ці зменіцца працягласць дэкрэтнага водпуску? Усё гэта стала тэмай «прамой лініі», якую правёў <u>першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр Пятровіч ГРУШНІК</u>.**

### З ПАДТРЫМКАЙ БЕСПРАЦОЎНЫМ ВЫЗНАЧАЦЦА Ў БУДУЧЫНІ

Як сведчыць статыстыка, у пачатку лютага на ўліку ў службах занятасці насельніцтва Беларусі знаходзілася 34,4 тыс. чалавек, а ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя захоўваўся на даволі нізкай адзнацы — 0,7 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўных жыхароў краіны. Не менш цікавы і наступны факт. Аднячасова, зноў жа ў пачатку лютага, службы занятасці мелі звесткі аб 53,2 тыс. вакансій. Прычым у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года апошні паказчык павялічыўся амаль у паўтара разы.

Такім чынам, сітуацыю на рынку працы крытычнай назваць нельга. І ўсё ж ёсць адзін даволі праблемны момант — невысокі памер дапамогі па беспрацоўі.

— Пакуль ніякіх змен тут не адбудзецца, — заўважыў Пётр Грушнік. — Разам з тым казаць, што намераў павялічваць дапамогі па беспрацоўі ўжо няма, таксама нельга — гэта пытанне павінна прапрацоўвацца ў будучыні.

### СПАЧАТКУ ЎРАЧ. І ТОЛЬКІ ПОТЫМ МЕСЦА

Асобная і даволі няпростая тэма — працаўладкаванне інвалідаў. Як можна вырашыць гэту праблему?

— Перш-наперш неабходна атрымаць медыцынскае заключэнне медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі — індывідуальную праграму рэабілітацыі інваліда з указаннем прафесій, якія яму падыходзяць па стане здароўя, — кажа Пётр Грушнік. — А затым з гэтай індывідуальнай праграмай варта звярнуцца ў раённую службу занятасці, дзе пашукаюць магчымасці для ўладкавання, — скажам, за кошт спецыяльнай броні ці іншыя варыянты.

Адзін з такіх варыянтаў — працоўная адаптацыя. Праўда, тут існуе адзін нюанс. Паводле праграмы адаптацыі, наймальнік можа скарыстацца дзяржпадтрымкай, і ў тым ліку — на набыццё абсталявання для інваліда. Аднак пры ўмове: гэта абсталяванне павінна выкарыстоўвацца на працягу значэнні тры гады. Тым часам тэрмін адаптацыі вызначаны ў год. Інакш кажучы, наймальнік павінен знайсці мінімум трох розных інвалідаў. А гэта атрымліваецца не заўсёды.

— Увогуле наймальнік, які бярэцца за адаптацыю, павінен загадзя ўзважыць свае магчымасці па яе арганізацыі, — заўважае Пётр Грушнік. — Тым не менш пытанні сапраўды ўзнікаюць, таму, магчыма, тут сапраўды давядзецца прымаць рашэнні. Бо ў нечым можна пагадзіцца: год — тэрмін невялікі.

### ПЕРШЫ КРОК — ПРАГРАМА

Адно з сапраўды цікавых для многіх працуючых жанчын пытанняў — магчымае павелічэння працягласці дэкрэтнага водпуску. Калі гэта можа адбыцца?

— Тэма павелічэння дэкрэтнага водпуску на 14 дзён і яго прадастаўлення з 28-га тыдня цяжарнасці на самай справе абмяркоўваецца ў рамках падрыхтоўкі новай Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі, — адзначае Пётр Грушнік. — Чакаецца, што праграма будзе разглядацца ў сакавіку. І калі яна будзе зацверджана, пачнецца распрацоўка механізмаў рэалізацыі асобных пунктаў. Таму казаць, што новаўвядзенне «запрацуе» літаральна заўтра, — немагчыма. Канкрэтнай даты тут пакуль няма.

Дарэчы, у рамках Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі разглядаецца і пытанне аб новых умовах прадастаўлення дапамог на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў. Адзін з варыянтаў — вызначыць з 2013 года памер такіх дапамог на ўзроўні 35-40 працэнтаў ад заробкаў маці за апошнія 12 месяцаў. Аднак у міністэрстве заначаюць, што пакуль гэта — таксама толькі прапанова.

— Аднячасова ёсць намер павялічыць і іншыя выплаты — аднаразовыя дапамогі пры нараджэнні дзяцей, — паведаміў Пётр Грушнік. — Аднаразовыя дапамогі могуць быць павялічаныя ці не ўдвая, і павялічаныя ўжо ў канцы года. Аднак гэта адбудзецца зноў жа пры ўмове зацвярджэння новай Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі.

**Сяргей ГРЫБ.**

# СПАКУСА НА СНЯДАНАК

**ЖАНЧЫНЫ — істоты непрадказальныя. Яны могуць закруціць носам ад вельмі каштоўнай дыхтоўнай рэчы, падоранай «з самых добрых меркаванняў», і да глыбіні душы ўзрадавацца чыстай пусцяковіне. Якой-небудзь чуллівай любоўнай запісачцы. А ўсё таму, што нішто так не ўпрыгожвае жанчыну як... мужчынская ўвага. Кампліменты, шчырыя прызнанні, серэнады і ўсялякія прыгожыя рамантычныя жэсты — ад іх красуня тае, як снег з надыходам вясны. Здаўна заўважаны лекавы эфект для дамскага настрою ад вячэры пры свечках. Але ж хто сказаў, што трэба чакаць наступлення цемры для спакушэння! Мы настойліва рэкамендуем пачынаць уцехі яшчэ ранічкаю. Са сняданку ў ложак!**





Іду ў заклад, першая страва, пра якую вы падумалі, — амлет! Але ж у нас свята, таму і амлет будзе не абы-які. З ікрой (сакавік жа не ўвесь год доўжыцца, не скнарнічайце!) і соусам з сыру «Дор блю» (так-так, каханую трэба ўлагодзіць). Такі, як у пераможцы фестывалю кулінараў-аматараў на прызы Philips Андрэя Саўчанкі. Яго кулінарны шэдэўр «Гара самацветаў» — гэта цэлая горка амлетаў, шчодра здобраных вытанчанай падліўкай ды бурштынавымі ікрынкамі (рэцэпт прыкладаецца). Чым вам не святочны торт?! Смакуючы непараўнаны ласунак, не верылася, што гэта плён намаганняў не масціта шэф-кухара, а звычайнага супрацоўніка аўтамабільнай кампаніі. Разам з душэўным і шчырым перфомансам у жанры вуснага кіно ён мігам пакарыў жаночае журы. А вось там ужо былі і прафесійныя кулінары. Многія з іх упершыню выступілі ў такім амплуа: калі гатавалі не яны, а для іх. Нават самы суровы крытык пры такіх абставінах раздобрыцца. Ды наогул атмасфера кулінарнай пляцоўкі такая смачная і свойская, што ўсе госці фестывалю адчулі сябе нібы і не ў гасцях. Гэта агульная заслуга арганізатараў, якія разбавілі чарговане страў апетытнымі конкурсамі, і самых удзельнікаў — непасрэдных, гумарных і вынаходлівых. Вось вам іх ідэі, як можна спакусіць сняданкам сваю музу.

Аматарка салодкага пальчыкі абліжа ад налісцікаў. Калі будзе ласаваца імі з цуда-канфіцюрам. Яго Ілья Прохараў, памочнік генеральнага дырэктара холдынга, назваў «разынкай» сваёй стравы. Апельсін, мёд, карыца і цёрты шакалад — м-м-м, суцэльная асалода. Удалыя для пасцельнага сняданку і маркоўныя кексы, якія таксама можна есці рукамі. А глазуру (з лайма, соку і цэдры лімона, маскарпоне і сыру «Філадэльфія») яшчэ і злізваць можна... вой, працягваць аповед не будзем! «Тут ёсць імбір, карыца, гваздзіка... што яшчэ ўзбуджае?!» — рэкамендуе свой пачастунак дырэктар па развіцці бізнэсу Макс Астахаў. Зачараваць любую ласуху здольнае і суфле з буякоў.

Іншая справа — заўзятыя змагаркі за фігуру. Для іх стравы, лепшай за салату, і не прыдумаеш. «Свежае дыханне» (з памідораў, салодкага перцу, брынзы, грэцкіх арэхаў, лімоннага соку і аліўкавага алею) — для аматарак ранішніх пацалункаў. Але ж нішто не будзе з'едзена з такім апетытам, як... бездакорна прыгатаваны стэйк. Дадамо латуку, пекінкі, чэры, кукурузы ды сыру фета. І яркі акцэнт — мядова-гарчычная заправка. Нават самая далікатная прынцэса будзе ўпісваць за абедзве шчакі!

**І не забудзьцеся: падаваць рамантычны сняданак лепш з духмянай кавай, свежавыціснутым сокам, кветкамі і... любоўю! Прычым не толькі па святах. Тады, паверце, без жаночай ласкі вы не застанецеся.**

**Ала МАЧАЛАВА.**

### «ГАРА САМАЦВЕТАЎ» для каханай

**Вашы незаменныя памочнікі ў барацьбе за жаночую прыязнасць:** банка чырвонай ікры, дзясятак яек, літр малака, 5 сталовых лыжак мукі, 400 г смятаны, крыху солі, разрыхляльніку, куркума (жоўты імбір па-простаму) на кончыку нажа. Апошняя спатрэбіцца ў двайным аб'ёме — каб падфарбаваць і цеста, і падліўку. На соус пойдзе яшчэ 100 г вяршкоў 33-працэнтнай тлустасці, 50 г сыру «Дор блю» і столькі ж белага сухога віна.

**Кулінарная феерыя:** пачнем з уласна амлету. Замешанае цеста выліваем на разагрэтую патэльню з лыжкай сланечнікавага алею. Паралельна падаграваем смятану. Атрыманы амлет-блінец выкладваем на талерку і, не шкадуючы, мажам смятанай. Гэтак жа любоўна сыплем самацветамі — ікрынкамі. І памятаем, што для каханай жанчыны нічога не шкада! У думках аб прыгожым не забываемся, што час ужо і другім блінцом заняцца. У прынцыпе, гатаваць так можна настолькі доўга, наколькі хопіць вашай шчодрасці. На фестывалі ж публіцы давялося частавацца торцікам з шасці слаёў! Усё гэта харaство палітае яшчэ і сырным соусам. Для яго прыгатавання віно падагрэм (каб выпарыўся алкаголь, інакш адтопіцца ад яго нашы вяршкі). Разам з ім растопім «Дор блю». Вось цяпер у наша варыва дададзім вяршкі. Падагрэем, не даводзячы да кіпення. Здымаем з агню. Застылы соус загусцее. Упрыгожваем смакату кропам, лімонам і чырвонай рыбкай.

**Абдымкі з пацалункамі** непазбежныя!

# ВЯЛІКІ ДЗЯВОЧНІК

**БАНЦІКІ, рушачкі і кветачкі — неад'емныя элементы жаночага гардэробу. Шопінг, кар'ера і справы амурныя (у адвольнай паслядоўнасці) — абавязковыя тэмы для гутарак сучасных паненак. А заўсёдныя атрыбуты вячорак для лэдзі — гэта, вядома ж, бясклапотны смех і сардэчныя прызнанні на тэму «усе мужыкі ...» за келіхам чаго-небудзь з бурбалкамі.**

У прадстаўнікоў моцнай паловы хапае сваіх, «закрытых», зон: на рыбалку, футбол ды ў гараж яны звычайна выпраўляюцца без дам. Героі «Іроніі лёсу» вунь мелі звычай хадзіць у лазню напярэдадні Новага года. А шмат вы чулі пра жаночыя традыцыі? Нашы каляжанкі на Захадзе, напрыклад, штогод святкуюць Дзень сяброўак. Першага жніўня яны дружна робяць манікюр, песцяцца ў спа-салоне і перамываюць косці знаёмым. У гэты дзень забаранецца праменьваць даўнюю сяброўку на новага кавалера і займацца нежаночымі справамі. Раз на год жа можна выкраіць час і правесці яго ў кампаніі таварышак!

Такое свята рызыкуе з'явіцца і ў беларусак. Збор подпісаў за яго поўным ходам ідзе на сайце www.denpodrug.by. Аўтарка гэтых нататак стала 3760-й. Грэх не папоўніць каляндар яшчэ адным святам! Да жніўня яшчэ далёка, але ж нястомныя беларускі ўжо правялі рэпетыцыю вялікага дзявочніка. Напярэдадні вясны — пары, калі не прыкрытая капелюшамі і кажухамі жаноцкасць абуджаецца ад зімовага сну — прадстаўніцы прыгожай паловы сабраліся ў сталічным Доме кіно на чыста жаночую вечарыну.

На дзявочніку былі заўважаны, напрыклад, спявачкі Іскуі Абалян і Іна Афанасьева, шоу-дзіва і пісьменніца Тамара Лісіцкая. Хто ж упусціць шанц правесці вечар з сяброўкамі?! За келіхам іскрыстага Eve паненкі атрымалі асалоду ад жывой музыкі, дызайнерскіх калекцыйных рэтраплакатаў пачатку XX стагоддзя і, натуральна, усмак нафатаграфаваліся. Які ж дзявочнік без памятных здымкаў? Што яшчэ любяць жанчыны, дык гэта каб усё было, як у кіно! Новая модная стужка Вудзі Алена «Ты сустрэнеш таямнічага незнаёмца» яшчэ раз нагадала ім пра тое, што лепш за горы могуць быць толькі горы, на якіх яшчэ не бываў. У сэнсе, самая жаданая жанчына — тая... на якую глядзіш праз акно. То бок, дамачкі, давайце імкнуцца да новага, не стамляцца здзіўляць сваіх мужчын, асвяжаць адносіны. Тым больш, вясна на двары!

**Ала МАЧАЛАВА.**

# СВЯТА ЗА ШТОРКАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Люблю за цёплы мамін голас па тэлефоне ў адказ на віншаванне і яе задзірлівае: «А ў нас ужо нарцысы вось-вось зацвітуць!»

Люблю 8 сакавіка за пяшчотна-сарамлівыя пацалункі сыноў, за цукеркі для дачкі, за ўсмешку мужа.

Люблю 8 сакавіка за высокае блакітнае неба, за лужыны ля гурбаў, за сухі, яшчэ белы ад солі, асфальт. За адсутнасць мітусні, за асобаснасць, за адчуванне вясны, якая ўжо прыйшла і якая ўся яшчэ наперадзе.

Будуць чыстыя вуліцы і першацвет, цёплы дождж і старыя ля пад'езду пасля доўгага перапынку... Будуць «песні» катоў апоўначы, хваляванні з нагоды школьных іспытаў, абвастрэнні хранічных хвароб, недахоп вітамінаў і недарэчны мокры снег з дажджом...

Вясна яшчэ паспее надакучыць з яе пераменай надвор'я, хранічнай стомленасцю, чэргамі ў магазінах «Насенне», неабходнасцю купляць новы абутак...

Але 8 сакавіка гэта яшчэ не мае ніякага значэння. 8 сакавіка вясне дарыеш усе яе недахопы, прымаеш усе нязручнасці, забываеш пра акалічнасці. Самае галоўнае — робіш у гэты дзень тое, што хочаш. Ляжыш у ложку, глядзіш любімы фільм або ідзеш гуляць з дарагімі табе людзьмі ў парк. Дзе шпакі яшчэ не разбіліся на пары, а сядзяць чародкамі на дрэвах, дзе малыя бягуць па дарожцы перад бацькамі, а тыя смяюцца і баяцца, каб маленькія нязграбныя ножкі не спатыкнуліся...

Свята яшчэ не наступіла, а я яго ўжо адчуваю, ужо ўсміхаюся, бо справа не ў назве і не ў гісторыі, а ў нечым асабістым, у нейкім супадзенні тонкай грані стану прыроды і стану душы... І не важна, што сёлета 8 сакавіка прыпадае на другі дзень Вялікага посту. Зрэшты, і пост называюць духоўнай вясной.

Галоўнае — цюльпаны, схаваныя шмат гадоў таму за працятай сонечным святлом шторкай. Да часу. Да заўтра. Як прызнанне ў каханні. Як упэўненасць у адказе. Як святкаванне радасці быць разам. Любіць, кахаць, і нічога не баяцца.

## Замежнікам адпачынак, лясгасам — прыбытак

Як паведамілі ў прэс-службе Мінлясгаса, за студзень лесапаляўнічыя гаспадаркі атрымалі 419 мільёнаў рублёў даходаў ад паляўнічага турызму і эксплуатацыі паляўнічых комплексаў, што больш чым удвая перавысіла запланаваныя паказчыкі. Прычым 195 мільёнаў з названай агульнай сумы паступіла менавіта ад замежных турыстаў. Усяго за гэты год ад вядзення паляўнічай гаспадаркі мяркуецца атрымаць даходаў на суму 7,6 мільярда рублёў, у тым ліку ад правядзення паляўнічых тураў з удзелам замежных грамадзян 2,58 мільярда, ад эксплуатацыі паляўнічых домікаў — 1,9 мільярда рублёў. За мінулы год, дарэчы, ад правядзення паляўнічых тураў з удзелам замежных грамадзян лесапаляўнічыя гаспадаркі атрымалі 1 мільярд 960 мільёнаў рублёў пры плане 1 мільярд 329 мільёнаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПЕРАДСВЯТОЧНЫЯ КРАДЗЯЖЫ: ШЫКОЎНАЯ ЖАНОЧАЯ БЯЛІЗНА І 4 РУЛОНЫ ТУАЛЕТНАЙ ПАПЕРЫ

Шыкоўная жаночая бялізна зацікавіла 30-гадовую непрацуючую гамяльчанку ў фірменнай краме вядомай беларускай маркі. Яна змагла выкрасці тры камплекты на агульную суму амаль 400 тысяч рублёў. А вось 23-гадовая грамадзянка спрабавала вынесці з крамы, якая гандлюе жаночым трыкатажам, ужо 13 камплектаў жаночай бялізны, але была затрымана.

Двое жыхароў Светлагорска прыехалі ў Гомель, каб здзейсніць крадзеж. У якасці здабычы ў адной з кватэр яны ўзялі ноўтбук, камп'ютарную мыш з дываннком і 4 рулоны туалетнай паперы. Выкрадзенае канфіскавана, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ІНШАЗЕМЦЫ «ГРАШАЦЬ» ХАБАРНІЦТВАМ

**Прынамсі, тыя з іх, хто пераступіў закон і афіцыйна зарэгістраваны ў беларускай сталіцы: сярод учыненых іншаземцамі злачынстваў больш за ўсё было менавіта фактаў хабарніцтва.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, на пачатак гэтага года ў Мінску афіцыйна зарэгістравана 36 980 іншаземцаў. З пачатку года імі было ўчынена 67 злачынстваў. У прыватнасці, замежных гасцей сталіцы злавілі за руку за хабарніцтва (14 фактаў), крадзеж маёмасці (10 фактаў), выраб, захоўванне і збыт падробных грашовых купюр (6 фактаў), махлярствы (5 фактаў).

**Ігар ГРЫШЫН.**



АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧУП «Минская межрайбаза ОПС» (продавец)**

проводит открытый аукцион по продаже здания магазина, общ. пл. 32,8 кв.м, расположенного по адресу: **Минский р-н**, Роговский с/с, **д. Ашнарово**.

**Начальная цена с НДС – 5 000 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,0176 га.**

**Задаток 10 % от начальной цены.**

**Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.09.2010.**

Аукцион состоится **15.03.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.03.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ЗАО «ТК Банк»**

Наименование и место нахождения хозяйственного общества: Закрытое акционерное общество «Банк торговый капитал», Республика Беларусь, 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65 А.

Годовое Общее собрание акционеров ЗАО «ТК Банк» состоится 16 марта 2011 года в 12.00 по адресу: Исламская Республика Иран, г. Тегеран, ул. Телегани, на углу ул. Неджатоллахи.

**Повестка дня:**

Вопрос 1. О рассмотрении отчета Председателя Правления ЗАО «ТК Банк» об итогах деятельности ЗАО «ТК Банк» в 2010 году.

Вопрос 2. О рассмотрении заключения ревизора ЗАО «ТК Банк».

Вопрос 3. О рассмотрении аудиторского заключения ООО «ФБК-Бел» подготовленного по результатам ежегодной аудиторской проверки достоверности годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «ТК Банк», составленной в соответствии с законодательством Республики Беларусь по состоянию на 01.01.2011.

Вопрос 4. Об утверждении годового отчета ЗАО «ТК Банк» за 2010 год.

Вопрос 5. О распределении прибыли ЗАО «ТК Банк» за 2010 год.

Вопрос 6. Об избрании членов выборных органов ЗАО «ТК Банк».

Годовое Общее собрание акционеров ЗАО «ТК Банк» созывается по инициативе Совета Директоров ЗАО «ТК Банк».

Основание созыва: в соответствии с п.8.4. Устава ЗАО «ТК Банк».

Форма проведения Годового собрания акционеров ЗАО «ТК Банк» – очная.

Информация, необходимая для принятия решений по повестке дня Годового Общего собрания акционеров ЗАО «ТК Банк» предоставляется по первому требованию лиц, имеющих право на участие в Годовом Общем собрании акционеров ЗАО «ТК Банк», заявленному в обращении на имя Председателя Правления ЗАО «ТК Банк» по адресу: Республика Беларусь, 220035, г. Минск, ул.Тимирязева, 65 А.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров ЗАО «ТК Банк», составляется на основании данных реестра владельцев акций, сформированного на 18 февраля 2011 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Годовом Общем собрании акционеров ЗАО «ТК Банк», производится с 11.00 до 12.00 16 марта 2011 года по адресу Исламская Республика Иран, г. Тегеран, ул. Телегани, на углу ул. Неджатоллахи. УНП 807000163.

УНП 600068187

Публикацию Минского районного исполнительного комитета об отказе от проведения аукциона 10 марта 2011 года в отношении Лота № 7 *(газета «Звязда» № 41 от 03.03.2011 г.)* **считать недействительной.**

**Считать утерянным свидетельство о государственной регистрации** первичной профсоюзной организации Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь) № 932, зарегистрированное решением Администрации Московского района г. Минска 26 декабря 2007 года № 2345. УНП 101620891

# ЧАСАМ «НЕ» АЗНАЧАЕ «ТАК»

**Я збіралася выкінуць квіткі з магазіна, калі на адным з іх нечакана заўважыла менавіта той афарызм, які пастаўлены назвай артыкула. Спачатку стала смешна: якім чынам мае пакупкі ў выглядзе харчовага набору звязаны з загадкавым папярэджаннем? Сувязі я так і не знайшла, а вось асацыяцыі пайшлі. Памятаеце, у старых фільмах быў папугай, які за грошы выцягваў «білецік лёсу» — з пэўным загадкавым прароцтвам «выключна для вас». На квітку, між іншым, на ўкраінскай мове было дакладна так: «Передбачення для вас: часом «ні» означає «так». І ваша справа, як гэта трактаваць. А калі так, трэба падзяліцца ўражаннямі ад шоп-тура да суседзяў — у Чарнігаў, бо квіток быў выдадзены ў супермаркеце менавіта гэтага ўкраінскага горада. Прынамсі, пабраціма Гомеля.**



Кашулька для маленькіх, але сапраўдных украінцаў.

Прызнацца, мне ўпершыню давялося трапіць у такі мэтавы тур. Нягледзячы на тое, што маршрут гэты гамяльчанамі даўно і добра «пратаптаны». На кожным слупе можна знайсці прапановы такіх паездак, якія каштуюць прыкладна 40 тысяч беларускіх рублёў. Прапануюць як прыватнікі, так і дзяржаўныя арганізацыі. І такі бізнэс для перавозчыкаў стабільны і выгадны, нягледзячы на пэўныя мытныя абмежаванні. Праўда, з улікам гэтых самых абмежаванняў цяпер людзі ездзяць у суседнюю краіну закупіць тавары для сябе і сям'і, а не на продаж. Ва ўсякім выпадку, у нашай паездцы было менавіта так.

Выезд быў, зразумела, раніцай, у 7.00. Але ж у Чарнігаў мы трапілі толькі каля 12 гадзін дня — гэта пры тым, што ехаць дзве гадзіны. Амаль што тры гадзіны было аддадзена мытні. Прычым з беларускага боку гэта было не больш чым паўгадзіны. Астатні час — у мытным пункце пропуску Новыя Ярылавічы на украінскай тэрыторыі. Самае цікавае, што чаргі аўтобусаў не было. Перад намі — толькі адзін. І таму мы так і не зразумелі, чаму нас пазбавілі магчымасці пакінуць яшчэ больш грошай у суседняй дзяржаве.

А потым было ўсё хуценька. Толькі дзверы аўтобуса расчыніліся ў месцы, вядомым у Чарнігаве як «джынсавыя базы», у аўтобус заскочылі тры ці чатыры мужчыны, якія працавалі «абменнікамі». Тут, у Беларусі, відаць, ужо крыху падзабылі мянял, якія раней стаялі пад кожнай крамай з прапановай, падобнай на замову: «долары-марачкі-рублікі». Украінскія спрытныя хлопцы, апранутыя ў чорныя спартыўныя касцюмы, мянялі ўсё на ўсё, у тым ліку добра арыентаваліся ў курсе беларускіх грашовых знакаў і, як ні дзіўна, былі зацікаўлены менавіта ў іх.

Потым з непрывычнай валютай пад назвай «грыўны» мы пабеглі па крамках. Больш вопытныя з нас добра ведалі, дзе што знайсці. Мне ж прыйшлося складана. Добра, што сяброўка мела хоць нейкі вопыт хаджэння па памяшканнях, якія архітэктурай нагадвалі савецкія часіны, — пабудаваны яны, відаць, гадоў 40-50 таму. Ацяпленне ў іх няма, і таму тэмпература паветра практычна роўная той, што на вуліцы. У нашым выпадку гэта было мінус 7. Калі надумаліся памераць сукенку — добра падумайце, ці вытрымаеце выпрабаванне. Некаторыя крамкі вельмі нагадваюць «сэканд-хэнд» з разваламі тавараў. У іншых больш прыстойна, але ж і цэны будуць большымі. Тут не ўтойваюць таго, што гандлююць неарыгінальным таварам. Сяброўцы прапанавалі вельмі прыгожае і арыгінальнае дэмісезоннае паліто за 750 грывен (менш чым $100). Пры гэтым прадавец адразу паведаміла, што «мадэлька садраная з фірменнай калекцыі, а пашыта на ўкраінскай фабрыцы. Калі б па ліцэнзіі, было б напалову даражэй». Сяброўку прапанова задаволіла.



«Задарма»! Гэта ж так адпавядае нашаму менталітэту!

## ДАПАМАГАЙЦЕ ТЫМ, ХТО НЕ ЛЯНУЕЦЦА

Гэта зноў прароцтва з іншага квітка ў чарнігаўскім супермаркеце. А ў двухпавярховых звонку крамках на аптовых базах, калі заходзіш унутр, звычайна ёсць яшчэ адзін дадатковы паверх — «мінусавы», ці падвальны. Так што плошчы выкарыстоўваюцца на максімуме. Прадаўцоў спачатку складана адрозніць ад пакупнікоў. Ніякага фірменнага адзення — дзяўчаты ў звычайнай вопратцы, толькі куды больш захутаныя ў пуховыя хусткі. Гэта зразумела: паспрабуй у непрыстасаваным памяшканні дзень пастаяць на цэментнай падлозе. Па адной грэюцца ля адкрытых электраабагравальнікаў. Дарэчы, міжволі падумала пра тэхніку бяспекі. Здаецца, іх пажарныя куды больш ляяльныя, чым нашы. Ад сумных думак адцягнула прыгожая дзяўчынка, якая заўважыла маю разгубленасць і прапанавала дапамагчы знайсці неабходны тавар. Дарэчы, паўсюль на дапамогу пакупніку дзяўчаты кідаюцца, як да самага роднага. І пагутараць «за жыццё», і памерчык падбяруць неабходны, і ветліва ўсміхнуцца на развітанне, і так шчыра пажадаюць бачыць вас яшчэ... Школа гандлю — школа жыцця.

Цэнтральны рынак Чарнігава быў другой «кропкай» у праграме шоп-тура. І першым маім асабістым уражаннем была сустрэча з даўнімі знаёмымі — жлобінскімі мяккімі рознакаляровымі конікамі. Прыемна сустрэць сваіх на чужыне! Прынамсі, у гандляроў цацкамі быў шырока прадстаўлены ўвесь жлобінскі асартымент. Яшчэ адна знаёмая беларуская марка, якой з вонкавай рэкламы заклікалі ўнутр украінскай крамы, — «Мілавіца». Але ж увогуле большасць тавару, як і паўсюль — з Азіі. Па якасці ён можа вельмі адрозніваца паміж сабой, і таму ўрэшце, калі рэч прыстойная, яна можа аказацца не такой ужо і таннай, хоць краіна яе вырабу — Турцыя, напрыклад. Мае летнія скураныя туфлікі ў пераводзе на беларускія абышліся 140 тысяч рублёў. У нас было б тысяч на 30, а то і 40 больш.

Чарнігаў, як і Гомель, — на тым самым перакрыжаванні, дзе не пачуеш «чыстай» рускай мовы, але і ўкраінскую (як і беларускую) гаворку таксама не вельмі вітаюць. Калі назвы крамаў (і тое далёка не ўсіх) — па-ўкраінску, то прадаўцы быццам і забылі сваю «рідну мову». Руская з «суржыкавымі» варыянтамі — самая папулярная і зразумелая. Інтэрнацыяналізм у дзеянні. Тым не менш, прыкметы нацыянальнага каларыту ёсць. З замілаваннем я пабачыла маленечкую кашульку ў крамцы дзіцячага адзення, выкананую ў лепшых нацыянальных традыцыях. «Взуття України», «Одяг України» — даволі часта сустракалася рэклама, аналагічная нашай «Купляйце беларускае». Так што разуменне неабходнасці падтрымкі свайго вытворцы ёсць і ў нашых суседзяў. Тыя, хто купляў той жа ўкраінскі абутак, сведчаць, што па якасці ён вельмі прыстойны.

Між іншым, шыльды — гэта асобная тэма. І вось тут, на мой погляд, суседзі значна выйграюць у нашых гандляроў па арыгінальнасці, а значыць, і магчымасці прыцягнуць пакупніка менавіта да сябе. Першыя, якія трапілі на вочы: "За цэнамі СССР", «Халява», «Задарма». Хто ж не зойдзе? Гэта ж так адпавядае нашаму славянскаму менталітэту! Праўда, у мяне ёсць сумненні, што ў нас зарэгіструюць краму з аналагічнай назвай. Дарэчы, упершыню пабачыла, што ў якасці плошчы для рэкламы выкарыстоўваецца прамежак паміж прыступкамі на даволі крутой лесвіцы ў вялізным магазіне абутку. Нават калі не хочаш, прачытаеш буйныя літары, якія ўзнікаюць перад тваімі вачыма — паміж нагамі тых, хто ідзе наперадзе. Такая вось «падножная» рэклама.

Яшчэ адну прыкмету ўкраінскага нацыянальнага каларыту заўважыла, калі зайшла перакусіць у сталоўку вядомай міжнароднай маркі, дзе ўвесь юны персанал апрануты ў клятчастыя кашулі. Але ў кожнага на каўнерыку прышпілена стужачка з нацыянальным украінскім узорам.

Зразумела, калі ехаць у Чарнігаў толькі за адной рэччу, з улікам кошту дарогі, было б не вельмі выгадна. Але ж на тое і шоп-тур — трэба закупляць для ўсёй сям'і мінімум на сезон наперад. У «кірмашовай ліхаманцы» вы, вядома, купіце і тое, што не вельмі падыдзе па колеры ці памеры, але ж застанецеся хоць і стомленымі, але задаволенымі. Асабліва калі прачытаеце на квітку з велізарнага супермаркета гандлёвай маркі «Сільпо» (апошняга пункту знаходжання ў Чарнігаве) яшчэ адно прароцтва — і зноў персанальна для вас:

## НОВЫ ІМІДЖ ДОРЫЦЬ НОВЫХ СЯБРОЎ

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ЦЁПЛАЕ МАРОЖАНАЕ З ВУГРОМ

**Бываліцы**

**БЫЦЬ на Нарачы і не паспытаць вэнджанага вугра — гэта ўсё роўна, што ў Туле не паласавацца мядовым пернікам з чайком з пузатага самавара.**

Гэтую аксіёму мядзельцы засвоілі назубок. Не раз і не два яна іх выручала ў самых далікатных сітуацыях.

Вось і цяпер яны прымаюць высокага абласнога чына. Той жадае агледзець гандлёвы цэнтр, асабіста пераканацца ў перавагах культурнага абслугоўвання насельніцтва. Ходзіць, глядзіць, маўчыць. Спыніўся ля дзвярэй нулявога пакоя. На іх вушамі зацюканага дварняка целяпаецца ручка. Суправаджэнне анямела. У гэтую гнятлівую цішыню адкуль не вазьміся спікіраваў махнаты чмель. Кіруючы мінчанін суровым позіркам праводзіў нахабнага бамбавоза.

— Нешта падобнае і ў вашых суседзяў. Вілейска-мядзельская туалетная рэчаіснасць...

Бубніў, расцягваючы словы, Антон Аляксеевіч. Яго мясцовы падначалены, Леанід, хоць і малады, але не з баязлівых. У супрацьлегласць шэфу — гаварунчык. Яго трохі заклініла, аднак ненадоўга. Ён хуценька забарабаніў:

— Вось вам, Антон Аляксеевіч, толькі б прыдрацца. Згадзіцеся, будыніну ж якую адчубачылі. Хіба параўнаеш з вілейскімі суседзямі, хоць вы і ў адзін рад паставілі...

— Ну, што я табе скажу, Леанід, займелі вы не архітэктурны шэдэўр, вядома. Але дзеля справядлівасці скажу, што ў навакольнае асяроддзе ўвайшоў ён у цэлым нядрэнна.

Пачуць ад ...

— Антон Аляксеевіч, час абедзенны, просім перакусіць, чым Бог паслаў, — яшчэ больш асмялеў мядзелец.

— Спадзяюся, Бог гэтага не паслаў, — строга шчоўкнуў па горле госць.

Бог, безумоўна, здагадваўся, чым дагадзіць на Нарачы нават самаму запісному гурману. Без гэтага, зразумела, не поўны прыём, але давялося абыходзіцца. А ўгоднік тым часам красаваўся на блюдзе-лодачцы сярод іншых закусонаў. Ледзьве не ў метр даўжынёй, у руку таўшчынёй пасланец мора... вальяжна ільсніўся ў хрустальным ложы. Пасланец мінскі смачна пыхкаў, уплятаючы тлустыя кавалкі. Толькі шкурка адскоквала ад зубоў. Падалі юшку. Трэба разумець, што не з печкура. Адбіўную на костачцы. Таксама не ад шчыгла нейкага. А тут і дэсерт падаспеў. У выглядзе жэле. Антон Аляксеевіч завяршыў ім трапезу, па звычцы прафесійна падвёў вынік:

— Ну што я табе скажу, Леанід, абед быў у цэлым неблагі, — доўгая паўза. — Салата была абшырная, але мы яе неяк не асэнсавалі. А марожанае цёплае... Да таго ж і чырвонае.

Занудлівы характар шэфа праявіўся і тут. Ва ўсім ён знаходзіў абавязкова недахоп. Леанід спрабаваў пярэчыць:

— Гэта, паважаны Антон Аляксеевіч, жэле. Журавіннае. Не марожанае...

— Ну ты мне расказвай!.. — безапеляцыйна абарваў чыноўніцкі госць.

Мядзелец у думках чмыхнуў: «Вось табе на! Праглынуў паўметра дэфіцыту, і марожанае яму цёплае...»

Пасля кароткай перадышкі перабраліся ў залу пасяджэнняў. Там ужо прыглушана чулася гамонка нарачанскіх чыноўнікаў.

— Першае. Ніяк не ўцямлю, што разлажыла мясцовыя кадры — вада ці рыба? Інакш чым растлумачыць дапушчаныя правалы? Хто мне толкам растлумачыць?

Ахвотнікаў не знайшлося.

— Ці мядзельскія кадры ад усіх праблем адмахваюцца рыбнымі хвастамі?

Нехта смялейшы спрабаваў запярэчыць, маўляў, нельга так абагульняць. І рыба з вадою тут ні пры чым...

Высокая трыбуна гнеўна парыравала...

— У Англіі ёсць клуб маўчуноў, а ў Мядзелі, бачу, неўзабаве аформіцца клуб гаваруноў. Мабыць, у вас, як у Шахеразадзе: адзін ляжыць на канапе, а другі яму казкі бае. Да вас не падступішся — вугрworld завязаліся і падвязаліся...

Пасля такога заключэння зала зусім насы павесіла. Ёй і няўцям было, што віной усяму цёплае марожанае, а зусім не вэнджаны вугор.

**Іван ЗАБАШЭВІЧ.**

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ за 2010 год

# ОАО «ПИВЗАВОД ОЛИВАРИЯ»

*220002, г. Минск, ул. Киселева, 30*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

(в млн руб.)

| АКТИВ | Код стр. | На начало периода | На конец периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. Внеоборотные активы** | 190 | **71 464** | **76 002** |
| **II. Оборотные активы** | 290 | **47 462** | **65 122** |
| **БАЛАНС** | 390 | **118 926** | **141 124** |

| ПАССИВ | Код стр. | На начало периода | На конец периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. Капитал и резервы** | 490 | **91 550** | **111 912** |
| **IV. Обязательства** | 590 | **27 376** | **29 212** |
| **БАЛАНС** | 600 | **118 926** | **141 124** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 января 2011 г.

(в млн руб.)

| Наименование показателя | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | **181 077** | **146 560** |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ , услуг | 011 | 52 084 | 35 674 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | 020 | **128 993** | **110 886** |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 71 178 | 61 006 |
| Расходы на реализацию | 050 | 37 196 | 26 018 |
| **Прибыль (убыток) от реализации** | 070 | **20 169** | **23 862** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 29 297 | 1 438 |
| Налоги, включаемые в операционные доходы | 081 | 77 | 208 |
| Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) | 090 | 29 220 | 1 230 |
| Операционные расходы | 100 | 29 158 | 3 327 |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов** | 120 | **62** | **-2 097** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 515 | 749 |
| Налоги, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 153 | 122 |
| Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) | 140 | 362 | 627 |
| Внереализационные расходы | 150 | 1 869 | 8 644 |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов** | 160 | **-1 507** | **-8 017** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД** | 200 | **19 174** | **13 748** |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 250 | 5 087 | 4 217 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 260 | 867 | 721 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ** | 300 | **13 220** | **8 810** |

1. Количество акционеров – всего 236,
в том числе юридических лиц – 2, физических лиц – 234.

**2. Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 1000 | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 8171 | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 686 | 561 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 122 371 | 122 371 |

**3. Информация о задолженности:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 1049 | 744 |
| Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | - | - |

4. Среднесписочная численность работающих (человек) – 455.

**Генеральный директор** **М.Н. Чеченев**

**Главный бухгалтер** **Л.В. Дубовик**

УНП 100128525

Падпіска-2011

# Па краіне — з веснавым настроем



2

*(Заканчэнне.*
*Пачатак у нумары за 4 сакавіка.)*

Знаходжанне ў Гомелі ўмясціла ў сябе плённыя сустрэчы з кіраўніком аддзела ідэалагічнай работы аблвыканкама Анатолем Кацілам і дырэктарам Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Галінай Цярэшчанкай. Ну, а потым пачаўся цэлы россып прызоў практычна па



1

ўсіх без выключэння раёнах вобласці. Напачатку наш аўтамабіль завярнуў у вёску Страдубка Лоеўскага раёна, дзе каляровага тэлевізара «Віцязь» зачакаўся Мікалай Фядосенка, які пачаў выпісваць «Звязду» яшчэ ў 1956 годзе! Нават у свае восемдзесят з хвосцікам Мікалай Клімавіч цікавіцца навінамі і інфармацыяй, што друкуецца ў газеце, не забываючы пра сваю гаспадарку, якую складаюць сабака і куры. У яго яшчэ хапае сіл і здароўя, каб заўсёды цёпла па-бацькоўску сустрэць на парозе свайго дома сваіх двух сыноў з дачкой і чацвярых унукаў.

З улікам паважанага ўзросту падпісчыка самую непасрэдную дапамогу ў дастаўцы тэлевізара на дом аказалі начальнік АПС Страдубкі Наталля Арэшнікава і кіраўнік справамі сельскага выканкама Іна Шарапава *(фота 1)*.

У самім Лоеве на галоўным вузле паштовай сувязі каштоўны прыз у выглядзе пыласоса быў пакінуты паштальёну аддзялення паштовай сувязі №1 Алене Ігнаценцы, які яна выйграла ў рамках сумеснага конкурсу газеты «Звязда» і РУП «Белпошта». Паколькі паштальён — чалавек заўсёды заняты, то за прызам прыехаць не так проста. У нашым выпадку такі варыянт прадугледжваўся, таму дастаўку бытавой тэхнікі на неабходны адрас узялася арганізаваць інструктар па падпісцы Лоеўскага РВПС Алена Гулай *(фота 2)*.

Далейшы маршрут «Звязды» ляжаў у Брагін, дзе электрачайнік асабіта ў рукі атрымала кіяскёр «Саюздрука» Таццяна Масавец. У Хойніках мы пакінулі электрапрас для паштальёна з вёскі Храпкова Таццяны Цішкевіч. Начальнік мясцовага вузла паштовай сувязі Святлана Марчанка (на фота) падкрэсліла, што вельмі прыемна адзначаць, што старэйшае беларускамоўнае выданне знаходзіць магчымасць не толькі разыгрываць прызы, але і дастаўляць іх на месца. У такім жа добрым тоне прайшла размова на Мазырскім раённым вузле паштовай сувязі з нядаўна назначаным начальнікам Інай Глушко. А вось старшы інструктар аддзела падпіскі мясцовага РВПС Іна Наўрось *(фота 3)*, прымаючы электрафен і электрапрас для сваіх паштальёнаў, выказала ўпэўненасць, што падпіска на Мазыршчыне на газету «Звязда» будзе і надалей праходзіць на высокім арганізацыйным узроўні.

Вянцом паездкі па Гомельшчыне можна лічыць візіт у Нароўлю, Ельск, дзе свой электрачайнік выйграла падпісчыца са стажам Яўгенія Цяслюк. На спідометры аўтамабіля ўжо набегла тысяча кіламетраў, калі за вокнамі аўто засталіся Лельчыцы і Жыткавічы, куды мы таксама паспелі заглянуць з візітамі ветлівасці і пакінуць людзям памятныя сувеніры ад «Звязды», падарункі, добры вясенні настрой.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

*Мінск — Мар'іна Горка — Асіповічы — Бабруйск — Рагачоў — Жлобін — Гомель — Лоеў — Брагін — Хойнікі — Мазыр — Нароўля — Ельск — Лельчыцы — Жыткавічы — Мінск.*


3

Падрабязнасці

# «Ліпа» ў дакументах

## Страты, прычыненыя эканамічным інтарэсам дзяржавы пры ажыццяўленні нарыхтоўчай дзейнасці, вымяраюцца сотнямі мільёнаў рублёў

**У 2009 — першай палове 2010 года рознымі рэгіянальнымі праваахоўнымі органамі заведзена 78 крымінальных спраў, якія трапляюць пад вызначэнне карупцыйных, у дачыненні работнікаў арганізацый, падведамных Гродзенскаму аблспажыўсаюзу. Большасць злачынстваў здзейснілі матэрыяльна адказныя асобы, і, як правіла, гэта звязана з фіктыўнымі дакументамі, паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.**

Прычым нярэдка гэтыя асобы дзейнічалі па змове з бухгалтарамі, што дазваляла падоўгу скрываць злачынныя дзеянні. Аднак колькі вяровачцы ні віцца... Супрацоўнікі дзяржбяспекі сёлета выкрылі механізмы здзяйснення карупцыйных злачынстваў службовымі асобамі арганізацый спажыўкааперацыі пры ажыццяўленні нарыхтоўчай дзейнасці. Страты, прычыненыя эканамічным інтарэсам дзяржавы, вымяраюцца сотнямі мільёнаў рублёў.

Каб павысіць паказчыкі па нарыхтоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, кіраўніцтвам Шчучынскага, Лідскага, Карэліцкага, Навагрудскага, Ашмянскага, Смаргонскага раённых спажывецкіх таварыстваў у 2008-2009 гадах аддаваліся ўказанні нарыхтоўшчыкам афармляць фальшывыя дакументы (закупачныя ведамасці, прыёмныя квітанцыі, таварна-транспартныя накладныя) аб закупцы ягад, бульбы, цыбулі і г.д. у мясцовага насельніцтва. Фактычна ж гэта прадукцыя набывалася ў камерцыйных структур, а розніца ў кошце прысвойвалася ўдзельнікамі незаконных здзелак. Акрамя таго, службовыя асобы райспажыўтаварыстваў атрымлівалі, зноў жа незаконна, матэрыяльныя ўзнагароджанні ад камерсантаў — як правіла, у памеры дзесяці працэнтаў ад сумы здзелкі.

За гэтыя парушэнні заканадаўства ўпраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці заведзеныі перададзены ў суд шэраг крымінальных спраў у дачыненні выконваючага абавязкі старшыні і намесніка старшыні Шчучынскага райспажыўтаварыства (артыкулы 430, 424, 427 Крымінальна кодэкса Беларусі — «атрыманне хабару», «злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі», «службовы падлог»). Па іх указанні службовымі асобамі і нарыхтоўшчыкамі была складзена вялікая колькасць фіктыўных дакументаў аб закупцы ў насельніцтва сельгаспрадукцыі. Толькі ў выніку парушэнняў патрабаванняў нарматыўнай базы сістэме спажыўкааперацыі за два гады прычынены страты ў памеры больш за 280 мільёнаў рублёў.

Цяпер УКДБ па Гродзенскай вобласці завяршае праверку нарыхтоўчай дзейнасці Смаргонскага, Лідскага, Карэліцкага, Навагрудскага, Ашмянскага і Слонімскага райспажыўтаварыстваў. Па яе выніках будуць прынятыя рашэнні згодна з беларускім заканадаўствам.

Фактычна грошы з рэспубліканскага бюджэту, прызначаныя на падтрымку сельскага вытворцы, ідуць у кішэні пасрэднікаў — перакупшчыкаў сельскагаспадарчай прадукцыі, зазначаюць ва УКДБ па Гродзенскай вобласці. Па сутнасці, гэта нямэтавае выкарыстанне дзяржаўных рэсурсаў, паколькі нарыхтоўчая дзейнасць райспажыўтаварыстваў фінансуецца дзяржавай, у тым ліку праз выдзяленне льготных банкаўскіх крэдытаў. Страты ж па іх таксама кампенсуюцца са сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

З іншага боку, рэалізацыя ценявых схем стварае перадумовы для злачынстваў у сферы эканомікі — злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, хабарніцтва, службовых падробак, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, ухілення ад выплаты падаткаў, легалізацыі набытых злачынным шляхам матэрыяльных каштоўнасцяў.

Дарэчы, супрацоўнікамі дзяржбяспекі зафіксаваныя факты, што вырошчваннем альбо скупкай сельгаспрадукцыі на тэрыторыі Гродзенскай вобласці актыўна займаюцца выхадцы з Сярэдняй Азіі, якія часта... не маюць рэгістрацыі ў рэгіёне. Яны выкарыстоўваюць няўлічаную зямлю кааператываў, фермерскіх гаспадарак, тэхніку і рабочых СВК без адпаведнага афармлення дагавораў. Пазней атрымліваюць фіктыўныя рашэнні аб выніках праверкі сельгаспрадукцыі ў занальных цэнтрах гігіены і эпідэміялогіі, не плацяць падаткі. Сваю незаконную дзейнасць яны, як правіла, прыкрываюць фіктыўнай рэгістрацыяй ІП альбо суб'ектаў гаспадарання на падстаўных асоб.

Потым ілжэпрадпрымальнікі, каб атрымаць выручку за неафіцыйна выраблекую альбо скупленую прадукцыю без выплаты падаходнага падатку, пастаўляюць у арганізацыі спажыўкааперацыі тавар па «ліпавых» даведках, афармленых на падстаўных асоб. Гэта таксама стварае глебу для карупцыйных праяўленняў, уцягвае ў незаконную дзейнасць службовых асоб сельскіх выканаўчых органаў, а таксама прычыняе страты бюджэту ў выглядзе недаатрыманых падатковых адлічэнняў.

Напрыклад, ураджэнец Азербайджана, жыхар г. Масты, выкарыстоўваючы свае сувязі сярод службовых асоб дзяржаўных органаў, для рэалізацыі нелегальна вырашчанай сельскагаспадарчай прадукцыі атрымаў фіктыўныя даведкі ў Галубоўскім сельвыканкаме Мастоўскага раёна і Ражанкаўскім сельвыканкаме Шчучынскага раёна. Гэта дазволіла яму здаць нарыхтоўчым прадпрыемствам Гродзеншчыны больш за 50 тон тавару без выплаты адпаведных падаткаў. У дачыненні старшыні Галубоўскага сельвыканкама і грамадзяніна Азербайджана былі заведзены крымінальныя справы, судом вынесены абвінаваўчыя прыгаворы.

Упраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці выкрыты і іншыя факты незаконнай дзейнасці службовых асоб. Напрыклад, падчас масавай нарыхтоўкі агародніны праўленнем некаторых райспажыўтаварыстваў прымаліся неабгрунтаваныя рашэнні аб павышэнні закупачных цэн на сельгаспрадукцыю. Прычым высокія цэны дзейнічалі... каля трох дзён, пакуль тавар здавалі адказныя работнікі дзяржаўных органаў і арганізацый. Па такой схеме пазалетась Шчучынскім райспажыўтаварыствам ажыццяўлялася закупка сельгаспрадукцыі ў службовых асоб мясцовага райвыканкама, супрацоўнікаў праваахоўных органаў, райспажыўтаварыства і іншых. А ў далейшым, паколькі закупленая па завышаных цэнах сельскагаспадарчая прадукцыя не знаходзіла патэнцыяльнага пакупніка, яна рэалізоўвалася ў мясцовыя дзіцячыя садкі і ўстановы адукацыі, інфармуе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# У ГРОДНА НА «КАЗЮКІ»

**Ужо па добрай традыцыі ў дзясяты раз з’ехаліся народныя рамеснікі не толькі з усіх рэгіёнаў Беларусі, але і з Польшчы, Расіі і Украіны. На працягу двух дзён яны пастараюцца найлепшым для сябе чынам спраўдзіць «прагноз»: «Як на Казюкі пагандлюеш — так будзеш зарабляць увесь год».**

Гісторыя гэтых кірмашоў, якія праводзяцца ў дзень памяці святога Казіміра, патрона Вялікага Княства Літоўскага, заступніка моладзі і рамеснікаў (памёр 4 сакавіка 1484 года ў Гродне, яго мошчы пахаваныя ў Вільнюскім кафедральным саборы) налічвае ўжо больш за 400 гадоў. З асаблівым размахам свята «Казюкас» традыцыйна праходзіць у Вільнюсе, усё больш папулярным яно становіцца і ў нас.

У сёлетнім кірмашы ў Гродне, аб арганізацыі якога разам з мясцовымі ўладамі так клапаціліся польскае і літоўскае грамадскія аб'яднанні, удзельнічае больш за сто народных майстроў. Прычым можна не толькі купіць іх вырабы, але і паглядзець, як ідэя ўвасабляецца ў той ці іншы твор. І, зразумела, святочную атмасферу ствараюць музычныя і танцавальныя калектывы мастацкай самадзейнасці.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Фокус

# ЛАЗНЕВА-ПРАЛЬНЫ КОМПЛЕКС ПЕРААБСТАЛЯВАЛІ Ў ПРАВАСЛАЎНЫ ХРАМ

## Святыню ў вёсцы Запясочча вырашылі арганізаваць на калгасным сходзе. Настаяцель храма лічыць, што тут можна па-асабліваму дайсці да ачышчэння і спакою душы

Вырашаючы службовыя справы на Гомельшчыне, я ў літаральным сэнсе ўдарыў па тармазах на выездзе з вёскі Запясочча Жыткавіцкага раёна. Нечакана пабачыў дзівосную культурную з'яву — царкоўныя купалы на былым савецкім адміністрацыйным будынку, збудаваным з шэрай «хрушчоўскай» цэглы.

У такіх будынках зазвычай размяшчаліся школы, адміністрацыйныя памяшканні калгасаў, дамы быту. Але перада мной паўстала нешта іншае — царква ў гонар іконы Маці Божай Іверскай.

Барселона, Рым, Парыж, Вільня, Рыга — такога няма нідзе. І ў Беларусі таксама пераабсталяванне бляклага гаспадарчага будынка савецкай эпохі ў храм — незвычайная з'ява. Па-першае, будавалі гэтыя памяшканні, мяркуючы па ўсім, людзі, якім насаджаліся атэістычныя ідэі. І тое, што тут сёння моляцца, — сімвалічная з'ява.

Па-другое, так ужо ў нас заведзена, што ў буйных гарадах актыўна рэстаўруюцца храмы ці будуюцца новыя — з залатымі купаламі, шыкоўным аздабленнем унутры. Вобраз некаторых святароў таксама часам здзіўляе: шыкоўныя люкс-аўтамабілі, дарагія гадзіннікі...

А па-хрысціянску сціплыя шэрыя купалы на храме ў Запясоччы, абсалютная адсутнасць раскошы і пампезнасці — гэта мне падалося вельмі незвычайным. Мясцовыя людзі з гонарам распавядаюць пра сваю царкву.



*— Рэгіён у нас такі, што са старажытных часоў было шмат храмаў (непадалёк ад Запясочча знаходзіцца Тураў. — **«Звязда»**). Пачалі храмы з'яўляцца і цяпер, — апавядае Марына Сулкоўская, сакратар Верасніцкага сельсавета, да якога адносіцца Запясочча. — Раней у гэтым будынку быў дом бытавога абслугоўвання. Была лазня, стаялі пральныя машыны. Так званы лазнева-пральны камбінат. Будынак належаў сельскагаспадарчаму вытворчаму кааператыву. З часам будынак стаў не надта запатрабаваным. Сходам калгаснікаў вырашылі рабіць храм. У 2006 годзе ён быў асвячоны. А лазня, дарэчы, так і засталася з іншага боку будынка.*

Арыгінальная ідэя асвяціць храм у будынку былой лазні не ўсім была даспадобы. Але нават іерархі праваслаўнай царквы разважылі і не пабачылі ў гэтым нічога дрэннага. Пра гэта мне расказаў настаяцель храма ў Запясоччы айцец Сергій:

*— Ужо з 1997 года былі размовы пра тое, ці будзе тут храм. Некаторыя людзі казалі: «Як у будынку лазні можа размесціцца царква? Тут жа людзі мыліся. А адзін аўтарытэтны святар на гэта сказаў: «Раней тут амывалі целы, цяпер будуць ачышчаць душу». І мне думаецца, што гэта нармальна. Так Госпаду патрэбна.*

*Вядома, ёсць праблемы, храм недабудаваны. У нас чатыры купалы, патрэбны яшчэ два. Але ў сцяне пайшла трэшчына, і ставіць новыя купалы нельга.*

*У нас ёсць фінансавыя праблемы. Яно і зразумела — тут вёска, а не горад. У нас няма шыкоўных пазалочаных купалаў. Але чалавек можа знайсці тут супакаенне душы. Кожны, хто прыходзіць, бачыць тое, што хоча бачыць. У нас ціха, спакойна. Тут чалавек можа адчуць веру і страх перад Госпадам.*

**— А калі да вас паедуць замежныя турысты? Храм вельмі незвычайны, не можа не выклікаць цікавасць у гурманаў, якія разбіраюцца ў архітэктуры.**

*— Што ж, няхай, храм адкрыты для любога чалавека...*

Храм у Запясоччы быў збудаваны сіламі звычайных жыхароў, якія далі прыклад суседнім населеным пунктам. І ў 2010 годзе ў суседніх Верасніцах быў асвечаны свой храм, збудаваны гэтак жа — сіламі звычайных жыхароў. Цікава, што царква ў Верасніцах паўстала таксама ў будынку былой лазні. Кажуць, дзівосны храм, шкада, што не атрымалася яго сфатаграфаваць...

У вас здараецца, каб у хвіліны роздумаў і хваляванняў цягнула ў Дом Божы? Якога б веравызнання вы ні былі. Напэўна, нават самыя моцныя людзі бываюць у хісткім маральным стане і звяртаюцца да свайго Бога, каб разабрацца ў сабе, прыняць узважаныя рашэнні.

Мне здаецца, што такія храмы, як у Запясоччы (збудаваныя простымі людзьмі, без пазалочаных купалаў і шыкоўнага аўтапарка), — тое самае месца для шчырага духоўнага дыялогу.

**Яўген ВАЛОШЫН,**
*Тураў—Жыткавічы—Запясочча.*

# «Хацелі б зрабіць на доме дах з шыферу. А сусед супраць...»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З аграгарадка Залессе Смаргонскага раёна са сваёй праблемай патэлефанавала жыхарка двухпавярховага блакіраванага дома на дзве кватэры. Яе сям'я якраз жыве ў прыватызаванай кватэры на другім паверсе. «Дах у дома пляскаты. Літаральна штогод самі мусім яго рамантаваць, мяняць рубероід. Аднак ён усё роўна цячэ. Надакучыла гэта, вырашылі зноў жа самастойна — гатовыя на сто працэнтаў прафінансаваць патрэбныя работы — набыць шыфер, іншыя неабходныя будаўнічыя матэрыялы, узмацніць канструкцыю. Звярталіся ў раённы выканкам па адпаведны праект. Аднак высветлілася, што для правядзення работ патрэбная яшчэ і згода нашага суседа. А ён не даваць катэгарычна адмовіўся, як мы яму ні тлумачылі, што новы дах для нас вельмі важны. Падкажыце, якім чынам можна паўплываць на суседа, якія законныя шляхі вырашэння праблемы могуць быць?»**

Пераадрасаваўшы гэтае пытанне работнікам Смаргонскага райвыканкама, мы, на сваё здзіўленне, асабліва паразумення там не знайшлі. У прыватнасці, загадчык сектара па працы са зваротамі грамадзян Віктар ЗАЯНЧКОЎСКІ, які зняў слухаўку, адразу замест адказу, па сутнасці, сам паставіў пытанні рубам. Маўляў, а чаму заяўніца тэлефанавала ў газету? Чаму не звярталася ў сельскі Савет, у райвыканкам — на трэці паверх, пакой 308? І далей у тым сэнсе, што прынамсі за апошнія шэсць гадоў, з прыходам новага старшыні, не было такога, каб праблема чалавека, што звярнуўся па дапамогу, не была вырашаная.

У сувязі з вышэйсказаным дазволім сабе яшчэ раз паўтарыць тое, што мы ўжо гаварылі суразмоўцу: па-першае, як вынікае са слоў самой заяўніцы, яны ўжо звярталіся ў аддзел архітэктуры і будаўніцтва; па-другое, у чалавека ёсць права патэлефанаваць і ў газету.

...У жыллёвым аддзеле абласнога ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі на пытанні адрэзагавалі больш спакойна. Хоць вырашыць праблему, што турбуе сям'ю заяўнікаў, усё ж аказалася не так проста. Тэлефон, пакінуты для зваротнай сувязі жанчынай, аказаўся з памылкай. Нават пасля яе выпраўлення на працягу некалькіх дзён запар слухаўку так ніхто і не зняў ніводнага разу.

Так, сям'я чытачкі пражывае ў прыватызаванай кватэры. А сусед? Калі таксама, абавязаць яго нешта зрабіць будзе праблематычна. Калі ж кватэра дзяржаўная, наймальнік будзе абавязаны падпарадкавацца прынятаму рашэнню адносна рэканструкцыі даху. Аднак і гэта яшчэ не ўсё. Звярнуцца па праект і атрымаць яго — гэта розныя рэчы. Трэба бачыць пашпарт дома, яго цяперашні стан. Хоць заяўніца і гаварыла, што ўсе навокал ужо рэканструявалі дахі ў падобных дамах, прычым самастойна, і толькі пасля гэтага ўзаконьвалі работы, пагадзіцеся, лепш адразу ўзгадніць усе моманты.

Дарэчы, сама заяўніца між іншым заўважыла, што незадаволенасць у суседа выклікала, у прыватнасці, навіна, што пасля ўладкавання новага даху вада з ліўнёвай будзе трапляць на яго дарожку. Выходзіць, вырашаючы сваю глабальную праблему, якая літаральна датычыцца даху над галавой, людзі адначасова ствараюць няпрычнасці іншым? Няхай, магчыма, і невялікія, але факт застаецца фактам. І як ні спрабавалі мы звярнуць увагу жанчыны на гэты момант, склалася ўражанне, што яна шчыра не разумее, пра што тут гаварыць. Зноў жа, як высветлілася, сусед мае прынамсі ўскоснае ўяўленне (зыходзячы з яго прафесійнага занятку) пра асабліваці канструкцый дамоў. І яго меркаванне варта было б таксама ўлічыць?..

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



## КАМЕНДАНЦКАЯ ГАДЗІНА ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ?

**Генеральная пракуратура падрыхтавала законапраект, які забараняе непаўналетнім знаходзіцца ноччу ў грамадскіх месцах без суправаджэння дарослых.**

У Генпракуратуры ўдакладнілі, што ў праекце закона пад непаўналетнімі падразумяваюцца асобы ва ўзросце да 16 гадоў, пад дарослымі — бацькі (апекуны, папячыцелі), іншыя паўналетнія члены сям'і, блізкія сваякі, асобы, якія пражываюць сумесна, якія суправаджаюць дзяцей па просьбе бацькоў, а таксама асобы, на якіх ускладзены абавязкі па навучанні і выхаванні дзяцей. У тым выпадку, калі законапраект будзе адобраны, у Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях з'явіцца новы артыкул. Ён будзе ўстанаўліваць адказнасць бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць, а таксама асоб, на якіх ускладзены абавязкі па навучанні і выхаванні непаўналетніх, за парушэнне забароны на знаходжанне дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў у грамадскіх месцах у начны час. Летась непаўналетнімі здзейснена 4777 правапарушэнняў, з іх у начны час (з 22 да 6 гадзін) — 1867.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Таксі ў інтэрнэце і інтэрнэт у таксі

1 сакавіка на вуліцы Мінска масава выехалі інтэрнэт-таксі. Новы сэрвіс распрацаваў партал TUT.BY разам з мабільным аператарам МТС і службай таксі 7177.

Для таго, каб карыстацца інтэрнэт-таксі, давядзецца зарэгістравацца ў сацыяльнай сетцы «Я TUT!»

Кіраўнік УП «Надзейныя праграмы» Юрый Зісер паведаміў, што само па сабе браніраванне таксі праз інтэрнэт не навіна нават для Беларусі. Адметнасць праекта TAXI.TUT.BY у тым, што гэта можна зрабіць у сацыяльнай сетцы. Сістэма запамінае ўсе заказы, якія былі раней, у тым ліку і з тэлефона, і дае карыстальніку магчымасць іх паўтарыць, што значна эканоміць час. Можна зрабіць папярэдні заказ на пэўны час. Акрамя таго, можна даведацца аб працягласці паездкі і кошце яшчэ да яе пачатку. Прадугледжана магчымасць безнаяўнага разліку асабістай банкаўскай карткай або прадпрыемствам, і таксісту ўжо нічога не трэба плаціць. Можна гэтую ж самую паездку аплаціць у таксі з камп'ютара, ці з мабільнага праз інтэрнэт. А ў хуткім часе з'явіцца магчымасць разлічвацца банкаўскай карткай непасрэдна ў таксі. Будзе весціся ўлік паездак і расходаў.

Пасажыры могуць карыстацца бясплатным інтэрнэтам. Машыны абсталяваны пунктамі доступу Wi-Fi. Можна паласіць па сайтах падчас паездкі, з мабільнага альбо ноўтбука. У перспектыве плануецца наўянасць працоўных тэрміналаў прама ў салоне аўто. Пра гэта расказаў намеснік дырэктара транспартнай кампаніі «Інтэрнэт-таксі» Мікалай Варанковіч.

— Перавагай тэхналогіі Wi-Fi ў параўнанні з 3G з'яўляецца магчымасць атрымаць доступ у інтэрнэт без выкарыстання SIM-карты і мадэма ці тэлефона. Каб выйсці ў сеціва, дастаткова мець ноўтбук ці смартфон, пры гэтым можна і не быць абанентам МТС. Гэта вельмі каштоўная перавага для гасцей Беларусі — бізнэсменаў і турыстаў, — гаворыць Алена Цярэшчанка, начальнік аддзела дадатковых прадуктаў і паслуг ААТ «Мабільныя ТэлеСістэмы». Пакуль інтэрнэт-таксі могуць карыстацца толькі жыхары сталіцы. І што самае прыемнае — ад увядзення дадатковых паслуг кошт паездкі не павялічыцца.

**Ірына ТАМКОВІЧ.**

## Извещение о проведении аукциона по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и на право заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

**Аукцион состоится 14 апреля 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

**Организатор аукциона:** фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222)229022, 311185, 223375.

**Продавцы недвижимого имущества:** по лотам №№ 1–3 – РУП «Могилевоблгаз», тел. 8(0222)450164; по лотам №№ 4–5 – Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. 8(0222)260790, 260723 – лот № 4, тел. 8(0225)529039, 526409 – лот № 5.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 в фонде «Могилевоблимущество» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная **с 9 марта 2011 г.** Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **12 апреля 2011 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **14 апреля 2011 г. с 10.00 до 10.50.**

| № лота | Сведения о предметах аукциона: Информация о недвижимом имуществе: Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб. | Информация о земельных участках: Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб. | Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб. | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание магазина со складом одноэтажное кирпичное 214,7 кв.м | Могилевская обл., Кличевский р-н, Гончанский с/с, п. Гончанский, ул. Заводская, д. 6 | 57 636,035 | 0,0347 | 10 | 27,607 | 57 663,642 | 5 700,0 |
| 2 | Здание заводоуправления одноэтажное, кирпичное, 205,5 кв.м с мощением из железобетонных плит 24 кв.м; магазин одноэтажный, кирпичный, 219,3 кв.м | Могилевская обл., Глусский р-н, Кировский с/с, п. Кировское | 85 065,410 | 0,0429 | 10 | 15,820 | 85 100,340 | 8 500,0 |
| | | | | 0,0518 | 10 | 19,110 | | |
| 3 | Здание конторы двухэтажное, кирпичное, 504,7 кв.м; здание пожарного депо со смотровой башней и проходной одноэтажное, кирпичное, 306 кв.м; здание механической мастерской с пристройкой, подвалом и сходом в подвал одноэтажное, кирпичное, 605 кв.м; здание автогаража одноэтажное, кирпичное, 544 кв.м; здание продовольственного склада одноэтажное, кирпичное, 257 кв.м; здание цеха с пристройкой одноэтажное, кирпичное, 355,1 кв.м; здание цеха № 2 с пристройкой одноэтажное, кирпичное, 145,9 кв.м; здание цеха №3 с пристройкой и тамбуром одноэтажное, кирпичное, 453,5 кв.м; здание столовой-магазина с котельной одноэтажное, кирпичное, 367,7 кв.м и асфальтным покрытием 374 кв.м | Могилевская обл., Бобруйский р-н, Брожский с/с, п. Редкий Рог | 345 517,279 | 0,0458 | 15 | 71,524 | 346 586,117 | 34 600,0 |
| | | | | 0,0711 | 15 | 111,034 | | |
| | | | | 0,1315 | 15 | 205,358 | | |
| | | | | 0,1014 | 15 | 158,352 | | |
| | | | | 0,0499 | 15 | 85,719 | | |
| | | | | 0,0232 | 15 | 36,230 | | |
| | | | | 0,0716 | 15 | 111,815 | | |
| | | | | 0,1366 | 15 | 288,806 | | |
| 4 | Находящиеся в безвозмездном пользовании по договору у ОАО «Могилевский металлургический завод» капитальные строения | Могилевская обл., Могилевский р-н, Полыковичский с/с, район дер. Полыковичские хутора | 334 016,808 | 1,9177 | 50 | 9 154,400 | 343 171,208 | 34 300,0 |
| | Краткая характеристика имущества, входящего в состав лота: здание умывальника одноэтажное, деревянное, 56,2 кв.м; здание клуба на 100 мест одноэтажное, кирпичное, 138,3 кв.м; пристройка к клубу кирпичная, 31,9 кв.м; спортгородок (футбольное поле 990 кв.м, баскетбольная площадка 200 кв.м, волейбольная площадка 176 кв.м); медпункт одноэтажный, кирпичный, 74,4 кв.м; здание насосной фекальной канализации одноэтажное, кирпичное, 7,6 кв.м, овощехранилище одноэтажное, кирпичное, 13,4 кв.м; пионерская комната одноэтажная дощатая, 38,7 кв.м; два сарая дощатых, одноэтажных, 12,7 и 9,4 кв.м; склад деревянный, одноэтажный, 70,9 кв.м; спальный корпус №1 одноэтажный, кирпичный, 94,5 кв.м; спальный корпус №2 одноэтажный, кирпичный, 94,4 кв.м; спальный корпус для персонала одноэтажный, кирпичный, 125,0 кв.м; спальный корпус №3 одноэтажный, кирпичный, 93,5 кв.м; столовая одноэтажная, сборнощитовая, 316,79 кв.м; линия наружного освещения подземная и воздушная общей длиной 52,5 м; водопроводные сети (чугун и сталь) 82,5 м; линия электропередач 843 м; мощение асфальтобетонное 1708 кв.м; цементобетонное мощение 160 кв.м; мощение из железобетонных плит 382 кв.м; канализационные сети 217 м; сушилка одноэтажная, кирпичная, 24,1 кв.м; два туалета одноэтажных, кирпичных, 13,8 и 19,3 кв.м | | | | | | | |
| 5 | Находящиеся в безвозмездном пользовании по договору у ОАО «Бобруйский завод весоизмерительных приборов» капитальные строения: здание базы отдыха одноэтажное, кирпичное, 257,25 кв.м; дорожки асфальтовые 245 кв.м; забор (металлическая сетка) 428 кв.м; выгребная яма | Могилевская обл., Бобруйский р-н, около дер. Доманово | 91 039,053 | 0,0698 | 99 | 316,440 | 91 355,493 | 9 100,0 |

Начальная цена недвижимого имущества, входящего в состав лотов №№ 1–5 понижена на 50 процентов.

Условия для победителей аукциона в отношении земельных участков, право заключения договоров аренды которых входит в состав лотов:

№ 3 – получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

№ 4 – в двухмесячный срок со дня государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства (в случае изменения назначения приобретенных на аукционе зданий и сооружений).

Земельный участок, право заключения договоров аренды которого входит в состав лота № 5, расположен в водоохранной зоне реки Березина. Победителю аукциона по этому лоту обеспечить соблюдение установленных статьей 77 Водного кодекса Республики Беларусь и иными законодательными актами запретов и ограничений хозяйственной и иной деятельности в использовании вышеназванного земельного участка.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, и копии учредительных документов юридического лица без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки. Оплата за объекты недвижимости производится в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

«А я думаю так...»

# КАЛІ Б Я БЫЛА МУЖЧЫНАМ...

## Інструкцыя па прымяненні для мужчын і хлопцаў

**«Зноў тое самае падарыў», — думае пра мужа жонка на 8 сакавіка. Але мы, мужчыны, не вінаватыя — як умеем, так і дорым. Вы ж не кажаце, што хочаце (ну, не ўсе кажуць), а толькі шматзначна ўсміхаецеся напярэдадні свята. А пасля крыўды: «Я ж намякала».**

**Каб памагчы мужчынам падрыхтавацца да свята, мы папрасілі пяць вядомых беларусак — журналістку, дэпутата, спартсменку, тэлевядучую і пісьменніцу распавесці пра тое, што б дарылі яны, калі б былі мужчынамі. І ўвогуле — як бы яны выглядалі, дзе б працавалі і як бы ставіліся да дзяўчат. Адказы прымушаюць задумацца...**


Лейла ІСМАІЛАВА.


Валянціна ЛУЗІНА.


Аксана МІНЬКОВА.


Саша ПАЎЛАВА.


Раіса БАРАВІКОВА.

### КАЛІ Б Я БЫЛА МУЖЧЫНАМ...

1. Як я выглядала б?
2. Дзе я працавала б?
3. Халастым ці жанатым?
4. Да жанчын я ставілася б...
5. Што б я дарыла жанчынам на 8 сакавіка?

**Лейла ІСМАІЛАВА, журналістка і мадэль, вядучая дзіцячага конкурсу «Дзіцячае Еўрабачанне-2010»:**

**1.** Я была б высокім і дужым мужчынам. Зрабіла б тату́ і абавязкова хадзіла б са шчаціннем! (*смяецца* — **аўт.**)

**2.** У мяне быў бы свой бізнэс. Зарабляла б шмат грошай, мела б сувязі, але што дакладна — медыйнай персонай не станавілася б.

**3.** Была б халастым мужчынам (*смяецца* — **аўт.**). Гадоў так да 35.

**4.** Я абагаўляла б дзяўчат. Захаплялася б іх акружэннем і рабіла б усё, каб ім было прыемна побач са мной.

**5.** Усё залежала б ад адносін, якія звязвалі б мяне з дзяўчынай, але ў цэлым, традыцыйна — гэта кветкі, а таксама шакалад і ўпрыгажэнні. Хто-хто, а мужчыны павінны засвоіць, што лепшыя сябры дзяўчат — гэта брыльянты!! (*усміхаецца* — **аўт.**).

**Валянціна ЛУЗІНА, дэпутат Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД:**

**1.** ...Я адчувала б вялікую павагу да жанчын, у першую чаргу да маці. Я абапіралася б каранямі на гісторыю сваёй краіны, а будучыню сваёй сям'і, дзяцей і ўнукаў бачыла б у непарушным яднанні з гісторыяй. Была б сапраўдным беларусам-патрыётам.

**2.** Працавала б у галіне навукі. Гуманітарны напрамак — гісторыкам.

**3.** Я была б жанатым мужчынам, гаворку вяду пра маладога мужчыну 24-25 гадоў.

**4.** Мае адносіны да прадстаўніц слабага полу былі б узнёслымі, рыцарскімі.

**5.** Я падарыла бы светлыя і ўзнёслыя пачуцці — гэта самае галоўнае. Але іх трэба дарыць не толькі на 8 сакавіка, але кожны дзень. Яшчэ вельмі важны падарунак — кветкі. І, вядома, цікавая кніга. Хоць і кажуць, што не модна зараз чытаць, але ўсё адно кніга — крыніца мудрасці, якая рухае на подзвігі ў імя жанчын, хіба гэта было ў сярэднявечных паэтаў.

**Аксана МІНЬКОВА, спартсменка, алімпійская чэмпіёнка па кіданні молата:**

**1.** Ахайным, акуратным, заўсёды пагаленым. У чыстай бялізне і з прыемным водарам адэкалона. Мела б добрую сілу волі, была б добрым, мужным і спагадлівым.

**2.** Напэўна, спортам бы займалася (*усміхаецца* — **аўт.**).

**3.** Я мужчына і я — жанаты (*смяецца* — **аўт.**). Было б дзіця.

**4.** Была б добрым сем'янінам, клапатлівым і ўважлівым да сваёй сям'і. Жонка і дзіця адчувалі б сябе за мной, як за каменнай сцяной.

**5.** Асацыяцыі такія: вельмі шмат кветак — цюльпаны і мімозы. Таксама каробка цукерак і шампанскае. І — што-небудзь яшчэ, што было б прыемным для жонкі.

**Саша ПАЎЛАВА, тэлевядучая:**

**1.** У першую чаргу дагледжаным і менш кансерватыўным, чым нашы мужчыны сёння. І больш уважлівым. Магчыма, банальная фраза, але гэта тое, чаго нам не хапае, таму што вы, мужчыны, цяпер трошкі зазналіся (*усміхаецца* — **аўт.**). Таму што мы, жанчыны, усё сапсавалі.

**2.** Калі б я была мужчынам, я усё-ткі не адыходзіла б ад тэмы журналістыкі. Была б журналістам. Мая дзіцячая мара — працаваць у гарачых кропках.

**3.** Ці была б жанатым мужчынам? Не!! Я ж не дурань (*смяецца* — **аўт.**).

**4.** Да дзяўчат і жанчын ставілася б з большай увагай. Ставілася б больш уважліва да дробязяў. Розныя дробныя сюрпрызы нам усё-ткі вельмі важныя. І я, як жанчына, усё ж ведаю, што нам часам хочацца. І калі б я была мужчынам, то паспрабавала б як мага больш жанчын ашчаслівіць вось гэтымі дробязямі.

**5.** Я думаю, гэта не такое свята, як Новы год, дзень нараджэння ці дзень усіх закаханых. Гэта ўсё ж чыста сімвалічнае свята, якога ў прынцыпе не існуе. Таму, напэўна, гэта была б банальная рамантычная вячэра, але пастаралася б зрабіць яе незабыўнай. А мы, жанчыны, нічога не забываемся, таму любая рамантычная вячэра з каханым чалавекам будзе незабыўнай.

**Раіса БАРАВІКОВА, пісьменніца, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»:**

**1.** Была б такім мужчынам, на якіх сама часта звяртаю ўвагу: рослым, падцягнутым, інтэлігентным. Са светлымі вачыма і трошкі ўпалымі шчокамі. Была б прывабным. Па характары — дзёрзкім і вострым на слаўцо, мужчынам, які любіць кпіць і ёрнічаць. Разумным, філосафам па жыцці. І патрыётам.

**2.** Любіла б тое, чым займаюся і цяпер, бо гэта — духоўны пачатак. Усё ад духу, а ён — вечны, таму незалежна ад вонкавай абалонкі я займалася б той жа справай. Няма нічога больш высокага, як покліч да творчасці. Любы твор — інтымны, індывідуальны. Ты заўсёды ведаеш, што гэта толькі тваё. Гэта — энергія высокага духу, прызванне.

**3.** Жанатым, жонка і дзеці былі б.

**4.** Да жанчын ставілася б са скепсісам, іроніяй. Але ў душы — з пяшчотай і любоўю. Яшчэ я дазволіла б жонцы думаць, што я — галава, а яна — шыя. Сама ж старалася б быць апорай і стаяць на варце хатняга дабрабыту.

**5.** Няпростае пытанне. Звычайна мужчыны дораць кветкі. Але кветкі — не падарунак, гэта — знак увагі да жанчыны. Іх можна дарыць штодня, так мужчына выказвае сваю ўвагу. Мне шкада кветак, калі яны стаяць у вазе і засыхаюць — гэта глумленне над харавством. У кожнай жанчыны ёсць тайныя жаданні. Жанчына практычная. Часта яна любіць штосьці збіраць, рабіць дома калекцыі з рознай драбязы (з фігурак жабак, чарапашак, іншыя збіраюць талерачкі, прыхваткі на кухню). Вось я прыхільніца керамікі — гадзіну магу стаяць у керамічным аддзеле ўнівермага, глядзець на розныя місачкі-збаночкі. Толькі шкада, што ў нас дома каты, якія часта ўсё разбіваюць. Я была б вельмі ўдзячная мужу, калі б ён накупіў бы мне дробнай керамікі. Яна — сапраўдная памяць, гэта не брыльянты і нават не дарагі парфум, гэта — больш дарагое. Нават калі б я ў космас паляцела — абавязкова ўзяла б якую рэч з керамікі. Гэта гліна — зямля, якая грэе. Увогуле, мужчыны павінны назіраць за сваімі жанчынамі і ведаць іх таемныя жаданні. І выконваць іх (*усміхаецца* — **аўт.**)

**Апытваў Ілья ЛАПАТО.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і з адкрытых крыніц.**

# Беларуская жанчына: «сцэнка», за якой можна схавацца?

**АКТЫЎНЫЯ і вядомыя ў нашым грамадстве жанчыны і мужчыны дзеляцца сваімі поглядамі на тое, якой усё ж такі з'яўляецца беларуская жанчына.**

**Ірына ЧУТКОВА, намеснік прадстаўніка ЮНІСЕФ у Беларусі:**

— Сучасная беларуская жанчына можа спраўляцца з паскоранымі тэмпамі нашага жыцця. Такія якасці, як мэтанакіраванасць, адказнасць не дазваляюць беларускам зніжаць планку — і тут не важна, у якую сферу дзейнасці яны ўцягнуты, галоўнае — усё рабіць сумленна, прафесійна. А яшчэ беларускія жанчыны не баяцца быць натуральнымі, заставацца самімі сабой, і гэта вельмі важная якасць.

**Дзмітрый ШУНІН, шоумен, радыёвядучы:**

— Сучасная беларуская жанчына?.. Гэта прыгажуня з блакітнымі вачыма. Ну ці не абавязкова з блакітнымі — галоўнае ж не колер, а тое, што ў гэтых вачах ёсць бляск. А вочы блішчаць, таму што жыццё гэтай жанчыны цікавае, насычанае, дзівоснае.

**Яўген КРЫЖАНОЎСКІ, гумарыст:**

— Сучасная беларуская жанчына — гэта надзея на сцэнку, за якой можна схавацца. Сёння мужчыны — гэта ўжо далёка не тыя надзейныя «сцены», што раней. А вось жанчыны — іншая справа: «Коня на скаку остановит, в горящую избу войдёт». Вось гэта сапраўды пра нашых жанчын.

**Дзядзя Ваня, спявак, тэлевядучы:**

— Беларуская жанчына сёння сапраўды адчувае сябе жанчынай — на ўсе 100 працэнтаў. І мне здаецца, гэта самая вялікая перамога і самых жанчын, і нас, мужчын.

**Аляксандр ЦІХАНОВІЧ, артыст:**

— Сучасная беларуская жанчына — гэта Ядзя Ціхановіч... Гэта прыгажосць, абаяльнасць і вернасць. Больш за тое, нашы жанчыны спалучаюць у сабе мэтанакіраванасць і пяшчоту, любоў і натуральнасць. І галоўнае, беларуская жанчына — надзейны сябар і пяшчотная клапатлівая маці.

**Валерый КАШЧЭЕЎ, тэлевядучы:**

— Сучасныя беларускія жанчыны — самыя жаноцкія, самыя прыгожыя. Яны сочаць за модай, сваёй знешнасцю. Яны даволі актыўныя — цікавяцца навінамі культуры, ходзяць на прэм'еры тэатра і кіно, ездзяць на экскурсіі. Словам, іх жыццё цікавае, змястоўнае. Але самае важнае — яны цудоўныя маці і жонкі.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ПЕРАНЕСЛІ ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ, УНЕСЛІ ЗМЯНЕННІ Ў РАСКЛАД

**У сувязі з пераносам працоўнага дня з 7 на 12 сакавіка ў працу гарадскога сталічнага пасажырскага транспарту таксама ўносяцца змяненні.**

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», на гарадскіх аўтобусных маршрутах рух будзе арганізаваны: 5 сакавіка — па графіку суботы, 6,7,8 сакавіка — па графіку нядзелі, 12 сакавіка — па графіку буднага дня; на тралейбусных і трамвайных маршрутах: 5,6,7 сакавіка — па графіку суботы, 8 сакавіка — нядзелі, 12 сакавіка — па раскладзе буднага дня.

Што датычыцца працы прыгарадных аўтобусных маршрутаў, пасажырам трэба ведаць наступнае. 5 і 7 сакавіка рух будзе арганізаваны па графіку суботы, 6 і 8 сакавіка — нядзелі, 11 сакавіка — па графіку чацвярга, 12 сакавіка — па графіку пятніцы.

Акрамя таго, 7 сакавіка не плануецца праца шэрагу аўтобусных маршрутаў: №№ 114, 125, 554, 555, 576, 583, 589, 1019-ТК, 1026-ТК, 1199-ТК, 1233-ТК, 1507-ТК. На аўтобусных маршрутах №№ 130, 140 колькасць рухомага саставу змяншаецца, затое арганізуецца праца аўтобуснага маршруту № 114Д.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество, 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А, извещает своих акционеров, что 17 марта 2011 года в 10.00 СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА**

Собрание состоится в г. Минске по адресу: пр. Победителей, 59, бизнес-центр гостиницы «Виктория».

Орган, созывающий собрание акционеров, – Наблюдательный совет «Приорбанк» ОАО.

Лица, имеющие право на участие в Собрании, имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, за 5 дней до начала Собрания в Центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Регистрация участников будет осуществляться с 9.00 до 9.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия, путем внесения сведений о зарегистрированном участнике в автоматизированную информационную систему регистрации участников Собрания акционеров.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

| | |
|---|---|
| 1. | Отчет Наблюдательного Совета банка за 2010 год. |
| 2. | Отчет Правления о работе банка за 2010 год и основные направления деятельности на 2011 год. |
| 3. | Рассмотрение заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2010 год; утверждение годового отчета за 2010 год: баланс банка, отчет о прибылях и убытках, отчет об изменении капитала и отчет о движении денежных средств; распределение прибыли за 2010 год. |
| 4. | Установление размера дивидендов и срока их выплаты. |
| 5. | Внесение изменений в Устав «Приорбанк» ОАО. |
| 6. | Внесение изменений в Положение о Наблюдательном Совете «Приорбанк» ОАО. |
| 7. | Внесение изменений в Положение о Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО. |
| 8. | Избрание членов Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО. |
| 9. | Избрание членов Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО. |
| 10. | Предоставление безвозмездной (спонсорской) помощи. |
| 11. | Определение размера вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного Совета, Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей. |
| 12. | Информация об аффилированных лицах «Приорбанк» ОАО. |

**Наблюдательный Совет, Правление «Приорбанк» ОАО.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 28.08.2008 года. УНП 100220190.*

# «ФАБРЫКА ЗОРАК» У МІНІЯЦЮРЫ

**Сёння ў эфіры тэлеканала АНТ прэм'ера праекта «Я спяваю»**

**«Я спяваю» (арыг. назва «Я пою») — новы праект «АНТ», створаны для дзяцей Беларусі. Ідэя праекта з'явілася год таму і цалкам належыць творчай групе тэлеканала АНТ. У жніўні прадзюсары конкурсу пачалі пошук таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак. Першым этапам стаў агляд таленавітых дзяцей у дзіцячых дамах — прадстаўнікі тэлеканала пабывалі ў 26 установах.**



Фота прэс-службы АНТ.

У лістападзе дзеці пачалі заняткі пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча культуры Святланы Стацэнкі, заняткі праходзілі ў цэнтры па падрыхтоўцы таленавітай моладзі імя Ул. Мулявіна.

— Вакальная падрыхтоўка не ўсім дзеткам давалася лёгка, некаторыя з іх перад праектам музыкай зусім нідзе не займаліся, — расказала «Звяздзе» **музычны кіраўнік праекта Святлана Стацэнка.** — Таму тыя тры месяцы, якія ў мяне былі на працу з імі, я старалася падцягнуць і падбадзёрыць найперш такіх дзетак. Музычную падрыхтоўку яны прайшлі экстэрнам, бо нават у сваёй студыі перад тым, як дзесьці паказваць дзіця, я займаюся з ім як мінімум год. Вядома, за тры месяцы цяжка чамусьці навучыць на прафесійным узроўні. Увогуле, праект не разглядаўся як толькі вакальны — у ім расказваецца пра саміх дзяцей і іх лёсы, а песня ідзе як дадатак.

У эфіры гледачы ўбачаць пяць тэматычных выпускаў праекта: дуэты з беларускімі артыстамі, замежныя хіты, саўндтрэкі да расійскіх фільмаў, песні «Еўрабачання», творчы вечар Кіма Брэйтбурга. Музычным кіраўніком праекта стала Святлана Стацэнка, пастаяннымі экспертамі выступяць Анжаліка Агурбаш, Аляксандр Саладуха і «Міс Беларусь-2008» Вольга Хіжынкова.

— Я даўно задавалася пытаннем, чаму нічога падобнага ў нас яшчэ няма, — расказала «Звяздзе» **«Міс Беларусь-2008» Вольга Хіжынкова.** — Праект «Я спяваю» стаў вельмі чаканым мерапрыемствам. Увогуле, ён парадаваў сваёй атмасферай — вельмі жывой і цёплай. Спадзяюся, экран не паглыне тую атмасферу, якая адчувалася падчас здымак. Прыемна парадавалі дзеткі — я на іх месцы вельмі перажывала б, нервавалася, а яны малайцы — трымаліся нязмушана. Кожны канцэрт, скажу шчыра, быў сюрпрызам — кожны раз дзеці адкрываліся з новага боку...

### Як вызначыцца пераможца?

Завершыцца песенны марафон фінальным спаборніцтвам, якое і вызначыць лепшага спевака. Пераможца праекта «Я спяваю» цэлы тыдзень правядзе ў парыжскім «Дыснейлэндзе», дзе зможа наведваць усе атракцыёны без абмежавання.

Сутнасць спаборніцтва простая: кожны тыдзень дзеці будуць выконваць падабраныя спецыяльна для іх песні. У канцы кожнага тэматычнага канцэрта гледачы, якія знаходзяцца ў зале, галасуюць за таго, хто, на іх думку, аказаўся лепшым. Дзіця-пераможца атрымоўвае ў выніку зорку. Па адной зорцы ёсць таксама ў кожнага суддзі, але скарыстацца ёй яны змогуць толькі аднойчы. Той, хто набярэ ў выніку найбольшую колькасць зорак, перамагае.

Тэлегледачы таксама змогуць прагаласаваць за юных артыстаў. Для гэтага трэба будзе патэлефанаваць па нумары, які з'явіцца на экране. Усе сродкі, сабраныя ад тэлегаласавання, будуць накіраваны ў дзіцячыя дамы Беларусі.

— Гэта самы лепшы і самы шчыры праект «АНТ», — прызнаецца «Звяздзе» **прэс-сакратар АНТ Таццяна Курбат.** — Лепшая каманда, лепшы бэк-вакал і лепшая харэаграфія. Без сумневу, праект атрымае працяг, здымкі наступных сезонаў ужо запланаваныя.

Першы выпуск праекта «Я спяваю» стартуе 5 сакавіка ў 19:00 і будзе выходзіць кожную суботу. Імя вядучага трымаюць у сакрэце да першага выпуску.

**Ілья ЛАПАТО.**

### Май на ўвазе:

На канцэртах будзе выкарыстоўвацца толькі жывы гук — ніводная з песень не будзе выканана пад фанаграму. Да таго ж усе артысты на сцэне выступяць у суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна.

### Хто ўдзельнічае?

Для ўдзелу ў конкурсе "Я спяваю" было выбрана 9 фіналістаў:

**Аляксей Кузьмін**
**Аляксандра Лакціёнава**
**Зухра Вяргейчык**
**Юлія Пінькевіч**
**Раман Свістуноў**
**Кацярына Карагіна**
**Надзея Місякова**
**Аліна Молаш**
**Дзмітрый Рыжыкаў**

Вясновы сюрпрыз

# Джазавае адкрыццё Амерыкі

## Упершыню ў Мінску выступіў з канцэртам легендарны джазавы спявак Эл Джэро

Паводле слоў арганізатара канцэрта Максіма Берына, гэта вялікая ўдача, што ўдалося ажыццявіць прыезд у Беларусь уладальніка 8 прэмій «Грэмі».

Гастрольны тур амерыканскага спевака пачаўся ў Маскве, потым былі канцэрты ў Санкт-Пецярбургу і Вільнюсе. Адтуль артыст накіраваўся ў Мінск, каб даць адзіны канцэрт у вялікай зале Белдзяржфілармоніі.

— Для мяне прыезд у вашу краіну — гэта магчымасць сустрэць новых сяброў і адкрыць вам, магчыма, новы погляд на Амерыку. Дзякуючы мне вы даведаецеся больш пра ЗША, вы даведаецеся, як змянілася наша гісторыя, — сказаў Эл Джэро. Не, ён праспяваў...

Ён наогул пачаў спяваць яшчэ на сустрэчы з журналістамі, адказваючы на пытанні. Выглядала так, што кожную думку ён прывык падмацоўваць нейкай музычнай фразай. Што тут скажаш: шматгадовы вопыт зносін і з прэсай, і з прыхільнікамі, калі свой статус



зоркі джазавых спевак трэба ўвесь час падтрымліваць, і не толькі на сцэне ці ў студыі. Імідж... Ёсць чаму павучыцца нашым артыстам: адрэпетавана ўсё. Адчуваецца, што на шмат гадоў наперад. Ёсць музычны адказ на любое пытанне. Ён нават можа паказаць, як гучыць цішыня, якой ёсць месца ў яго жыцці — напрыклад, у яго машыне. Таму што бываюць моманты, калі артысту, спеваку хочацца пабыць сам-насам з сабой...

— Джаз — гэта жывая музыка, — тлумачыць спявак. Зараз джаз — гэта музыка больш інтэлектуальная, людзі яе могуць слухаць у сябе ў спальні, у гасцінай, на працы. Дзе заўгодна. Яе ў першую чаргу трэба любіць і адчуваць. Джаз ніколі не будзе такім, якім ён быў раней. Перш за ўсё трэба добра валодаць самім інструментам, на якім чалавек выконвае сваю музыку. Мець сэнс, дзеля чаго гэта робіцца. Выкананне джазу падобнае на маляванне на публіцы, калі людзі сядзяць і сочаць за тым, што робіць мастак. Калі людзі сядзяць і назіраюць за тым, што чалавек стварае на сцэне. Ён нібыта стварае карціну.

Голас Эл Джэро лічаць унікальным, таму што ён можа імітаваць ім гучанне розных інструментаў. Але Эл Джэро — гэта яшчэ і артыст, які разумее, што ўвесь час павінен здзіўляць, каб заставацца на вышыні.

— Сітуацыя ў музыцы мяняецца. Яна не такая, як была 15, 30, 40 гадоў таму. Але кожны артыст, кожны музыкант павінен знайсці, стварыць нешта новае, змяніць сітуацыю. Калі мая кар'ера пачыналася, быў самы разгар рок-н-рола. Але мне даводзілася рухацца паміж рознымі выканаўцамі, рознымі кірункамі. Я раблю тое, што мне падабаецца. Мне падабаецца тое, што я раблю. Гэта самае галоўнае. Я пачаў спяваць у 5 гадоў. Працягваў спяваць у вышэйшай школе, дзе зразумеў, што такое класічныя спевы. Магчыма, менавіта тады я пачаў думаць пра тое, што раблю зараз. Я спяваю не для таго, каб зарабляць, а дзеля таго, каб натхніць людзей.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что 14 марта 2011 года *в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» от 2 марта 2011 года, протокол № 7, на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»* ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

Место нахождения общества и место проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

**Повестка дня**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении Порядка направления работников ОАО «Белагропромбанк» в служебные командировки в новой редакции.
3. О безвозмездной передаче в собственность Республики Беларусь имущества ОАО «Белагропромбанк».
4. Об утверждении дополнений и изменений в Положение о порядке начисления и выплаты дивидендов по акциям ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 3 марта 2011 года.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня в течение рабочего времени банка по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 11 марта 2011 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк», филиалов (отделений) банка, по факсам 229 64 54 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

**Телефон для справок: 8(017) 229 64 54.**

**Телефон Контакт-Центра Банка – 136**
8.00–20.00 – рабочие дни, 8.00–18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*

# ДРОВЫ ЕДУЦЬ У СУНАІ

Уладзіміра Касменку разам з сынам Алегам ужо каторы год можна пабачыць на дзялянках Старыцкага лясніцтва — бацька і сын, што жывуць у вёсцы Сунаі, самастойна нарыхтоўваюць дровы на наступны ацяпляльны сезон. Вось і сёлета давялося сустрэцца з імі ў Капыльскіх лясах. Конь Жора дапамагаў Уладзіміру Мікалаевічу і лесніку Аляксандру Карпучку перавозіць дровы. У гэты час Алег працаваў крыху далей — разам з мужыкамі ссякаў галіны. Дарэчы, у свае семдзесят адзін Уладзімір Мікалаевіч шаснаццаты год запар дапамагае саджаць новыя дрэвы. Ён лічыць: «Лес — гэта грыбы, ягады. Ды гэта ж багацце наша!»

Сёлета Капыльшчыне не пашчасціла: два тыдні таму прайшоўся па лясах буран. «Вырваў шасцідзесяцігадовыя дрэвы з карэннем», — ідучы па лесе, бядуе ляснічы Уладзімір Занкевіч. Таму працы ў леснікоў прыбавілася.

Ацяпляльны сезон хоць і падыходзіць да свайго лагічнага завяршэння, але паклапаціцца пра дровы не пашкодзіць: наперадзе яшчэ не адна халодная вясновая ноч. Усе лясныя гаспадаркі Беларусі прапаноўваюць самастойна нарыхтаваць сабе дровы на спецыяльна адведзеных для гэтага дзялянках. Саманарыхтоўка дроў — гэта не толькі карысна для здароўя (згадзіцеся, свежае паветра і добрая фізічная трэніроўка нікому яшчэ не пашкодзіла), але і істотная эканомія сямейнага бюджэту. Кошт самастойна нарыхтаванага кубічнага метра драўніны зараз каштуе каля 500-600 беларускіх рублёў.

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**

*Капыльскі раён.*



# ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

**Нядзеля, 6 сакавіка**

Сёння ўзмоцніцца інтуіцыя, даўшы магчымасць спантанна, без роздумаў правільна рэагаваць. Але пры гэтым падвысіцца і рызыка выбраць не той накірунак. Таму ў пытаннях, для якіх ліквідаваць наступствы памылак складана, лепш нікуды не спяшацца, адклаўшы адказныя рашэнні да больш стабільнага і прадказальнага часу. Затое ў сферах менш рацыянальных можна разлічваць на адчувальны прагрэс.

**Панядзелак, 7 сакавіка**

Дзень пастравіць ярка выяўлены акцэнт на матэрыяльныя пытанні і надасць новы імпульс развіццю адносін, а таксама прынясе свежы струмень ідэй ва ўсе сённяшнія працэсы. Адзіным мінусам дня, мабыць, стане практычна нулявая прадказальнасць падзей, затое адчувальна пашырацца і магчымасці — усё ў нашых руках!

**Аўторак, 8 сакавіка**

Сённяшні дзень чакаецца па-вясноваму ласкавым і гарманічным. Адчувальна актывізуюцца зносіны і ўсе віды ўзаемадзеяння з навакольнымі, узмоцніцца эмацыйная ўстойлівасць і рацыянальнасць — дзянёк тонкасцю і сентыментальнасцю пакутаваць не будзе. З бляскам атрымаецца разабрацца з усімі бягучымі пытаннямі, а ў блізкіх адносінах дадасца агню і запалу.

**Серада, 9 сакавіка**

Дзень абяцае як мінімум нядрэнныя далягляды як у рашэнні дзелавых і працоўных пытанняў, так і ў зносінах з навакольнымі. Праўда, практычныя здзяйсненні будуць тым больш адчувальнымі, чым менш руцінным, аднастайным і механічным шляхам яны будуць дасягацца — уяўленне з вынаходлівасцю будуць годныя лепшага прымянення, чым перанос цаглін, уборка тэрыторыі або перакладанне папер з аднаго стоса ў іншы.

**Чацвер, 10 сакавіка**

Сёння наўрад ці атрымаецца сабраць пад свае сцягі ўяўленне, вынаходлівасць і добрую рэакцыю, хоць назваць пералічаны камплект абавязковым на кожны дзень, вядома, нельга. Адзінае, чаго рабіць не варта сапраўды, — гэта брацца за праекты і пытанні, якія патрабуюць поўнай выкладкі, а то і перавышаюць «грузападымальнасць» — запас сіл да козыраў гэтага дня аднесці складана.

**Пятніца, 11 сакавіка**

Эмоцыям сёння не дазволяць асабліва разгуляцца, але і верагоднасць усплёскаў са знакам мінус практычна роўная нулю. Што, зрэшты, хутчэй актыў, калі трэба сканцэнтравацца на планамерным выкананні бытавых, ды і любых задач, якія поўнасцю залежаць ад сабранасці і грунтоўнасці.

**Субота, 12 сакавіка**

Выдатны дзень з усіх пунктаў гледжання і вельмі падыходны час для пакупак. Сёння можна будзе разлічваць на арганізаванасць і накіраванасць на вынік. Адкрытасць, дзейнасць і лёгкасць на пад'ём — усё гэта мы таксама зможам «прымаць» у чыстым выглядзе. Бліжэй да вечара агульны эмацыйны фон некалькі здасць свае пазіцыі, што, хутчэй за ўсё, адаб'ецца і на адносінах з навакольнымі. Шукаць кропкі судакранання стане больш складана, а вось шлях ад іскры да полымя можа адчувальна скараціцца.

# КАРАЛІШЧАВІЦКАЕ ЦЯПЕЛЬЦА

**Успамінаў пра Кандрата Кандратавіча Крапіву ў мяне шмат. Спачатку пазнаёмілася з ім як з суседам. Самой мне было пятнаццаць. Сям'я Кандрата Крапівы і мае бацькі пасля вайны нейкі час жылі ў суседніх дамах на вуліцы Маладзечанскай, што была ў Мінску каля хлебазавода. Зараз вуліцы гэтай няма, застаўся толькі невялікі кавалачак брукаванкі, недалёка ад царквы святой Марыі Магдалены. Ну а пасля, калі ўжо я стала нявесткай Кандрата Кандратавіча, практычна ўсё жыццё правяла побач, і ніколі не хацелася мне перааязджаць з яго гасціннага і ўтульнага дома. Была я побач з ім і ў самую апошнюю хвіліну яго жыцця. Але пра гэта калі-небудзь раскажу асобна.**



**Злева-направа: Зоя Мікалаеўна Атраховіч (нявестка Кандрата Крапівы), Алена Канстанцінаўна Атраховіч (жонка Кандрата Крапівы), Кандрат Крапіва, сярэдзіна 1950-х гг.** *Каралішчавічы.*

Сёння ж хочацца прыгадаць яскравыя ўспаміны, звязаныя з летнімі вечарамі ў Каралішчавічах.

Дом творчасці пісьменнікаў, што быў у Каралішчавічах, напэўна, ведаюць усе. У мяне з Каралішчавічамі таксама звязана многае.

Пяцідзясятыя гады мінулага ўжо стагоддзя. Самы пачатак пяцідзясятых. Мне было нямногім больш за дваццаць гадоў. Толькі-толькі стала я членам сям'і Кандрата Кандратавіча, яго нявесткай. І вось на працягу даволі доўгага часу кожнае лета мы праводзілі ў Каралішчавічах. Кандрат Кандратавіч браў у Дом творчасці ўсіх нас, усю сваю сям'ю. Цудоўны гэта быў час. Мы з маім мужам Ігарам (сынам Кандрата Крапівы) былі зусім яшчэ маладыя. Сам Кандрат Кандратавіч знаходзіўся на ўздыме сваіх творчых сіл. Заўсёды побач з ім была яго жонка Алена Канстанцінаўна — вельмі вясёлая, жыццярадасная жанчына, душа кампаніі.

На ўсё жыццё застаўся ў памяці ўспамін пра каралішчавіцкае цяпельца. Перад будынкам Дома творчасці была вялікая паляна, абкружаная елкамі. Елкі высокія і густыя, лес быў натуральны, не штучныя пасадкі. Дык вось, на той паляне пісьменнікі кожны вечар збіраліся ля вогнішча. Так неяк само сабой склалася, што «адказным» за яго быў Міхась Ціханавіч Лынькоў. Усе пісьменнікі ведалі, што была ў яго, як жартаваў Кандрат Кандратавіч, «палымяная жарсць» — цяпельца. Але ў Каралішчавічах нярэдка рабіў ён і даволі вялікае вогнішча. У цэнтры паляны, недалёка ад ганка, ён абуладкаваў месца для вогнішча. Заўсёды загадзя, часам яшчэ з раніцы, рыхтаваў сухое галлё, дровы. У яго была нейкая свая сістэма, каб распаліць агонь. Спачатку клаў галлё, зверху ставіў нейкім конусам сухія бярвенні, унутры ў гэтым конусе размяшчаў сухую траву або мох.

Калі дзень ужо непрыкметна хіліўся да вечара, адзін за адным вярталіся ў Дом творчасці з працы пісьменнікі. Многія з іх ездзілі на працу ў Мінск прама з Каралішчавічаў. Ну а нехта быў у адпачынку.

Кандрат Кандратавіч таксама прыязджаў з Мінска кожны дзень пасля работы. Тады ён ужо працаваў у Акадэміі навук. Дык вось, вярнуўшыся, падсілкаваўшыся, трохі адпачыўшы, пісьменнікі паступова, няспешна падцягваліся да вогнішча. Кандрат Кандратавіч амаль кожны вечар прыходзіў туды: вельмі ўжо любіў вечарам адпачыць ля цяпельца, пагаварыць са сваімі сябрамі і калегамі.

Паступова ўся паляна запаўнялася жыхарамі Дома творчасці. Быў нават нейкі свой парадак. Спачатку выходзілі жанчыны — жонкі пісьменнікаў. Недалёка каля ганка, злева, стаялі крэслы-качалкі — гэта былі «месцы для жанчын». Не спяшаліся, выходзілі з добрым настроем, са смехам. Алена Канстанцінаўна, жонка Кандрата Кандратавіча, любіла выйсці адной з першых, уладкавацца ў такім крэсле і чакаць іншых. Калі падыходзілі астатнія, заўсёды яна аказвалася ў цэнтры ўвагі. Вельмі абаяльная, кантактная, усмешлівая. Жанчыны збіраліся вакол яе. Алену Канстанцінаўну любілі, некаторыя звалі «Крапівіхай», але часцей «цётка Алена». Да яе цягнуліся, раіліся на нейкіх гаспадарчых пытаннях, і па жыццёвых, і пра выхаванне дзяцей любілі пагаварыць. А яшчэ жанчыны любілі паслухаць, калі яна штонебудзь распавядала са свайго жыцця. Алена Канстанцінаўна любіла пагаварыць, і трэба сказаць, што расказчыца была яна выдатная. Размаўляла на сакавітай, сапраўды народнай каларытнай беларускай мове, ды так смешна, вобразна, эмацыйна! У Алены Канстанцінаўны была нейкая прыродная інтуіцыя, было ў яе тое, што называюць культурай душы і сэрца. З цікавасцю і нават з годнасцю я назірала, што людзі да яе ставіліся вельмі паважліва, і ў той жа час з даверам. А хто маладзейшы, дык нават з сапраўднай пашанай.

З правага баку ад ганка збіраліся мы, моладзь. Мы не заўсёды прыслухоўваліся, пра што там гавораць старэйшыя. У нас былі свае размовы, свае справы. Але час ад часу назіралі, што ж там адбываецца каля вогнішча.

У цэнтры паляны вакол вогнішча пачыналі збірацца мужчыны. Гадзін з дзевяці падцягваліся, і каля дзесяці ўсе ўжо былі ў зборы. Разам з Кандратам Кандратавічам часта ішлі Максім Танк, Аркадзь Куляшоў і іншыя старэйшыя літаратары. Каля старэйшых неяк увіхаліся і маладыя. Добра памятаю зусім маладога Андрэя Макаёнка. Кандрат Кандратавіч ужо і тады называў яго «вельмі здольным хлопцам». Усіх ужо чакаў там Міхась Ціханавіч. Вось сабраліся. І тут Міхась Лынькоў распальваў агонь, прычым распальваў так хутка, што полымя разгаралася ў адзін міг і разам ахоплівала ўсё вогнішча. Пачыналася гутарка. Нехта гаварыў гучна, нехта цішэй. Абмяркоўваліся справы, можа, і якія творчыя пытанні. Часам абмеркаванне было вельмі актыўнае.

У гэтым гуле галасоў заўсёды вылучаўся голас Максіма Танка. Басавіты, магутны, нізкі. Вылучаўся голас Міхася Лынькова. Няспешны, немалады ўжо. Усе замаўкалі, слухалі моўчкі. Расказваў ён звычайна нейкую цікавую гісторыю.

Чуўся даволі гучны тэнар Аркадзя Куляшова. У Кандрата Кандратавіча голас быў нягучны, спакойны, але з нейкай энергетыкай. І вось такая засталася ў памяці карціна. Гучаць галасы, ідзе размова, і раптам гучны выбух, менавіта выбух, смеху. Гэта Кандрат Крапіва з чагосьці пажартаваў. Зноў гавораць. І зноў праз некаторы час — выбух гучнага і вясёлага смеху. Зноў нешта смешнае сказаў Кандрат Кандратавіч.

Доўга сядзелі. А калі ўжо, нагаварыўшыся, пачыналі разыходзіцца, Кандрат Кандратавіч ішоў у свой пакой, садзіўся за пісьмовы стол і пісаў, потым друкаваў на сваёй машынцы. Ну а мы, яго блізкія, прывыклі засынаць пад стук гэтай машынкі. Яна не замінала нам. Працаваў ён гадзін да дзвюх ночы. А раніцай зноў ад'язджаў на працу.

Прайшло ўжо больш за паўвека. Сёння, седзячы летнімі вечарамі ля вогнішча з дачкой, унучкай і маленькім праўнукам Глебам, я з цеплынёй і пэўным смуткам успамінаю пра тыя даўнія часы. Каралішчавіцкае цяпельца і зараз грэе мне душу.

**Зоя АТРАХОВІЧ,**
**кандыдат медыцынскіх навук.**

# «НЕ РАЗБЯРУЦЦА, ЗЛОВЯЦЬ — ЧЫК, ТАДЫ Й ДАВОДЗЬ, ШТО ТЫ НЕ БЫК...»



**Кандрат Крапіва, канец 1960-х гг.**

Кандрат Крапіва... Народны пісьменнік БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, доктар філалагічных навук, акадэмік Акадэміі навук БССР. Для мяне ж ён — проста дзед Кандрат.

У мяне часта пытаюцца: а якім жа быў твой дзед Кандрат?

Перагортваючы старонкі уласных успамінаў пра дзеда, я зноў і зноў прыгадваю і перасэнсоўваю тую частку свайго жыцця, што прайшла побач з ім. А частка гэта складае трыццаць пяць гадоў. Пры гэтым бачыліся мы з ім практычна кожны дзень.

Самыя першыя з маіх дзіцячых успамінаў датычацца канца пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. Прасторная кватэра, якая размяшчалася на апошнім паверсе дома нумар дванаццаць на Ленінскім праспекце (зараз — праспект Незалежнасці), каля будынка галоўнага паштамта. Адзін са шматлікіх пакояў займала «бібліятэка», так мы яе называлі. Там усе сцены былі застаўлены кніжнымі шафамі, высокімі, ажно да столі. На паліцах — кнігі, кнігі, кнігі...

У суседнім пакоі размяшчаўся кабінет дзеда. На вокнах доўгія і цёмныя шторы з нейкай тоўстай тканіны. Праўда, Кандрат Кандратавіч іх не вельмі любіў і ніколі не заштурхоўваў, бо надта ўжо не падабаліся яму завешаныя вокны. Дзед заўсёды дазваляў мне гуляць у сваім кабінеце. Там было ціха, чыста, ідэальны парадак на пісьмовым стале і ў кніжных шафах, і нейкая творчая аўра. Утульна. Нярэдка, пры дапамозе крэсла, узбіралася я на шырокі падваконнік і назірала з вышыні, што ж там робіцца ўнізе, на праспекце.

Злева каля акна стаяў дзедаў пісьмовы стол. Масіўны, цёмны, ён ствараў уражанне прысадзістасці. Калі была я маленькая, то вельмі любіла, пакуль дзед у Акадэміі, «папрацаваць» ля яго стала, узяўшы кнігу з нашай «бібліятэкі». Праўда, «працавала» я не за сталом: вельмі ўжо быў ён для мяне высокі. Забіралася пад стол, уладкоўвалася паміж тумбамі, нібы ў пакойчыку. І доўга, седзячы там, гартала кнігу, сачыняла нейкія гісторыі, аб чым-небудзь думала. Вельмі ўжо добра думалася ў гэтым кабінеце.

Каля стала стаяла крэсла з цёмнага дрэва, з высокай спінкай. На мой погляд, было яно вельмі жорсткае, але надзвычай прыгожае.

Стол стаяў бокам да акна, каб святло падала злева. Побач, на сцяне вісеў партрэт, зроблены ў тэхніцы алоўкавага малюнка. Яго намаляваў з фотаздымка мой бацька Ігар Кандратавіч. На партрэце — дзед са сваім сынам Барысам (маім дзядзькам), які загінуў на Вялікай Айчыннай вайне — іх апошняя ў жыцці сустрэча, што адбылася ў час вайны. Абодва ў гімнасцёрках. Мужныя, сур'ёзныя твары. Былі яны надзвычай падобныя адзін да аднаго. Гавораць, што не толькі знешне, але і характарамі.

Калі надыходзіў вечар і ўся сям'я ўладкоўвалася спаць, Кандрат Кандратавіч спаць не ішоў, а дапазна заставаўся ў кабінеце. Кватэра сціхала, пагружалася ў змрок, а ў дзеда на стале гарэла лямпа. Тая самая лямпа, з зялёным абажурам, якую добра ведалі старэйшыя пісьменнікі. Раз, ужо працуючы ў Акадэміі навук, выступала я на адным літаратурным вечары і прыгадала пра гэту лямпу. Пасля вечара падышоў да мяне Янка Брыль і сказаў: «Дзякуй табе, Леначка, за лямпу з зялёным абажурам».

Была такая лямпа і ў Янкі Купалы, і ў Якуба Коласа, і яшчэ ў некаторых пісьменнікаў, і, думаю, што не толькі сваціла ім сваім мяккім святлом, але і сэрца саграваЛа.

З дзяцінства памятаю такую карціну: дзед нешта засяроджана піша, схіліўшыся над сталом. Потым задумваецца, прытуліўшы левую далонь да галавы. Так ён часта рабіў, калі думаў. Зноў піша. Потым пачынае друкаваць на сваёй машынцы, маркі «Фартуна», што верна праслужыла яму амаль паўвека.

Карціна гэта, што бачыла я ў дзяцінстве, зазірнуўшы вечарам да дзеда ў кабінет, мяне чамусьці ўражвала. З цягам часу зразумела чаму: сам сабой адбываўся працэс выхавання. Выхоўваць жа дзіця можна і моўчкі. Не трэба шмат слоў — дастаткова было штовечар бачыць простае святло, якое прабівалася ў шчыліну з-за дзвярэй дзедавага кабінета.

А вось больш позні ўспаміны. 1986 год. Жывём мы па-ранейшаму на праспекце Незалежнасці, толькі ўжо на другім яго канцы, у доме нумар 76. Кандрат Кандратавіч рыхтуецца святкаваць сваё дзевяностагоддзе. Самому яму выязджаць было ўжо цяжка, таму кіраўнікі ўрада Беларусі вырашылі прыехаць да яго на кватэру, каб павіншаваць з такім выдатным юбілеем.

Прыехалі ўдзень 5 сакавіка. Дзед выйшаў да стала, які мы з мамай загадзя накрылі. Кандрат Кандратавіч заўсёды любіў смачна пачаставаць сваіх гасцей. За сталом стварылася прыўзнятая святочная атмасфера. Мы чулі, як госці жартуюць. Дзед прачытаў сваю новую байку, завязалася цікавая размова. Раптам нехта з гасцей прапанаваў наліць чарачку ў гонар імянінніка. Такі юбілей! Але Кандрат Кандратавіч сказаў: «Нядаўна ж выйшаў указ — забаронена піць на працоўным месцы (маючы на ўвазе вядомы ўказ М. Гарбачова). Што да мяне, то я выпіць мог бы, бо адпачываю, а вы ж — на працы. Нельга. Таму піць не будзем».

Засмяяліся і ўспомнілі вядомую байку Кандрата Крапівы «Дэкрэт»:

«Не разбяруцца, зловяць — чык,
Тады й даводзь, што ты не бык.»

Кіраўнікі ўрада з дзедам пагадзіліся, бо сапраўды, было толькі дванаццаць гадзін дня — працоўны дзень у самым разгары. Выпілі вінаграднага соку. Смачна паабедалі. Вось так Кандрат Кандратавіч не дазволіў кіраўніцтву парушыць указ, нават і ў дзень свайго юбілею.

І яшчэ адзін успамін. Апошні. Надыходзіў 1991 год. У дні навагодніх свят патэлефанаваў Кандрат Кандратавіч сваім сябрам-пісьменнікам. Тыя сабраліся разам і святкавалі. Гаварыў ён з Іванам Пятровічам Шамякіным, перадаваў прывітанне і віншаванне іншым, хто быў яшчэ ў той кампаніі. І сказаў такія словы: «Якія вы шчаслівыя, што вы разам, а я вось, на жаль, не магу да вас далучыцца...». Гэты, 1991 год, Кандрат Кандратавіч сустрэў не ў добрым стане, пажартаваў: «Відаць, выйшаў на фінішную прамую». Сумны быў жарт.

Раніцай, 6 студзеня, Кандрат Кандратавіч адчуў сябе зусім кепска, але быў у поўнай свядомасці. Калі я падышла да яго, мы доўга гаварылі. Пра ўсё. Спытаўся ён пра маю сям'ю і творчыя планы, пацікавіўся, як ладзяцца справы ў іншых дамачадцаў, даў нават некаторыя парады. Паразважаў ён і аб лёсе дзяржавы. Час быў складаны, але дзед мой, перажыўшы ўжо не адну «эпоху перамен», заставаўся аптымістам. Мне не хацелася заканчваць нашу размову, ды дзед раптам прыпыніўся, сказаўшы: «Ну ўсё, Алёнушка, вельмі я стаміўся, хачу адпачыць».

Увечары ён заснуў і больш не прачнуўся. Сэрца Кандрата Кандратавіча спынілася каля пяці гадзін раніцы 7 студзеня 1991 года. На Каляды. Усяго двух месяцаў не дажыў ён да свайго 95-годдзя.

Паміж першымі і апошнімі ўспамінамі некалькі дзесяцігоддзяў. Светлы быў чалавек, мой дзед Кандрат. Мужны, смелы, надзейны. А яшчэ — нястомны жартаўнік.

*«Я крыкну — ўраз*
*Па гушчах мас*
*Нясецца хваля рэх*
*І ў свой прабег*
*Раджае смех,*
*Здаровы смех».*

Так напісаў Кандрат Крапіва ў пачатку дваццатага стагоддзя. Але яго невычэрпны крапівінскі гумар жыве і ў пачатку дваццаць першага.

**Алена АТРАХОВІЧ, кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.**

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МИНСКИЙ ПОДШИПНИКОВЫЙ ЗАВОД»**

**извещает своих акционеров о проведении 24 марта 2011 года внеочередного собрания акционеров.**

***Повестка дня:***

1. О реорганизации открытого акционерного общества «Минский подшипниковый завод» путем присоединения к нему «НИИ Подшипник».
2. Об утверждении договора о присоединении открытого акционерного общества «НИИ Подшипник» к открытому акционерному обществу «Минский подшипниковый завод».
3. О выкупе акций открытым акционерным обществом «Минский подшипниковый завод».
4. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 1 июля 2005 года № 300 «О предоставлении и использовании безвозмездной (спонсорской) помощи».
5. Об утверждении регламента работы ОАО «МПЗ» с реестром владельцев акций.
6. Об утверждении Положения о конфиденциальной информации, составляющей коммерческую тайну открытого акционерного общества «Минский подшипниковый завод».

Собрание состоится по месту нахождения общества по адресу: *220026, г. Минск, ул. Жилуновича, 2, актовый зал ЛБК, начало собрания в 15.00.*

Лица, имеющие право на участие в собрании, с проектом решения собрания могут ознакомиться по указанному выше адресу на центральной проходной в рабочие дни в кабинете инспектора по жилью ОСБО в период *с 21.03.2011 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв с 11.50 до 12.25)*, а в день проведения собрания — по месту проведения.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет осуществляться *24.03.2011 с 14.15 до 14.45* по месту проведения собрания при предъявлении паспорта или доверенности, оформленной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Справки по тел. 246 70 31.**

УНП 100151342

Настрой

# Фаленопсіс у крапінку і палосачку



### У МАГІЛЁВЕ НОВАЯ МОДА — НАБЫВАЦЬ НА СВЯТА ДЛЯ ЖАНЧЫН ПРЫГОЖЫЯ АРХІДЭІ!

**У гарадской выставачнай зале на вуліцы Болдзіна праходзіць традыцыйная выстава-продаж архідэяў і экзатычных раслін. За вокнамі яшчэ не саступае зіма, а ў зале — буйства колераў і кветкавых формаў.**

Магілёўская фірма «Эрыдэс» прадставіла розныя віды архідэяў: катлеі, дэндробіумы, мільтоніі, цымбідыумы, камбрыі. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца фаленопсісы — ад шлюбна-белага да цёмна-бардовага, з плямамі, у крапінку, з палоскамі.

Архідэі цяпер актыўна набываюць у падарунак да свята 8 Сакавіка. Кветка, якая будзе радаваць жанчыну не адзін дзень, — гэта добры падарунак. Тым больш што зрэзаныя кветкі ў крамах бліжэй да жаночага дня ўсё даражэюць, а на выставе трымаюць цэны. Кошт архідэй вагаецца ад 75 тысяч рублёў да 250 тысяч. Найбольш дарагія — гэта ванды з паветранымі каранямі ў шкляных вазах. За 75 тысяч рублёў можна набыць прыгожы фаленопсіс.



— Я усім рэкамендую пачаць менавіта з гэтага віду, — раіць прадстаўніца кветкавай фірмы і аматарка архідэй Вераніка Мунцян. — Фаленопсіс нездарма называюць раслінай для лянівых, бо гэта архідэя не патрабуе ніякага спецыяльнага догляду і клопатаў. Фаленопсісы не псуюцца і вельмі доўга цвітуць на радасць людзям!

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота Ірыны САВОСІНАЙ.**

Па здароўе — да прыроды

# ПУПЫШКІ БЯРОЗЫ
## дапамогуць пры гастрыце

**Бяроза — вядомы народны сродак ад многіх хвароб. Гаючую сыравіну гэтага шчодрага дрэва нарыхтоўваюць ранняй вясной. З лекавай мэтай выкарыстоўваюць пупышкі, маладое лісце, бярозавы сок, а таксама бярозавы дзёгаць і актываваны вугаль.**



Пупышкі трэба нарыхтоўваць, калі яны яшчэ не распусціліся, у перыяд руху сокаў. Пры нарыхтоўцы зразаюць маладыя галінкі, звязваюць іх у пучкі і сушаць у цені ці ў памяшканнях, якія добра праветрываюцца, пры тэмпературы паветра каля 25 °С. Высушаныя пупышкі абрываюць з галінак ці абмалочваюць і ачышчаюць ад смецця.

Маладое лісце збіраюць у маі, калі яно клейкае і духмянае.

Бярозавы сок нарыхтоўваюць у перыяд руху сокаў. Для гэтага ў ствале дрэва пракручваюць адтуліны, у якія ўстаўляюць трубкі ці іншыя прыстасаванні для сцякання соку. Пасля таго, як сок узяты, адтуліны трэба замазаць садовым варам ці гаспадарчым мылам.

Высушанае лісце захоўваць у скрынках, якія высцілаюць знутры паперай, пупышкі — у шчыльных закаркаваных слоіках.

У навуковай медыцыне настой пупышак бярозы прымяняюць як жаўцягонны, мачагонны і дэзынфекцыйны сродак. Бярозавы дзёгаць у складзе мазяў і пастаў выкарыстоўваецца для лячэння скураных захворванняў (экзэмы, лускаватага лішая, часоткі і інш.), для загойвання ран, апёкаў, язваў, пролежняў. Прэпарат карбален, у склад якога ўваходзіць актываваны бярозавы вугаль, прымяняецца як адсарбуючы сродак пры метэарызме, атручваннях ядамі і бактэрыйнымі таксінамі.

У народнай медыцыне настойка, радзей настой пупышак ці маладога лісця бярозы (30 г пупышак ці лісця на 1 л 70-працэнтнага спірту, па 15-20 кропель тры разы на дзень; 10 г пупышак ці лісця на 1 шклянку кіпеню, па 1 шклянцы 2 разы на дзень) прымяняюць **пры захворваннях страўніка (гастрыце, язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі), нырак, мачавога пузыра, сэрца, скуры.**

Настойкай заліваюць **раны, язвы, пролежні, змазваюць пашкоджаныя месцы пры раку скуры, захворваннях горла, націраюць хворыя суставы.**

Пупышкі выкарыстоўваюць для ўмацавання дзяснаў пры **цынзе.**

**Пры радыкуліце** маладым свежым лісцем абкладваюць спіну. Настойку тычынкавых каташкоў ужываюць пры захворваннях **сэрца.** Верхнюю плёнку бяросты прыкладваюць да фурункулаў і карбункулаў.

Бярозавы сок (да трох шклянак на дзень) прымаюць пры **захворваннях скуры, рэўматызме, артрытах, злаякасных пухлінах, ліхаманцы.**

Бярозавае лісце ці пупышкі ўваходзяць у склад розных сумесяў лекавых раслін. **Для мачагоннага збору,** напрыклад, бяруць пароўну пупышкі ці лісце бярозы, плады ядлоўцу, корань дзьмухаўца (1 сталовая лыжка сумесі на 1 шклянку кіпеню, па 1 сталовай лыжцы 3-4 разы на дзень).

У ветэрынарыі прэпараты бярозы (настой маладога лісця і пупышак, сок) прымяняюць **пры захворваннях нырак, страўнікава-кішачнага тракта,** а таксама пры агульнай слабасці маладняку сельскагаспадарчых жывёлін.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

Прамая лінія

# І ГАЛАВА КРУЖЫЦЦА, І Ў СПІНЕ «СТРАЛЯЕ»

**На пытанні чытачоў адказаў загадчык неўралагічнага аддзялення 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр ІВАНОЎ.**



*(Працяг. Пачатак у нумарах за 1—4 сакавіка.)*

☎ ***— Валожынскі раён, Ірына. Дзіця — інвалід, зараз яму 9 гадоў. Была родавая траўма, асфіксія цяжкай ступені. На сёння мы наведваем звычайную школу, нядаўна зрабілі магнітна-рэзанансную тамаграфію, яна паказала, што карціна можа адпавядаць кістозна-зліпальным змяненням галаўнога мозгу, што можа быць вынікам родавай траўмы. Як такія змяненні адаб'юцца на будучыні дзіцяці?***

— Выяўленыя змяненні — вынік родавай траўмы. Дзіця трэба назіраць у дзіцячага неўролага і праходзіць у яго лячэнне. Можна звярнуцца і да псіхатэрапеўта.

***— А як часта рабіць МРТ?***

— Раз у год ці два — дакладна павінен вырашыць урач. Неабходна назіраць за станам кісты ў дынаміцы. Калі кіста будзе павялічвацца, давядзецца абмеркаваць сітуацыю з нейрахірургам... Той факт, што дзіця займаецца ў звычайнай школе, гаворыць, што ў будучыні яно будзе нармальна развівацца і вырасце паўнацэнным чалавекам.

***— Кіслароднае галаданне было больш за 18 гадзін. Мне трэба было рабіць кесарава, а дзіця проста выціснулі...***

— Цяжка меркаваць, што было некалькі гадоў таму... Цяпер трэба зыходзіць з той сітуацыі, у якую вы трапілі. Неабходна рабіць усё, каб аднавіць здароўе свайго дзіцяці.

☎ ***— Лёзна, Рэгіна Мікалаеўна. 68 гадоў. Вельмі баліць паясніца, з пераходам на спіну. Баліць правая рука ў плячы. Рабілі рэнтген паясніцы ў Віцебску, паставілі дыягназ — астэахандроз. Прызначылі лячэнне — німесулід, мідакалм, неўрабекс, кетаноў. Але палёгкі няма.***

— Вам патрэбна лячэнне не толькі медыкаментознае, але і фізіятэрапеўтычнае, паколькі ў вас, відаць, не толькі астэахандроз, але і дэфармуючы артроз правага плечавога сустава. Патрэбна комплекснае лячэнне, у тым ліку ін'екцыйнае ўвядзенне прэпарата ў хворы сустаў. Выконваецца такая працэдура ў стацыянары.

***— Мужу 73 гады. Рэзка пачала пагаршацца памяць, ёсць атэрасклероз ніжніх канечнасцяў, звужэнне сасудаў галаўнога мозгу. Прайшоў лячэнне, двойчы на год робім кропельніцы. Можа, ёсць нешта больш дзейснае?***

— Размова ідзе пра ўзроставыя змяненні. Хутка гэта не лечыцца, трэба працягваць выконваць усё тое, што прызначае ўрач.

☎ ***— Маларыцкі раён, Валянціна Іванаўна. 45 гадоў. Дыягназ — астэахандроз пояснічнага аддзела пазваночніка, левабаковы сколіёз. Вельмі баліць левая нага, рабілі блакаду, але хадзіць вельмі цяжка...***

— Астэахандроз — гэта ўзроставыя змяненні пазваночніка. Калі ў вас ёсць грыжа дыска...

***— Мне рабілі здымкі, нічога такога не знайшлі.***

— На рэнтгенаграме гэта выявіць немагчыма. Трэба рабіць магнітна-рэзанансную тамаграфію або камп'ютарную тамаграфію. Калі ў вас ёсць боль, які аддае ў нагу, значыць, ёсць і раздражненне нервовага карэньчыка нейкім утварэннем: магчыма, гэта грыжа, сасудзістая мальфармацыя ці нейкая іншая праблема. Лячыць радыкуліт адной ці дзвюма блакадамі немагчыма. Патрэбны комплексны падыход — медыкаментозны, фізіятэрапеўтычны. Вы ляжалі ў стацыянары?

***— Не.***

— Патрэбна лячэнне менавіта ў стацыянары, паколькі тыя пераходы, якія вы здзяйсняеце ад дома да палiклінікі, могуць нанесці больш шкоды, чым забяспечыць карысці ад зробленых працэдур.

***— Я ў мануальнага тэрапеўта была.***

— Я не раіў бы вам звяртацца да такога спецыяліста, пакуль у вас няма вынікаў абследавання. Лепш звярніцеся да неўролага, каб ён накіраваў на лячэнне ў стацыянары.

☎ ***— Мінск, Уладзімір Аляксеевіч. Я два гады пакутую ад неўралгіі трайчастага нерва першай галіны. П'ю карбамазепін чатыры разы ў дзень. Год таму ў бальніцы давалі таксама гэтыя таблеткі. Ці можна зрабіць якую-небудзь ратавальную аперацыю?***

— Вашай паталогіяй займаюцца нейрахірургі Бальніцы хуткай дапамогі і 5-й клінічнай бальніцы. Але я не раіў бы вам спяшацца. Неўралгія трайчастага нерва — хвароба хранічная і часта дрэнна паддаецца лячэнню. Аператыўнае ўмяшанне не гарантуе, што боль ужо ніколі не вернецца. Лепей працягваць курс кансерватыўнага лячэння. Калі на прыём таблетак боль зніжаецца, то ёсць шанц, што з цягам часу ён знікне. Вы павінны прымаць не толькі карбамазепін, але і нестэроідныя прэпараты, якія здымаюць запаленчы працэс і ацёк. Паказаны вам і фізіяпрацэдуры. Акрамя таго, вы павінны берагчы сябе. Калі вы пераахалоджваецеся, то захворванне праяўляе сябе з большай сілай. Так што трэба вытрымліваць пэўны ахоўны рэжым.

☎ ***— Барысаў, Ганна Аляксееўна. 60 гадоў. Год назад у Мінскай абласной клінічнай бальніцы выявілі хваробу Мяньера. Чатыры разы на працягу года былі прыступы. Пакутую ад шуму ў вушах, галавакружэння. Што мне рабіць, каб прыступы здараліся як мага радзей? Ці можна дабіцца таго, каб іх не было наогул?***

— Захворванне Мяньера — гэта ацёк лабірынта ўлітκі, яго паступовая гібель. Пакуль ідзе раздражненне тых каналаў, якія знаходзяцца побач з лабірынтам, сітуацыя суправаджаецца тымі скаргамі, якія вы называеце. Гэтай паталогіяй займаюцца не неўролагі, а сурдолагі і лорурачы. З прэпаратаў можна параіць тыя, што зменшаюць дысфункцыю вестыбулярнага аналізатара — верыст і бетасерк, ці бетасцін. Супрацьацёчныя, мачагонныя прэпараты — вераштірон, гіпатыязід, дыякарб. Магчыма, пэўны эфект прынясе ўнутрывеннае ўвядзенне L-лізін эсцынату. Не пажадана, праўда, рабіць шмат кропельніц, паколькі лішняя вадкасць будзе спрыяць ацёку. І ў далейшым трэба назірацца ў сурдолага па месцы жыхарства.

***— Калі я выпісвалася з абласной бальніцы, мне прапісалі нейрамідзін, фезам і неўрабекс...***

— Шкоды ад гэтых прэпаратаў няма, але я рэкамендаваў бы тое, што нармалізуе вестыбулярную дысфункцыю і што я назваў вышэй. Вам неабходна на дадзеным этапе імкнуцца да паляпшэння якасці жыцця.

**Святлана БАРЫСЕНКА,**
**Вольга ШАЎКО.**
*(Працяг будзе.)*

Зваротная сувязь

# Медыкам — вялікая ўдзячнасць

**Заўсёды прыемна ўсведамляць, што газета можа прыйсці на дапамогу тым, каму яна вельмі патрэбная, ці проста стаць крыніцай добрага слова ў нечы канкрэтны адрас. Асабліва калі такі пасыл ідзе ад нашых чытачоў.**

Адпаведна, што дасланы нашай даўняй чытачкай Ірынай Каралько з Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ліст у рэдакцыю — лішняе таму пацверджанне.

«Добры дзень, паважаная рэдакцыя! Хачу праз друкаванае слова выказаць бязмежную ўдзячнасць медыкам Карэліцкай раённай і Гродзенскай абласной бальніц, іншым людзям, якія пры першай неабходнасці прыходзяць на дапамогу...

Так выйшла, што 21 студзеня 2011 года ў вёсцы Варонча здарылася няшчасце з нашым братам Чэчатам Мікалаем Іванавічам — ад сардэчнага прыступу ён страціў прытомнасць. Не хочацца думаць, што з ім было б далей, калі б не аператыўны прыезд брыгады «хуткай дапамогі».

Нягледзячы на дрэнныя на той час стан здароўя хворага, карэліцкія медыкі з вялікім пачуццём адказнасці паставіліся да яго выратавання. Спатрэбілася неадкладная аперацыя, і наша брата ў Гродна, дзе яму была паспяхова праведзена аперацыя. Зараз ён ужо выпісаны з бальніцы і знаходзіцца дома, хоць і патрабуе пастаяннага нагляду спецыяліста-кардыёлага.

Няма тых слоў, каб выказаць удзячнасць людзям у белых халатах. Тым не менш нізкі паклон фельчару «хуткай дапамогі» Уладзіміру Уладзіміравічу Чубрыку, урачу рэанімацыі Плескачу Сяргею Міхайлавічу, галоўнаму ўрачу Карэліцкай раённай бальніцы Георгію Сямёнавічу Будрэвічу, медсёстрам, санітаркам, а таксама ўсім гродзенскім урачам, хто дапамог нам у няпростай сітуацыі...»

**З вялікай павагай — сёстры Мікалая Чэчата Ірына, Ганна, Зінаіда і Галіна.**

*Мяркуем, што каментары тут залішнія.*

Тэхналогіі

# «ШТУЧНЫЯ НЫРКІ» ЗАПРАЦУЮЦЬ У ГОРКАХ

**У Горацкай цэнтральнай раённай бальніцы плануюць адкрыць аддзяленне гемадыялізу.**

Верагодна, што ўжо ў другой палове гэтага года бальніца атрымае тры новыя апараты «штучная нырка». Тады ў Горках змогуць аказваць дапамогу пацыентам з Горацкага і суседніх Дрыбінскага і Мсціслаўскага раёнаў. Гемадыяліз сёння там патрабуецца 14 хворым, якія па гэтую працэдуру ездзяць у Магілёў, што няблізка і каштуе грошай бюджэту.

**Ілона ІВАНОВА.**

Организация:

# ОАО «Птицефабрика ВЕЛЯТИЧИ»

**Учетный номер плательщика:** УНП 600034160.
**Вид деятельности:** сельское хозяйство.
**Организационно-правовая форма:** государственная
**Орган управления:** «Миноблптицепром»
**Единица измерения:** млн руб.
**Адрес:** 222124, Минская обл., Борисовский район, аг. Велятичи, ул. Ленинская, д. 28.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2011 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | **39 147** | **32 603** |
| амортизация | 102 | **24 196** | **15 376** |
| остаточная стоимость | 110 | **14 951** | **17 227** |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | **4** | **4** |
| амортизация | 112 | | **1** |
| остаточная стоимость | 120 | **4** | **3** |
| Доходные вложения в материальные ценности: | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | | |
| амортизация | 122 | | |
| остаточная стоимость | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | **4 892** | **6 806** |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | **4 892** | **6 806** |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| ИТОГО по разделу I | 190 | **19 847** | **24 036** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | **3 249** | **3 460** |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | **1 191** | **951** |
| животные на выращивании и откорме | 212 | **1 142** | **1 602** |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | **898** | **893** |
| расходы на реализацию | 214 | | |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | **18** | **14** |
| товары отгруженные | 216 | | |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | | |
| расходы будущих периодов | 218 | | |
| прочие запасы и затраты | 219 | | |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | **782** | **1 344** |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | | |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | | |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | | |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | **1 132** | **3 187** |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | **687** | **1 299** |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | | **1 268** |
| по налогам и сборам | 243 | **418** | **620** |
| в т.ч. из стр. 243 «расчеты по социальному страхованию и обеспечению» | 243А | | |
| по расчетам с персоналом | 244 | | |
| разных дебиторов | 245 | **27** | |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | | |
| Расчеты с учредителями | 250 | | |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | | |
| прочие | 252 | | |
| Денежные средства | 260 | **2** | **4** |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | | |
| денежные средства на валютных счетах | 262 | | |
| Финансовые вложения | 270 | **2** | **2** |
| Прочие оборотные активы | 280 | | |
| ИТОГО по разделу II | 290 | **5 167** | **7 997** |
| **БАЛАНС (190+290)** | 300 | **25 014** | **32 033** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | **1** | **11 811** |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | |
| Резервный фонд | 420 | | |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | | |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | | |
| Добавочный фонд | 430 | **11 681** | **1 896** |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | **Х** | **Х** |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | **896** | **1 200** |
| Целевое финансирование | 460 | | |
| Доходы будущих периодов | 470 | | |
| ИТОГО по разделу III | 490 | **12 578** | **14 907** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | **7 038** | **10 663** |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | **1 508** | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | **8 546** | **10 663** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | **2 082** | **3 161** |
| Кредиторская задолженность | 620 | **1 808** | **3 302** |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | **1 691** | **1 039** |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | | |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | **86** | **97** |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | **2** | **2** |
| по налогам и сборам | 625 | **12** | **33** |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | **17** | **31** |
| по лизинговым платежам | 627 | | **2 075** |
| перед прочими кредиторами | 628 | | **25** |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | | |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | | |
| прочая задолженность | 632 | | |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | | |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | | |
| ИТОГО по разделу V | 690 | **3 890** | **6 463** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | 700 | **25 014** | **32 033** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | | |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | **1 808** | **1 227** |

| АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | | |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | | |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | | |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | | |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | | |
| Бланки строгой отчетности | 006 | | |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | **802** | **840** |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | | |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | | |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | | |
| Товары, отгруженные в отпускных ценах | 015 | | |
| Имущество, находящееся в совместном владении | 016 | | |
| Именные приватизационные чеки «Имущество» | 017 | | |
| Материалы, оборудование, принятые (переданные) в рамках гарантийных обязательств | 018 | | |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | **5 848** | **5 314** |
| в т.ч. выручка, поступившая в валюте | 010а | | |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | **488** | **576** |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | **5 360** | **4 738** |
| СПРАВОЧНО: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | **4 705** | **4 152** |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | **655** | **586** |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | **655** | **586** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | | |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | | |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | | |
| в том числе: проценты к получению | 091 | | |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | | |
| доходы от операций с активами | 093 | | |
| прочие операционные доходы | 099 | | |
| Операционные расходы | 100 | **608** | **216** |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | **372** | **137** |
| расходы от операций с активами | 102 | | |
| прочие операционные расходы | 109 | **236** | **79** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | **-608** | **-216** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | **703** | **382** |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | **17** | |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | **686** | **382** |
| Внереализационные расходы | 150 | **132** | **123** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | **554** | **259** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160) | 200 | **601** | **629** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | | |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+/-210-220) | 240 | **601** | **629** |
| Налог на прибыль | 250 | | |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | | |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | | **14** |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | **601** | **615** |
| СПРАВОЧНО (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | | |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | | |
| Количество прибыльных организаций | 330 | **1** | **1** |
| Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату | 330А | **601** | **615** |
| Количество убыточных организаций | 340 | | |
| Сумма полученного убытка по конечному финансовому результату | 340А | | |

## РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| ПОКАЗАТЕЛЬ | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| Наименование | Код | Доход | Расход | Доход | Расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | | | | |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | | | | |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | | | | |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | | | | |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | | | | |
| Израсходовано на выплату компенсирующего, стимулирующего характера, а также выплаты, носящие характер социальных льгот | 391 | **Х** | | **Х** | |
| Безвозмездно полученные и переданные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи) | 392 | **686** | | **382** | |
| Сумма НДС, отнесенная на внереализационные расходы по товарам, отгруженным в РФ | 393 | **Х** | | **Х** | |
| Источники собственных средств, направленных на покрытие убытков отчетного года | 394 | | | | |
| Прочие доходы и расходы | 400 | **17** | **132** | | **119** |
| ИТОГО | 500 | **703** | **132** | **382** | **123** |

# ГАЛАСЫ... З ПАДНЯБЕССЯ

**НЕ жаночая гэта справа — маўчаць, таму зноў пішу. Што бачу...**
**Дом. Пад'езд. Лесвіца. Мы па ёй падымаемся — на свой паверх, сусед насустрач спускаецца — уніз... выносіць ёлку.**
**У нядзелю, трынаццатага лютага.**
**Што ж — лепш позна...**

**РЭКЛАМА**

Ланцужок: у панядзелак знаёмая прывяла знаёмага. Той выдаў кніжку, вельмі прасіў прачытаць і потым сказаць (а яшчэ лепш — напісаць) пра ўражанні...

Адмовіць было няёмка (прынамсі, у першым): вечарам, у аўторак, як абяцала, села за чытанне. На другой старонцы заснула. Назаўтра, у сераду — праз сілу дацягнула да трэцяй... І на ёй жа засталася ў чацвер...

Праз тыдзень у панядзелак знаёмая пазваніла, спытала: ну як мне твор?

Сказала, што думала: кніжка — добрая і вельмі патрэбная, раіць можна — у якасці снатворнага.

**ПАДМАН?**

Горад, вуліца, крамка — здаецца, новая? Да таго ж з кідкім надпісам «Все для вас». Забегла...

Для мяне не было нічога.

**ПАРАДОКС**

Вечар, кухня, пульт тэлевізара. І з яго раптам ціхае, кранальнае: «Ради высокой любви мы обязаны Помнить о тех, с кем пожизненно связаны — Очень ранимые, очень ранимые наши любимые...».

На экране — Ігар Нікалаеў. Але ж — парадокс — чуеш і бачыш зусім не яго, — нашага (светлай памяці) Уладзіміра Мулявіна...

Былі галасы. Былі мелодыі.

І словы ў песнях.

**ГОРА**

На дзвярах гастранома аб'ява: зверху — чорным — «Знайсці чалавека». Трохі ніжэй яго фатаграфія, прозвішча-імя, асаблівыя прыкметы, колеры адзення...

Унізе — умольная просьба пазваніць, калі нешта вядома.

...На дзвярах пад'езда (ці не ў той жа дзень): «Прапаў сабачка».

І далей — фатаграфія, клічка, парода... З тым жа ўмольным: калі нешта вядома, пазваніць, бо дзеці вельмі сумуюць!

...Гора — і там, і там.

**АЎТОГРАФ**

Тэлефанаванне было нечаканым: яе, адну з найстарэйшых беларускіх пісьменніц запрашалі сустрэцца з чытачамі — у воінскай часці.

Доўга аднеквалася, доўга вагалася: што там казаць? Ці трэба? Доўга хвалявалася. А калі прыйшла, — убачыла, што зусім дарэмна. Яе чакалі: бібліятэкарка напярэдадні «пусціла па руках» кнігі, на прынтары вывела адмысловую праграмку — з фатаграфіяй, з пералікам асноўных твораў, сабрала людзей... Пісьменніцу ўважліва слухалі, задавалі пытанні, ёй дзякавалі...

— А зараз, — напрыканцы аб'явіла вядучая, — наша госця раздасць аўтографы.

Паўтараць гэта не прыйшлося: салдацікі — з тымі самымі праграмкамі — акружылі стол; пісьменніца ці не ў кожнага пыталася, хто і адкуль, пісала пажаданні... Пакуль (пасля чарговага) не пачула ціхае:

— А дзе ж аўтограф?

Адказала, што вось гэта — пажаданне з подпісам ён і ёсць...

І вельмі пашкадавала, што з дому не ўзяла цукерак.

**ВОКА ЗА ВОКА**

Ліфт — не раскоша: сродак перамяшчэння. І... поле бою. Прынамсі, у нашым — на месцы найбольшых дзірак-падпалін не так даўно з'явіўся каляндар — з зоркамі эстрады: нейчыя добрая душа прыгажосць навяла.

Нейчыя нядобрая, хуліганская — ці не назаўтра — тым самым каляндарным зоркам прымалявала вусы, павыколвала вочы...

Пасля гэтага сапсаваны каляндар, вядома ж, знялі: на тое месца прыклеілі новы.

Але і яго неўзабаве зрабілі «старым» — гэта значыць, размаляваным, дзіравым і таму — замененым, на свежы... На гэты раз — ужо з прыпіскай: «Выкалеш вочы ты, выкалюць табе». Што, вядома ж, зачапіла, нават абурыла... Але толькі спачатку, бо падумаўшы...

Ці не кожны (нават хуліган) у дзяцінстве марыць самасцвердзіцца, паказаць сябе — трапіць на экран тэлевізара, на вокладку часопіса, на каляндар.

Дык, можа, яно і не лішняе — уявіць (цяпер), як гэта будзе — потым — калі «выкалюць вочы табе»?

**НЕ СУПАЛА**

Вечар. Холад. Тралейбус. На чарговым прыпынку ён стаіць досыць доўга. Зразумела, чаму: у салон «запаўзе» п'яны — не стары, досыць сімпатычны, прыстойна апрануты (хоць і скачаны), граматны...

— Осуждаете, да? — павісшы на парэнчы, «счытвае» думкі. — Я может сам себя осуждаю... Хотел на такси поехать — нету... Какого-то частника просил, чтоб подвёз. Двадцать баксов давал за пять остановок, — не согласился... Сказал: «Не хочу — ни тебя, ни твоих денег». Не нужны, представляете?..

Чаму ж не «представлять»?.. Калі яно часцяком: каму даюць (у тым ліку зарабіць), той не бярэ, а хто ўзяў бы, з дарагой душой...

Таму не прапануюць.

**ДЗЕСЯЦЬ ПРАВІЛАЎ**

«Куда прешь, коз-зёл?! Глаза разуй!... Дубина!»

Гэта — пяцігадовы Юрык: гуляючы са сваімі маленькімі машынкамі, паўтарае ўсё, што чуў ад бацькі ў вялікай.

А між тым абсалютнай большасці канфліктаў можна было б пазбегнуць, калі б удзельнікі дарожнага руху, апроч асноўных правілаў, выконвалі 10 праваслаўных. Паводле іх, перш чым адправіцца ў дарогу, трэба: пераканацца, што не забыліся нацельны крыжык; перахрысціць сябе і папрасіць Божага благаславення на гэту паездку; перажагнаць свой шлях з кароткай малітвай альбо словамі «Божухна, благаславі!»; ні ў якім разе не скарачаць час паездкі; не забывацца дзякаваць тым, хто прапусціў вашу машыну; прасіць прабачэння ў тых, каму, няхай міжволі, але перашкодзілі; саступаць дарогу тым, хто спяшаецца, і агрэсіўным вадзіцелям; не жадаць дрэннага, тым, хто перашкодзіў вам, а памаліцца аб іх словамі: «Ратуй яго, Божа, і памілуй мяне, грэшнага»; падчас шляху і ў заторах чытаць малітву «Божухна Ісусе Хрысце, Сыне Божы, памілуй мя грэшнага». Пасля завяршэння шляху, няхай кароткага, трэба яшчэ раз перажагнаць сябе і падзякаваць Богу за паездку, прычым любую, а не толькі ўдалую, памятаючы пра тое, што ўсё магло б быць і горш — ад шчырага сэрца прамовіць: «Слава Богу за ўсё!..

Паралічанае, як быццам, не пераезд скрыжаванняў (тым больш тых, што не рэгулююцца), не перастройванне з адной паласы на другую, не развароты, а засвоіць цяжка.

А то і немагчыма.

**МОЖНА ГЭТАК! МОЖНА ТАК?**

У бабы Анюты клопат: наняла чалавека, каб парэзаў вазок сухастоін, насек у паветку дроў, а ён, сабака, гарэлку выпіў, закуску з'еў, грошы ўзяў, а ўжо што зрабіў, дык вочы б не бачылі! Паленні — не падняць: тоўстыя, доўгія... Як іх будзеш паліць?

Сумны досвед. Знаёмец некалі ў Расію ездзіў, прадукты па вёсках прадаваў.

Убачыў неяк дым над комінам — і ў хату, з таварам. Зайсці зайшоў, а не бачыць нічога — гэтулькі дыму...

— Што гарыць? — пытаецца з парога.

— Ды нічога, — адзываецца гаспадар. — Я бульбу вару.

«Госць» прыгледзеўся — і сапраўды: адзін канец сухастоіны ў печы ляжыць, ля гаршчка, другі — на падваконні.

— Дык ты ж, — кажа мужыку, — парэзаў бы гэту паляняку, пасек...

— А на халеру? — пытаецца той. — Яна зараз прагарыць, — далей пасуну.

Гультайства і алкагалізм (бабка Анюта казала) — дзве найгоршыя хваробы. Бо амаль не лечацца.

**ШЧАСЦЕ... У КОЖНАГА СВАЁ**

На завод яна прыйшла даўно — адразу пасля школы. І не сказаць, каб дужа палюбіла... Ці добра плацілі... Проста прывыкла. І цяпер адвыкаць...

Спрабавала ўявіць, як зажыве на пенсіі, на якія грошы, чым канкрэтна займецца.

Будзе адсыпацца? Так. А што далей? Хадзіць па крамах? Есці варыць? У кватэры прыбіраць? Тэлевізар глядзець? Нешта чытаць?... Дык усё гэта яна рабіла, працуючы. І можа ж рабіць! «Няўжо нідзе ніякіх вакансій? — спытала ў кадравічкі. — Завод жа вялікі...». Тая толькі хмыкнула: маўляў туалеты прыбіраць вы ж не пойдзеце?..

— Не, не дай Бог! — жахнулася кабета.

Але ў «разведку» праз дзень схадзіла: прыглядзелася што там і як, дазналася, колькі плаціць.

Для яе гэта — ці не галоўным было: дзвесце з хвосцікам долараў пенсіі, трохі болей зарплаты — за колькі гадзін работы... І — хай будзе, што будзе...

Скардзілася спачатку, што цяжка, бо вельмі неахайныя людзі, старая сантэхніка, пабітая плітка, абадраныя сцены...

Але ж гэта ў мінулым: на заводзе начальства змянілася, і новае ў прыбіральню зайшло толькі раз. Ужо назаўтра там рамонтнікі былі: даставалі старыя трубы, мянялі ўнітазы, падшывалі столі, абліцоўвалі сцены...

Так што цяпер (прыбіральшчыца кажа) у туалетах хоць карціны малюй: светленька, чысценька — траціна ранейшай работы, а грошы — засталіся тыя ж!

...У кожнага сваё — і няшчасце, і шчасце.

**КНІЖКА**

Паліклініка. Чарга. Наперадзе, на крэслах — дзяды.

— Ты на што будзеш доктару скардзіцца? — гучна пытае старэйшы. — На памяць, не?

— Ага, — згаджаецца маладзейшы яўна, каб адчапіцца. Але «суразмоўца» гэтага не бачыць:

— Я, брат, таксама на памяць. Дрэнна з галавой... Зусім. Ты вось чаго не помніш?

— Ну дык гэта... Адказваць яўна не хочацца, але ж нідзе не дзенешся, — сяджу ўчора, гляджу тэлевізар — артыстка спявае. Дакладна ведаю, што Тамара, а прозвішча — хоць забі не прыпомню!

— Чыё — артысткі? — перапытвае дзед. — Дык халера з ёй... Я во ноччу прачнуся, бывае, і сваё прозвішча не помню. Жонку будзіў, каб сказала... Дык яна цяпер каля майго ложка кніжачку паклала. Забыў, як называецца... Сіненькая такая — цікавая... Там усё пра мяне... З партрэцікам.

...Як жа адвесці душу — начытацца? Сапраўды цікавых...

Пакуль цікавай не стала тая.

**ТАНК**

...Паэт Аляксандр Дракахруст узгадваў, як некалі ў кнігарні сустрэў Максіма Танка, як той, убачыўшы на паліцах збор сваіх твораў (пажаўцелы ад часу), з сумнай усмешкай зазначыў: «Танкавая калона... Ржавее...».

Як праз колькі часу, ужо ў другім настроі сказаў: «Я хоць і ржавы, ды танк»...

Хто б спрачаўся... А тым больш перачытаўшы:

Звон кафедральны кліча на Ave.

З цесных завулкаў злева і справа

Гуртам манашкі ў чорным адзенні

Цягнуцца, быццам чорныя цені.

Тут і старыя і маладыя, —
Ave Maria...
Я не звярнуў бы ўвагі, можа,
Каб не пабачыў між іх прыгожай
Адной манашкі, якая мае
Не больш, хіба, як сямнаццаць маяў;
Чорныя вочы, бровы густыя, —
Ave Maria!..

**АД ВЕЧНАСЦІ**

Тую школу Марыя Міхайлаўна знайшла не сама, — па размеркаванні прыслалі, настаўніцай малодшых класаў.

Набрала свой самы першы, давучыла (лёгка — толькі сказаць) да чацвёртага — «выпусціла», зноў набрала...

Праз некалькі выпускаў яе «першакласнікі» прывялі да яе ж сваіх дзяцей, а потым — і ўнукаў.

...Нешта ў гэтым было — ад вечнасці.

**Валянціна ДОЎНАР.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.


Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету**

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі ______ руб.; пераадрасоўкі ______ руб.

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, пыласос, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 красавіка 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 20 красавіка 2011 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 чэрвеня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 31 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 01.03.11 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.03.11 па 30.06.11.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1859 ад 25.02.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______

Падпіска афармлена і аплачана ў ______
(аддзяленне сувязі)
______ на II кв. або 1–е паўг. 2011 года

Хатні адрас і тэлефон ______
(індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ



альбо На пампушкі да Алены

**Ну што ж, дарагія мужчыны, усё сумленна: мы вас з 23-м павіншавалі, у нядзелю яшчэ смачненькіх бліноў напячом, а вы ўжо ў панядзелак—аўторак для нас пастарайцеся. Са святочным сняданкам (абедам, вячэрай) я вам дапамагу, а вось астатняе — за вамі! Пастарайцеся зрабіць так, каб, нягледзячы на маразы і снег за акном, вашы дамы адчулі, што вясна прыйшла! І не забудзьцеся пра кветкі! Вельмі ж гэта прыемна — прымаць святочныя букеты, прыбіраца і смяяцца, жмурачыся ад веснавога сонейка!**

### САЛАТА МАЗУРКА

Нам спатрэбіцца: *1 бляшанка чырвонай фасолі, 1 салодкі чырвоны перац, 300 г вяндліны або адваранага мяса, 2 ківі (можна замяніць ананасам), 1,5 сталовай лыжкі соку лімона, соль, цукар, перац на смак, 3 сталовыя лыжкі алею.*

Наразаем мяса кавалачкамі памерам з буйныя разынкі. Перац і ківі наразаем невялікімі кубікамі. Выкладаем усе прадукты ў салатніцу, туды ж дадаём фасолю, папярэдне зліўшы сок. Выціскаем у салату сок лімона, дадаём прыкладна 1 чайную лыжку цукру, солім, перчым. Усё змешваем, запраўляем алеем і перамешваем яшчэ раз.

### САЛАТА «ІНЬ-ЯНЬ»

Вазьміце: *300 г адваранага курынага філе, 3 яйкі, 100 г чарнасліву, 70 г сыру, маянэз, свежы агурок.*



Чарнасліў загадзя замачыце да мяккасці. Курыцу дробна парэзаць, вылажыць роўным кругам і змазаць маянэзам. Дробна парэзаць агурок. Вылажыць агурок на курыцу, прамазаць маянэзам. Аддзяліць жаўткі ад бялкоў, жаўткі здрабніць. На агуркі вылажыць жаўткі, пасля працёрты дробна сыр, а потым змазаць маянэзам. Зубачысткай намеціць «хвалю» ў цэнтры салаты, стопкай — кружочкі. Дробна парэзаць чарнасліў, вылажыць шчыльна на адну палову салаты і ў супрацьлеглы яе кружок. Бялкі нацерці дробна і вылажыць аналагічна на другую палову салаты і ў другі кружок.

### ЖУЛЬЕН У БУЛАЧЦЫ

Вельмі важна, што затраты часу на прыгатаванне гэтай стравы — мінімальныя. Калі з раніцы патушыць цыбулю і прыгатаваць курыцу, то перад прыходам гасцей застаецца толькі дастаць з булачкі мякаць, запоўніць яе начынкай і злёгку запячы. І ўжо праз 10 хвілін госці будуць смакаваць ваш шэдэўр.

На 4 порцыі вазьміце: *4 булачкі (дыяметрам 8—9 см), 1 вараны курыны кумпячок (або 1/2 грудкі), 2 буйныя цыбуліны, 1 чайную лыжку мукі, 4—8 сталовых лыжак смятаны, сыр.*

Цыбулю парэзаць тонкімі паўкольцамі і патушыць на маленькім агні ў невялікай колькасці алею. Цыбуля павінна стаць мяккай, празрыстай і зменшыцца ў аб'ёме ў 3—4 разы. Цыбуля ні ў якім разе не павінна пачаць мяняць колер, інакш жульен будзе гарчыць і набываць пах смажанай цыбулі. У гатовую цыбулю палажыць лыжачку мукі, перамяшаць і зняць з агню. Курынае мяса разарваць на валокны. У булачкі зрэзаць верхавіну і выбраць мякіш, пакідаючы сценкі таўшчынёй каля 1 см. У булачку палажыць цыбулю, курыцу, спецыі на смак, заліць смятанай, злёгку памяшаць (зручней за ўсё маленькім нажом). Зверху прысыпаць цёртым сырам. Паставіць у духоўку або мікрахвалёўку да расплаўлення сыру.

### САЛАТА «САЛОДКАЯ ЖАНЧЫНА»

Нам спатрэбіцца: *500 г капусты, морква, яблык, 500 г сухафруктаў (курага, чарнасліў, разынкі), маянэз, соль, чвэрць лімона, цукар.*

Замачыць на паўгадзіны сухафрукты. Капусту нашаткаваць. Дадаць моркву, здробненую на буйной тарцы. Крыху пасаліць, перацерці, каб з'явіўся сок. Выціснуць сок лімона, дадаць сталовую лыжку цукру (можна менш або больш — гэта залежыць ад смаку). Перамяшаць. Палажыць парэзаныя сухафрукты. Дадаць абабраны і парэзаны яблык, усё перамяшаць. Заправіць салату маянэзам. Салата будзе смачнейшай, калі пастаіць гадзіну на холадзе і насыціцца сокам.

### СЛОЕНЫЯ ЧАШАЧКІ З ЯЙКАМ

Вельмі арыгінальная і смачная страва. І вельмі проста гатуецца. Можна прыгатаваць як на сняданак каханай жанчыне, так і для піўной вечарынкі з сябрамі (г. зн. у любым выпадку вопыт прыгатавання спатрэбіцца).

На 6 чашачак нам спатрэбіцца: *250 г слоенага цеста, 6 яек, соль, перац, зяленіва, розныя напаўняльнікі на смак — каўбаса, грыбы, цыбуля, балгарскі перац і г.д.*

Цеста раскатаць у прамавугольнік памерам 30 х 20 см. Разрэзаць на 6 квадратаў 10х10 см. Вылажыць у формачкі. Ніз цеста павінен быць са слоем мукі, каб чашачкі пры выпяканні не прыліпалі да формачак. На дно чашачак вылажыць напаўняльнік на ваш выбар. Можна нічога не класці. Яйкі акуратна разбіць, не пашкодзіўшы жаўток, і выліць у чашачкі. Зверху пасаліць і паперчыць. Можна пасыпаць сухімі або свежымі травамі. Паставіць у халодную духоўку. Тэмпературу выставіць 180—220 °С. Калі вуглы цеста зарумяняцца (прыкладна праз 15 хвілін), палажыць зверху чысты ліст фольгі і дапякаць яшчэ 7—10 хвілін да яйка ўсмятку або 15 хвілін да яйка ўкрутую. Падаваць цёплымі.

### «МЯСНАЯ КОСКА»

Гэтая страва вельмі прыгожа выглядае і вельмі проста гатуецца.

Вазьміце: *500 г свініны, 1—2 цыбуліны, сок паловы лімона, соль, перац, алей, зяленіва, зярняты граната.*

Свініну вымыць, абсушыць, парэзаць, як на адбіўныя. Кожны кавалак адбіць з двух бакоў пад плёнкай, пасаліць і паперчыць. На кожным адбітым кавалку свініны зрабіць два надрэзы, не даразаючы да канца. Заплесці свініну ў «коскі», замацаваўшы кончык зубачысткай. Скласці «коскі» ў міску, дадаць парэзаную кольцамі рэпчатую цыбулю, выціснуць сок паловы лімона, перамяшаць рукой і пакінуць марынавацца на 30—60 хвілін. Мяса дастаць з марынаду, абсушыць. Патэльню моцна нагрэць, наліць крыху алею і абсмажыць «коскі» на моцным агні з двух бакоў.

Паменшыць агонь да мінімальнага, уліць крыху вады, накрыць накрыўкай і патушыць 7—10 хвілін.

Гатовыя «коскі» вылажыць на блюда і пасыпаць гранатавымі зярнятамі або сечаным зяленівам.

**Карысная парада перад святам:**

**Ніколі не гаварыць на вечарыны, што вам нельга шмат піць сёння. Сэнс жыцця прысутных звядзецца да таго, каб напаіць вас.**

## ЖАНОЧЫЯ САКРЭТЫ

# 9 спосабаў выглядаць маладзей



**Адзенне, аксесуары і касметыка могуць як павялічыць ваш узрост, так і амаладзіць воблік. Каб незнарок не «надзець» на сябе лішнія гады і кілаграмы, скарыстайце наступныя падказкі — 9 важных момантаў, пра якія неабходна памятаць, падбіраючы макіяж і строі.**

**1. СКУРА.** Шчыльны танальны крэм і пудра падкрэсліваюць няроўнасці скуры і паглыбляюць маршчыны. Аддавайце перавагу самаму лёгкаму і вадкаму танальнаму сродку з мікрачастачкамі, якія рассейваюць святло.

**2. ВОЧЫ.** Выразны контур вакол вачэй, фіялетавыя, зялёныя і бліскучыя цені робяць прыкметнымі ўсе недахопы немаладых павекаў. Цені лепш наносіць матавыя, лёгкіх персікавых адценняў. Туш — цёмна-шэрую ці карычневую. Ярка-чорная туш глядзіцца добра толькі на яркіх брунетках і цёмных шатэнках.

**3. БРОВЫ.** Ярка намаляваныя бровы, як і моцна падведзеныя вочы, старацяць. Яны павінны выдзяляцца, але быць натуральнымі. Ёсць і яшчэ адна хітрасць: чым шырэй размешчаныя ў чалавека бровы, тым ён маладзей выглядае. А чым бровы бліжэй адно да аднаго, тым старэйшым ён нам здаецца. Калі ў вас бровы зрастаюцца на пераноссі — вышчыпвайце іх.

**4. ВУСНЫ.** Ідэальна амаладжвае ружовы колер цёплага адцення, а таксама эфект «мокрых» вуснаў. Скарыстайце спецыяльную памаду ці нанясіце бляск паверх звычайнай.

Контурам можна зрокава павялічыць вусны і зрабіць іх больш пухлымі. Аднак аловак павінен тон у тон адпавядаць памадзе, а заходзіць за лінію вуснаў дапушчальна толькі на дзясятую долю міліметра, інакш ваш «падман» будзе бачны простым вокам.

**5. АДЗЕННЕ.** Магчыма, чорны колер і робіць фігуру больш стройнай, аднак ён жа і падкрэслівае ўзрост. Светлыя адценні, наадварот, асвяжаюць. Калі цёмныя рэчы з гардэроба выключыць цяжка, то разбаўляйце іх кантраснымі аксесуарамі. А стройнасці дамагайцеся падоўжанай палоскай і складкай на штанах класічнай мадэлі.

Памятайце: калі ваш ансамбль падабраны ў адной колеравай гаме, вы будзеце выглядаць больш стройнай.

**6. ВАЛАСЫ.** Калі хочаце выглядаць маладзей, то сівізну давядзецца зафарбоўваць. Фарба, якая «маладзіць» больш за ўсё, — на два тоны святлейшая, чым натуральны колер. Пышная і аб'ёмная ўкладка кароткіх валасоў дазваляе выглядаць больш юнай.

**7. МАНІКЮР.** Рукі з бездакорным манікюрам выглядаюць маладзейшымі. Бледна-ружовы і светла-бэжавы — бяспройгрышныя адценні лаку. Пазбягайце цёмных колераў — карычневага, сіняга, бардовага. Аддавайце перавагу цёплым адценням, бо халодныя будуць падкрэсліваць вены на руках.

**8. ПАСТАВА.** Нічога так не маладзіць, як прамая спіна і гордая пастава. Выпрастайце спіну і адразу адчуеце, як скінулі некалькі год.

**9. АКСЕСУАРЫ.** Вялікая колькасць дэталяў, складаны пакрой, цёмныя колеры прыбаўляюць гады. Насіце эфектныя завушніцы, пацеркі, бранзалеты, пярсцёнкі. І зусім няважна, натуральныя ў іх камяні ці не, ёсць золата-срэбра ці няма. Не забывайце, што вельмі халодныя колеры ўпрыгажэнняў могуць зрабіць твар зямлістым, а, напрыклад, чырвоныя — падкрэсляць прыпухласць і дробныя венкі.

-2730-

## ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

# Прадукты, карысныя для жанчын

**Даследаванні Еўрапейскага інстытута харчавання паказалі, што жанчынам, каб пазбегнуць многіх немачаў і падтрымліваць сябе ў форме, трэба прытрымлівацца наступных простых правілаў харчавання.**

- У дзённы рацыён жанчын пасля 40 абавязкова павінна ўваходзіць свежая садавіна. У ідэале трэба з'ядаць тры фрукты штодня. Прычым адзін з іх, напрыклад, яблык, — з самага ранку, да снедання, а ўжо потым кашу ці амлет. Гэта дапаможа рабоце страўніка і кішэчніка.



- Трэба піць паменш кавы (нават адзін кубачак кожны дзень — гэта многа), чорнага чаю, газіраваных напояў. Лепш замяняць іх сокамі, морсамі, зялёным чаем ці проста вадой. Агульная колькасць вадкасці (пераважна вады) павінна быць 1,5 — 2 л на дзень. Гэта садзейнічае ачышчэнню нырак, печані, сасудаў, вывядзенню соляў і шлакаў.
- Жаночаму арганізму неабходна дастатковая колькасць ёду, селену, фосфару, фоліевай кіслаты, вітамінаў Е і С. Яны змяшчаюцца ў прарошчаным зерні пшаніцы, цытрусавых, пячонцы, марской рыбе і морапрадуктах.
- У сталым узросце жанчыне патрэбны бялкі, аднак у той жа час мяса неабходна абмяжоўваць. Прыкладна пасля 45 гадоў арганізм лепш засвойвае рыбу і птушку.
- Пaненкам, якія вядуць малярухомы спосаб жыцця, неабходна шмат клятчаткі, таму ім варта выбіраць прадукты з цэлага зерня, мукі грубага памолу, вотруб'е, вараную і запечаную агародніну.
- Для прафілактыкі розных захворванняў касцёва-мышачнай сістэмы і падтрымання прыгажосці валасоў і пазногцяў жанчынам асабліва важны кальцый, таму ешце як мага больш сыру, тварагу, кісламалочных прадуктаў.
- Каб папярэдзіць анкалагічныя і сардэчна-сасудзістыя захворванні, нядрэнна ўключаць у свой рацыён стравы з соі, напрыклад, сыр тофу, ці хоць бы выкарыстоўваць соевы соус замест солі.

## СЮРПРЫЗ ДЛЯ МАМЫ

# Дадайце вясновых фарбаў

**Калі вы трымалі ў руках кручок, то, напэўна, зможаце звязаць не толькі ланцужок, але і слупок без накіду. Гэтай «пачатковай адукацыі» цалкам дастаткова для таго, каб змайстраваць прыгожую вазачку.**

З прыходам вясны чорна-белы свет хочацца хутчэй напоўніць рознакаляровымі фарбамі. Зрабіць гэта можна пры дапамозе адной яркай дэталі ў інтэр'еры.

Для работы спатрэбяцца: бутэлька (можна ўзяць слоік ці старую вазу), каляровыя ніткі і кручок.

Раскладзіце ніткі ў той паслядоўнасці, у якой колеры будуць чаргавацца ў гатовым вырабе. Двойчы абкруціце нітку вакол пальца, зрабіўшы двайную пятлю, і вяжыце ў яе шэсць слупкоў (абвязвайце абедзве ніткі кальца). Затым пацягніце за «хвосцік» ніткі і зацягніце кальцо — атрымаецца акуратны круг. Калі такі спосаб занадта складаны для вас, пачынайце работу са звычайнага ланцужка з 6 вочак. Вяжыце па крузе, робячы прыбаўленне так, каб атрымаўся плоскі круг, адпаведны дыяметру дна. Далей вяжыце без прыбаўлення па крузе. Колер паласы мяняйце на кожным другім радзе. Наверсе акуратна ўбаўце вочкі па рыльцы бутэлькі і закончыце вязанне.



-2731-


ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ АБО 1 ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА

З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Местное самоуправление. Свая справа. Чырвоная Змена. Купі лепшае! Тавары, паслугі, цэны. Жырандоля. Краіна здароўя. Чарнобыль.

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 12 400 рублёў на месяц<br>74 400 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 11 600 рублёў на месяц<br>69 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 19 900 рублёў на месяц<br>119 400 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 18 000 рублёў на месяц<br>108 000 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 9 700—11 180 рублёў на месяц<br>58 200—67 080 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8 940—10 430 рублёў на месяц<br>53 640—62 580 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 13 134—14 080 рублёў на месяц<br>78 804—84 480 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 12 230—13 170 рублёў на месяц<br>73 380—79 020 рублёў на паўгоддзе |

* Залежыць ад рэгіёна


### ЗАХАЦЕЛАСЯ МАЛАКА

Намеснік дырэктара ЗАТ «Белпрампрыбор» (Ляхавіцкі раён) заявіў у міліцыю, што са склада малочнай фермы ў в. Галаўніцы невядомы ўкраў 9 мяхоў замяняльніка малака. Як высветлілася, украў малако мясцовы жыхар, які працуе на гэтым жа прадпрыемстве. Ён падабраў ключы і залез у склад. Частку малака ўдалося вярнуць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Аляксандр КУЛАКОЎ:

Хакей. КХЛ.

# «У «ЛАКАМАТЫВА» НЕ АТРЫМАЛАСЯ ПРАЙСЦІ НАС НА АДНЫМ КАНЬКУ»

**Сёння ўвечары мы даведаемся, хто стане пераможцам супрацьстаяння ў 1/8 плэй-оф Кубка Гагарына. Лік у серыі да чатырох перамог стаў роўным — 3:3, і чарговы, апошні матч пройдзе ў Яраслаўлі. За нашага суперніка — яго пляцоўка і спецыфічнае хатняе судзейства, якім нярэдка славіліся матчы рэгулярнага чэмпіянату. За нас — толькі нашы спадзяванні і жаданне працягнуць ці то сон, ці то яву пад назвай плэй-оф.**

А днём раней у хатнім матчы наша «Дынама» згуляла самааддана і перамагло — 5:3. У трэці раз наш клуб перайграў «Лакаматыў», зраўняўшы лік у серыі, якая зацягнулася да сямі матчаў. А напачатку плэй-оф у яраслаўскай каманды былі іншыя планы, пра якія ўзгадаў Аляксандр Кулакоў:

*— Усе казалі і пісалі пра тое, што «Лакаматыў» павінен быў прайсці «Дынама» на адным каньку. І яны атрымалі сур'ёзны ўдар па самалюбстве. Мы даказалі, што гуляем не горш. У суперніка больш зорак, вось яны і нервуюцца. А нам чаго нервавацца?*

І сапраўды, матч паказаў, што перамогу проста так дынамаўцы не аддадуць: ужо ў першым перыядзе было закінута тры шайбы, на якую «Лакаматыў» адказаў адной. У нас вызначыліся Джордан Генры, Андрэй Міхалёў, Даніэль Корса. У другім перыядзе каманды абмяняліся шайбамі ў большасці. А ў трэцім канчатковы лік устанавіў Глазачаў, які падарыў балельшчыкам шайбу, якой папярэднічала неверагодная камбінацыя, разыграная з дапамогай Штумпела і Кулакова — 5:3.

**Марэк Сікора** пасля матча быў у выдатным настроі:

*— Мне здаецца, гэта быў адзін з лепшых матчаў у гэтым сезоне. Было ўсё — кідкі, барацьба, галы, бойкі. Атрымаўся прыемны вечар. Трэці перыяд? Мы рызыкавалі, калі перайшлі на тры звёны, але мы вельмі хацелі выйграць. Пачаў апасацца, калі прапусціці трэці гол. Але ўсё ж здолелі закінуць пятую, бадай, самую прыгожую шайбу, разыграўшы класную камбінацыю з выдатным завяршэннем. Ці баюся ў Яраслаўлі за судзейства? Не-не, не баюся...*

Тут у размову ўключыўся трэнер «Лакаматыва» **Уладзімір Вуйтэк**:

*— А я толькі ўсміхнуся і прамаўчу, бо ўжо заплаціў штраф.*



Фота Пятра ФАМІНА.

А вось што сказаў пасля матча аўтар нашай першай шайбы, абаронца **Джордан Генры**:

*— Мы хацелі зраўняць лік у серыі дома, дзе нас падтрымліваюць нашы выдатныя балельшчыкі. Пачатак матча атрымаўся ўдалым, мы забілі першымі і захоўвалі перавагу да заканчэння матча. Гульні ў плэй-оф вельмі ўпартыя, мы стараемся вельмі акуратна гуляць у абароне.*

***— Ваша шайба —экспромт ці хатняя загатоўка?***

*— Я ўбачыў свабодную прастору ў зоне і вырашыў увайсці, як я гэта неадноййчы рабіў у мінулым сезоне ў Паўночнай Амерыцы, сёлета так атрымлівалася нячаста. Я атрымаў выдатны пас, што аблегчыла мне задачу, і забіў.*

***— Ці хопіць сіл у «Дынама» выйграць наступны матч?***

*— Мяркую, так. Абедзве каманды згулялі шэсць матчаў за сем дзён, што на ўсіх уплывае. Але мы можам узарваца ў сёмай гульні, як гэта часта бывае ў плэй-оф. У нас выдатны персанал — дактары, трэнеры, масажысты. У нас усе здаровыя, так што мы гатовы.*

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# ПЛЫНЬ ПЯШЧОТЫ

Бяседныя песні



**Жыццё заслужанай артысткі Беларусі Наталлі Раманскай складваецца, як песня. Як беларуская песня. А ў ёй — за няспешным разгортваннем жыццёвых падзей раскрываецца эмацыйна напружаны, пачуццёва багаты духоўны свет. Знешне яе творчы шлях выбудоўваецца роўным, нават магістральным: без перапынку змяняюцца школа — універсітэт — харавы калектыў. Але кожны крок напоўнены душэўна-трапяткой прачуласцю.**

Палеская прастора песціла будучую зорку шырока вядомага ансамбля народнай музыкі «Бяседа». Яна нарадзілася 27 студзеня 1961 года ў вайсковым гарадку Мышанка Петрыкаўскага раёна. Неўзабаве бацьку Міхаіла Пятровіча Раманскага перавялі па службе, і сям'я — маці Зоя Васільеўна з дочкамі Сашай і Натай — пераехала следам у раённы цэнтр. Ад прыроды чыстая, высокадухоўная энергія спрыяла развіццю артыстычнага таленту Наталлі, гартавала яе характар. З мілай асалодаю згадваецца і цяпер ёй сярэдняя школа № 3, суладны педагагічны калектыў і ў ім — першая настаўніца Антаніна Сафронаўна Дземітко і класны кіраўнік Ксенія Фёдараўна Целюкова. А пасля школьных заняткаў дзяўчына спяшалася ў музычную сямігодку, дзе авалодвала фартэпіянным мастацтвам.

Беларускі ўніверсітэт культуры, які Наталля паспяхова закончыла ў 1982 годзе, пашырыў кругагляд, а песня ўвайшла ў яе жыццё трывала і змястоўна. Сапраўднай акадэміяй спеваў для маладой выпускніцы стаў Дзяржаўны народны хор імя Генадзя Цітовіча. На сцэне ў абліччы песні панарамна вымалёўвалася ўся Беларусь — працавітая, духам нязломная, разнастайна спеўная. Тут вырашыліся яе асабістыя сямейныя справы, прыйшло грамадскае прызнанне — атрымала ганаровае званне (1997).

Усебакова выявіўся талент Наталлі Раманскай у ансамблі народнай музыкі «Бяседа». Яна мае прыгожы, пранікнёна светлы голас, выключную музыкальнасць. Надзвычай тонка перадае спявачка душэўныя хваляванні ў лірычных песнях. Многія кампазітары дарычылі ёй першай выканаць іх творы, і яны загучалі і за межамі нашай краіны. Ужо трэцяе дзесяцігоддзе яны плённа працуюць у суладдзі — «Бяседа» і заслужаная артыстка краіны Наталля Раманская.

**Плынь пяшчоты**

**Верш Галіны КУТАС** **Музыка Леаніда ЗАХЛЕЎНАГА**

*Ноч пуховым пледам туману*
*Заклапочана нас ахіне.*
*Паміж намі не будзе,*
*не будзе падману,*
*Шчасце зоркаю*
*зноў падміргне.*

*Ад пявучай тваёй гаворкі*
*І пралескавай сіні вачэй*
*Знікне прысмак мінулага*
*крышачку горкі,*
*Стане нейк на сэрцы лягчэй.*

*Плынь пяшчоты*
*тугу заглушыць,*
*Ды расстанне усё ж настае.*
*Нас, нібыта бы птушак,*
*прыручаных птушак,*
*Час вяртае у гнёзды свае.*

Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.



**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

## НА МЕСЦЫ СТАРОГА КОРПУСА МУЗЕЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ ПАБУДУЮЦЬ АТЭЛЬ

**На Кастрычніцкай плошчы плануецца пабудаваць атэль. Ён размесціцца на месцы старога корпуса музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які будзе дэмантаваны пасля ўзвядзення новага будынка музея ў парку Перамогі.**

Як расказаў дырэктар кампаніі «Прудэнка інвестментс ЛТД» Сяргей Руцкі, апаратар атэля яшчэ не вызначаны, але вядома, што ў 24-павярховым будынку будзе каля 100 нумароў. Таксама інвестар мае намер частку паверхаў аддаць пад жылыя апартаменты. Па баках гасцініцы вырастуць два чатырохпавярховыя крылы. У адным з іх плануецца адкрыць галерэю сучаснага мастацтва, у другім — гандлёвы цэнтр. З'явіцца тут таксама кафэ і рэстаран. У падземнай частцы комплексу будзе трохузроўневы гараж на 300 машын.

Будаўніцтва маюць намер пачаць восенню 2012 года, а здаць гасцінічны комплекс у 2015-м.

**Вольга ЖАРЫНА, «Мінск—Навіны».**


## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Здание участка литья пластмасс. Общая площадь 187,4 кв.м, год постройки 1991. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19. **Начальная цена: 88 178 980 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены. |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Сумма задатка** | 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Продавец** | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – нотариально заверенное свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **23.03.2011 г. до 16.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **24.03.2011 г. в 15.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис» |


## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Скарпіёны прымуць лёсавызначальнае рашэнне, а Дзевы адчуюць смак перамогі

**АВЕН.** Вырасце ваш аўтарытэт, павысіцца творчы патэнцыял. Імкніцеся пашырыць свой круг стасункаў — тады перад вамі адкрыюцца новыя магчымасці з вельмі прывабнымі даляглядамі. У аўторак будзьце больш асцярожнымі і не прымайце паспешных рашэнняў, не дазваляйце эмоцыям атрымаць над вамі верх. У чацвер пажадана не заставацца ў адзіноце, таму смела адгукайцеся на запрашэнні сяброў.

**ЦЯЛЕЦ.** Пажадана суадносіць свае абяцанні з магчымасцю іх выканання. З'явіцца нейкая непрыемная інфармацыя аб дзелавым партнёры, якая ўнясе змены ў вашы планы. Лепш засяродзіцца на працы, бо гэта тыдзень падрыхтоўкі да вырашальнага кідку. Збярыце ўсе сілы, вызначце план дзеянняў, дамоўцеся з саюзнікамі. Час спрыяльны для самарэалізацыі і праявы талентаў. Вы без цяжкасцяў зможаце заручыцца неабходнай падтрымкай навакольных. Атрымаеце цікавую інфармацыю, якая пашырыць магчымасці ў прафесійнай дзейнасці. У выхадны вас чакаюць новыя ўражанні, паездкі за горад, стасункі з новымі цікавымі людзьмі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Спатрэбіцца такія якасці, як уважлівасць, паслядоўнасць у сваіх дзеяннях і разважлівасць. У панядзелак раніцай нічога новага лепш не пачынаць, тым больш што вас могуць падвесці партнёры. Лепш разабрацца з незавершанымі справамі. Паспрабуйце менш спрачацца з начальствам. Памятайце, што вас пакрыўдзіць змогуць толькі ў тым выпадку, калі дапусціце прамашку, а пры ўмове захавання спакою ваша пазіцыя практычна непаражальная. Давядзецца дапамагчы калегам. Паспрабуйце прыцішыць амбіцыі і не дазваляйце сабе занадта экстравагантных учынкаў, бо ёсць рызыка таго, што вас не зразумеюць.

**РАК.** У пачатку тыдня лепш заняцца рашэннем старых праблем і завяршэннем пачатых спраў. У аўторак будзьце больш асцярожнымі: вас можа падцікоўваць добра замаскіраваны падман. Пачынаючы з чацвярга, надыходзіць спрыяльны час для пачатку чаго-небудзь новага — і персанальна вам будзе спадарожнічаць поспех. Удалымі могуць быць задумы, якія рэалізуеце ў суботу. У нядзелю планы могуць раптам змяніцца: гэта, хутчэй за ўсё, будзе звязана са шматспадзеўнымі паездкамі або камандзіроўкамі. Пастаўцеся з увагай да праблем родных.

**ЛЕЎ.** Непажадана гуляць у хованкі з прадстаўнікамі закона і парадку — усё роўна прайграеце. Надыходзіць спрыяльны час для актывізацыі карысных знаёмстваў. Прызнанне вашых заслуг дзелавымі партнёрамі і сябрамі будзе прыемнай неспадзеўкай. Зможаце зірнуць на многія рэчы па-новаму, убачыць тое, што раней заставалася ўтоеным, і гэта надасць упэўненасць у сваіх магчымасцях. У чацвер неабходны рэалістычны падыход у рашэнні праблем. У пятніцу паспрабуйце захоўваць спакой і не парушаць ніякімі староннімі дзеяннямі ўнутранага камфорту і міру ў душы. Суботу прысвяціце сабе, займіцеся самаадукацыяй.

**ДЗЕВА.** Надыходзіць спрыяльны перыяд у плане партнёрскіх адносін, яны будуць выгоднымі для вас і вашай справы. Зараз не той момант, калі варта плыць толькі па цячэнні. У панядзелак з'явіцца шанц адчуць смак перамогі. Чацвер прынясе поспех невялікі, але важны: зробленае ў гэты дзень стане трывалым падмуркам для будучых здзяйсненняў. У суботу не атрымаецца дагадзіць усім, затое можна будзе выбраць на самай справе важных для вас людзей. У нядзелю варта пажыць як душа жадае.

**ШАЛІ.** Тыдзень на рэдкасць плённы і пры гэтым спакойны. У панядзелак спатрэбіцца асцярожнасць і пільнасць у прыняцці рашэнняў. У аўторак можаце многага дамагчыся, асабліва ў другой палове дня. У нядзелю не варта ўносіць у атмасферу вакол вас хаос і мітусню, паколькі ў гэты дзень інфармацыя можа ўспрымацца неадэкватна. Паспрабуйце захоўваць душэўную раўнавагу і не праяўляць нездаволенасці.

**СКАРПІЁН.** Неабходна засяродзіцца на галоўным. Надышоў час сур'ёзна задумацца пра будучыню і прыняць важнае рашэнне, ад якога, верагодна, будзе залежаць далейшае жыццё. Пажадана, каб рост актыўнасці не ператвараўся ў імітацыю бурнай дзейнасці. Вы зможаце ў поўнай меры задзейнічаць усе сувязі, але патрэбная настойлівасць да перааодолення цяжкасцяў. У панядзелак паспрабуйце не спрачацца з начальствам. Да чацвярга не трэба пачынаць новых спраў.

**СТРАЛЕЦ.** Вялікая частка праблем будзе пераадолена. Верагодная ўдалая паездка або падрыхтоўка да яе. У панядзелак лепш адпачыць, а з пачаткам новых спраў пакуль пачакаць. У сераду могуць выявіцца вашы ўтоеныя здольнасці. Чацвер напэўна падштурхне вас да прыняцця кардынальных рашэнняў. У пятніцу цікавыя ідэі могуць з'явіцца раптам і падаціца недарэчнымі. Паспрабуйце не адпрэчваць усе адразу — сярод іх будуць карысныя. Выхадныя размяшчаюць да ўтульнага хатняга адпачынку ў коле блізкіх.

**КАЗЯРОГ.** Больш часу цяпер прысвячайце адпачынку і забавам. У панядзелак паспяшайцеся рэалізаваць планы першай неабходнасці. Правядзіце як мага больш вечароў у цесным сямейным коле. Пачынаючы з другой паловы тыдня, важнымі праектамі варта займацца ў супрацоўніцтве з аднадумцамі, бо ў адзіночку не справіцца. У пятніцу верагодны перажыванні, звязаныя з працай. У суботу можаце прымаць смелыя рашэнні, не баючыся, што яны будуць памылковымі.

**ВАДАЛЕЙ.** Тыдзень спрыяльны для працы ў калектыве, у творчым узаемадзеянні з групай калег. У панядзелак можаце ўзяць на сябе кіраўніцтва якой-небудзь складанай праграмы. У чацвер варта больш уважліва кантраляваць праяву сваіх эмоцый — з вашага боку магчымая празмерная патрабавальнасць да навакольных. Імкніцеся быць больш лаяльнымі да партнёраў. Выхадныя дні могуць адзначыцца незвычайнымі знаёмствамі.

**РЫБЫ.** Праца — адна з найважнейшых задач тыдня. Ад яе выніку можа залежаць не толькі настрой і стан матэрыяльнага дабрабыту, але і планы на будучыню. Некаторыя з іх давядзецца змяніць, бо жыццё будзе карэктаваць іх па-свойму. Можаце выправіцца ў нечаканую далёкую паездку. Паспрабуйце раіць, не дэманструючы амбіцый, — толькі тады будуць да вас прыслухоўвацца.


Утерянные представительством Белгосстраха по Первомайскому району **бланки квитанций** о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) **формы 1СУ серии ГС №№ 6434292, 6434293, 6434296, страховых полисов** по добровольному страхованию имущества граждан **формы 2РН серии БИ № 6823218**, добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний **формы 2РН серии БН № 387927**, добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу **формы 2РН, 2РП серии БЛ №№ 36907, 36908**, обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь **серии ВС №№ 1678116—1678118 считать недействительными.** *УНП 101883943*

